Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Дзмітрый Пятровіч

# Белая Жанчына



Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Дзмітрый Пятровіч

# Белая Жанчына

*Аповесці, апавяданні, эсэ*

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧЕТЫРЕ ЧЕТВЕРТИ»
2012

УДК 882.6-1
ББК 84(Беи)6
П99

*Серыя заснавана ў 2011 годзе*

**Рэдакцыйны савет:**
Міхась Пазнякоў, Ліліяна Анцух, Уладзімір Гніламёдаў,
Казімір Камейша, Уладзімір Карызна, Наталія Касцючэнка,
Георгій Марчук, Генадзь Пашкоў, Павел Саковіч,
Мікалай Чаргінец, Васіль Шырко

**Галоўны рэдактар серыі**
М. П. Пазнякоў

**Пятровіч, Д. Л.**
П99 Белая Жанчына : аповесці, апавяданні, эсэ / Дзмітрый Пятровіч. — Мінск : Выдавецтва "Четыре четверти", 2012. — 176 с. — Сер. «Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі».

ISBN 978-985-7026-18-0.

У новы зборнік Дзмітрыя Пятровіча ўваходзяць аповесці, апавяданні, эсэ, якія раней былі апублікаваны ў часопісах і газетах і атрымалі станоўчую ацэнку крытыкі і чытачоў.

Містычна-прыгодніцкая аповесць «Белая Жанчына» напісана на выключна новым для беларускай прозы матэрыяле — пра спелеолагаў. Як вядома, гэта людзі, апантаныя даследаваннем пячор. У аснову дэтэктыўнай аповесці «Джэк» і апавядання «Анёлы» пакладзены рэальныя падзеі. Апавяданне «Цана крыві» прысвечана памяці ахвяр трагедыі ў мінскім метро 11 красавіка 2011 года.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў.

**УДК 882.6-1**
**ББК 84(Беи)6**

**ISBN 978-985-7026-18-0**

© Пятровіч Д. Л., 2012
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Четыре четверти"», 2012

# Новае імя

З творамі Зміцера Пятровіча я ўпершыню пазнаёміўся ў 2008 годзе, калі працаваў рэдактарам аддзела прозы ў часопісе «Маладосць», і адразу быў прыемна ўражаны іх вельмі прыстойным узроўнем. Меліся, канечне, як у любога пачаткоўца, у апавяданнях і хібы. Аднак пры асабістым знаёмстве высветлілася, што ў Зміцера ёсць вельмі сімпатычная рыса, не менш важная за мастацкі талент, — гэта ўменне слухаць, адпаведна, «матаць на вус» і рабіць высновы.

Пасля дэбюта (апавяданні «Анёлы» і «Ружа») супрацоўніцтва аўтара з «Маладосцю» працягвалася. Менавіта ў гэтым часопісе былі надрукаваны дзве вялікія рэчы З. Пятровіча — аповесці «Белая Жанчына» і «Джэк», напісаныя на дэтэктыўна-прыгодніцкім матэрыяле, так бы мовіць, «кінематаграфічныя»; ведаю з прыватнай гутаркі, што ў планах аўтара — напісаць паводле іх сцэнарыі для «Беларусьфільма».

Асабліва прыемна, што аповесці былі заўважаны і станоўча ацэнены крытыкай. Вось словы з рэцэнзіі аўтарытэтнай, таленавітай Ж. Капусты: «Тых, хто сочыць за публікацыямі Дзмітрыя Пятровіча, усцешыць відавочны творчы рост гэтага аўтара. Яго новая аповесць «Белая Жанчына» стане прыемнай і захапляльнай чытанкай... Нягледзячы на прадказальнасць сюжэта, аповесць чытаецца перш за ўсё дзякуючы напружанасці, дынамічнасці апісанага дзеяння».

У Зміцера Пятровіча ёсць усе неабходныя для празаіка ўмовы: спрыяльны ўзрост, талент, працавітасць, упартасць, цярпенне, першыя кнігі, прыхільнасць крытыкі і чытачоў... Карацей, той багаж, з якім ён будзе і далей рухацца па нялёгкай пісьменніцкай дарозе. Таму па традыцыі хочацца пажадаць яму на гэтым шляху пабольш саломкі і паменш калдыбанаў, інакш кажучы – хай яму пашэнціць!

*Андрэй Федарэнка,*
*лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа*

# Аповесці

## Белая Жанчына

### Частка I

*Год 2006*

Начны праспект, па якім імчаўся «мерседэс», зіхацеў, як навагодняя ёлка, расквечаны рознакаляровымі агнямі вялікага горада. «Якая прыгажосць!» — падумаў Сяргей, міжволі любуючыся начным Мінскам. Як мінчанін, ён змалку палюбіў свой горад і ў душы лічыў сябе сапраўдным патрыётам, хаця на людзях, напэўна, ніколі не гаварыў пра гэта. За свае амаль сорак год Яркавіч шмат чаго ўжо пабачыў на свеце, хаця галоўным у жыцці лічыў вернасць — як у сяброўстве, так і ў каханні. Лічыў, што сяброў павінна быць няшмат (мо нават адзін), але сапраўдных. Нехта з вялікіх казаў калісьці, што сапраўдны сябар не той, хто паспачувае табе ў горы, а той, хто шчыра парадуецца тваім поспехам. Адсюль, пэўна, і пайшоў знакаміты выраз «і ў горы, і ў радасці разам» — і ў сяброўстве, і ў каханні...

Яркавічу раптам успомнілася, як яны з жонкаю Ганнаю, вяртаючыся з працы, заўважылі на аўтобусным прыпынку

чалавека, які ляжаў на асфальце. З-пад яго галавы выцякала барвова-чорная лужына. І... да гэтага няшчаснага ніхто не падыходзіў. Ніхто. А прыпынак быў забіты народам. Людзі, сярод якіх былі і пажылыя — той, «савецкай», загартоўкі, — стаялі побач, моўчкі, абыякава пазіраючы здалёк. Але не падыходзілі. А Сяргей не чакаў — адразу ж выняў з кішэні мабільнік, набраў «03» (зараз ужо «103»). Праз некалькі хвілін да прыпынку падляцела «хуткая». Мужчыну паклалі на насілкі, доктар сказаў толькі, што невядома, ці выжыве ён, — даволі пазнавата іх выклікалі... На ўсё воля Боская...

Мурашкі пабеглі тады па спіне Ярковіча — а калі б яны не апынуліся тут наогул? І калі іх з'яўленне ўвогуле яшчэ было своечасовым?..

...Ад гэтых думак Сяргея адарваў мабільнік.

— Прывітанне, Сярго! — пачуў ён голас сябра Сямёна Шаца. — Як жыў-здароў, дружа?

— Прывітанне, Сёма! Дзякуй, усё, здаецца, няблага, хаця, як заўсёды, хацелася б яшчэ лепш. Сёння важная сустрэча была з кліентам. Затрымаўся на працы. Пакуль абмеркавалі ўсё, пакуль «сінусы» сышліся з «косінусамі»... А «тангенс» вязу з сабой у партфелі. Спадзяюся, хутка буду дома.

Ярковіч зірнуў у бакавое акно: справа праплывала чыгунная рашотка парку Чалюскінцаў. І чамусьці міжволі — у люстэрка — на яго глядзеў стомлены саракагадовы чалавек з худаватым скуластым тварам і арліным, з гарбінкай носам (з-за яго, напэўна, сябры і звалі яго Сярго — як Арджанікідзэ). Адны толькі вочы блішчэлі на гэтым твары — жывым маладым бляскам. «Нездарма мудрыя продкі казалі, што вочы — люстэрка душы», — мільганула думка.

— А як ты? Што плануеш на выхадныя, Сёма? — спытаў Сяргей.

— Як гавораць, да выхадных яшчэ дажыць трэба. Пакуль не ведаю. Пэўна, з Софаю махнем на дачу да бацькоў. Ты выбачай, што позна тэлефаную. Проста Славік толькі зараз мяне набраў — заўтра зранку ад'язджае ў Рыгу на нейкі кангрэс,

а праз некалькі тыдняў бярэ водпуск і запрашае нас у пячоры пад Піцер, як летась, памятаеш? Ён жа самы вопытны з нас, і тым больш географ. Сёння хацеў да цябе датэлефанавацца, потым кінуў — ты мабільнік не браў!

— У мяне ж важная сустрэча была, таму я тэлефон адключыў, — растлумачыў Сяргей. — А паехаць хочацца. Мабыць, яшчэ раз Белую ўбачым, як тады, у мінулы раз...

— Ціпун табе на язык. Не дай Божа! — парыраваў Сямён. — Ледзьве жывымі засталіся! Я вельмі добра падумаю, перш чым яшчэ раз пад зямлю палезці.

— А што Ромка, наш скалалаз, мяркуе? — пацікавіўся Ярковіч. — Яму таксама вы патэлефанавалі?

— Пакуль не. Табе першаму. Дык што адкажам Славіку? Ён жа вернецца са свайго кангрэса — і адразу ў водпуск.

— Сёма, ты ж ведаеш: я ніколі не спяшаюся, спачатку ўсё планую, прадумваю. Сем разоў трэба адмераць, разумееш? Давай, я спачатку ўладкую свае справы, а потым вырашым. Заўтра патэлефаную табе, а потым — Слаўку ў Рыгу. Згода?

— Згода, сябра. Тэлефануй. Буду чакаць. Перадавай прывітанне Ганулі і дзецям! Бывай здаровым!

— І ты, дружа, Софе і Давіду перадавай прывітанне ад усіх Ярковічаў! Да сустрэчы!

* * *

Паклаўшы мабільны на месца, Сяргей раптам зразумеў, як вельмі стаміўся за дзень, галава ацяжэла... («Пэўна, ад думак!» — усміхнуўся сам сабе Ярковіч). Шыя са спінаю быццам адмаўляліся ўжо трымаць тую галаву на плячах. «Трэба яшчэ дажыць да выхадных!» — чамусьці ўспомніліся словы Сямёна Шаца. Прамармытаў ціха пра сябе нешта накшталт: «Даруй мне, Божа, за такую дрэнь у галаве!».

Але ўсё ж штосьці важнае, здаецца, цяжкім каменем ляжала на сэрцы. А што — Сяргей не мог уцяміць. Мабыць, ён пра што-небудзь забыўся сёння? Ці гэта адбылося пасля таго, як

патэлефанаваў Сямён?.. І раптам Яркові́ч зразумеў: яго Ганна, як, напэўна, усе жонкі, даволі насцярожана ставілася да яго хобі. Яна звычайна гаварыла, што няхай бы яны, як усе нармальныя мужыкі, час ад часу ездзілі б на рыбалку, лавілі рыбу і нават, як вядома, прымалі бы на грудзі грамаў па сто. А яны? Разам з сябрамі Сяргей па некалькі разоў у год выязджаў «у пячоры». Ярковіч і яго таварышы займаліся спелеалогіяй[1]. Ганна не разумела мужа і не падзяляла з ім яго захаплення. Людзі кожны дзень рызыкуюць сваім жыццём. А вось калі яны спецыяльна лезуць пад зямлю ці ў ваду, каб набыць, па словах Ганны, сабе прыгод на сваю скуру (на самой справе жонка выражалася больш жорстка) — Ганна зразумець не магла... А сябры? Ці можна назваць іх легкадумнымі людзьмі? Вядома ж, не. Сямён Шац — кандыдат навук, добры сем'янін (хаця, наколькі ведаў Ярковіч, з жонкай Софай сваркі ўзнікалі толькі з той жа самай прычыны, што і ў яго самога). Пазнаёміліся яны, яшчэ калі разам вучыліся ва ўніверсітэце, а іхнія жонкі — разам з імі, хаця ў іншым патоку. Са Святаславам Цімковічам лёс звёў яго ў арміі, пад Свярдлоўскам. Адтуль, з Уральскіх гор, і пачалося іх захапленне альпінізмам, а потым і спелеалогіяй. І менавіта Святаслаў угаварыў Сяргея, тады яшчэ нежанатага, паехаць з ім на Краснаярскія слупы — у запаведнік з такой жа назвай. І там, штурмуючы чарговую вяршыню, сустрэлі яны Рамана Біцюка (хлопцы адразу ж далі яму мянушку Біцюг за адпаведную знешнасць: нізкаросла, мускулісты, вечна хмуры, аматар добрай бойкі). Нарадзіўся Раман ва Украіне, а вырас у Мінску. Ён, прынамсі, ужо быў знаёмы з Цімковічам.

Пасля былі галодныя дзевяностыя, калі Сяргей некалькі гадоў запар выязджаў на вахты на Поўнач і зарабіў дастаткова, каб распачаць сваю справу (зараз гэта называюць

[1]Спелеалогія — (*от греч. spelaion* — пячора і налогія), навука, якая займаецца вывучэннем пячор — іх паходжаннем, марфалогіяй, мікракліматам, водамі, раслінамі, сучаснай і старажытнай пячорнай фаўнай, рэшткамі матэрыяльнай культуры людзей каменнага веку.

бізнесам), стварыць кааператыў, купіць машыну — не новую, але надзейную. І галоўнае — старое сяброўства захавалася, не страцілася, як савецкае мінулае. Аднойчы, на нейкім прывале Святаслаў дзеля жарту напісаў прутком на пяску першыя літары імёнаў усіх сяброў — Святаслава, Сяргея, Сямёна і Рамана. Атрымалася нечаканае: СССР. А Сяргей адрэагаваў на гэта таксама жартам — старым савецкім лозунгам пра пятнаццаць «рэспублік-сясцёр»: «Пока мы едины — мы непобедимы!». З таго часу ў дружнай кампаніі былі свае сімвал і лозунг... Вядома, гэта быў жарт, у якім, як заўсёды, ёсць доля ісціны. Але нездарма гавораць, што ў любым узросце мужчыны застаюцца дзецьмі ў душы — толькі цацкі ў іх мяняюцца... Наколькі яны маглі лічыць сябе сябрамі? Сяброўства звычайна правяраецца ў экстрэмальнай сітуацыі. А ў спелеолагаў ці альпіністаў чалавечае жыццё, напэўна, вымяраецца даўжынёй і трываласцю вяроўкі, якой якраз і давяраюць яго гэтыя смелыя людзі. А «натхняльнікам» на ўсё новыя падарожжы і прыгоды ў гэтым сяброўскім квартэце быў Святаслаў Цімковіч з яго вечнай няўрымслівасцю і цікаўнасцю, з яго неўміручай прагаю да жыцця...

* * *

...Сяргей пазяхнуў, заўважыўшы, што выехаў на вуліцу Якуба Коласа каля трамвайнага кальца «васьмёркі» і ўжо набліжаецца да аўтобуснай станцыі на Карбышава. Узрадаваўся: на Карбышава, паварот налева да ўніверсама «Віцебск» — і ён будзе дома... А галава ўсё цяжэла... Вочы зліпаліся... Ярковіч пакруціў галавою. Але гэта не дапамагала. «Неабходна высыпацца і не заставацца на працы дапазна», — ён на імгненне заплюшчыў вочы і раптам перад сабою ўбачыў постаць у светла-залатым воблаку святла. Гэта была дзяўчына незвычайнай прыгажосці, якая глядзела Сяргею ў вочы, не адводзячы позірку... Твар дзяўчыны падаўся яму знаёмым. Ён пазнаў жанчыну — гэта зноў была яна. Яна прыйшла. Як і тады... Яна, Белая... А по-

тым... Потым яна раптам закрыла твар рукамі... А святло ўсё мацней і мацней... Ярчей і ярчэй...

Ярковіч расплюшчыў вочы — і рэзкі, пранізлівы слуп святла на імгненне асляпіў Сяргея: нейкая машына неслася насустрач — якраз на яго! Віскнуў, як спалоханы звер, тормаз... Моцны ўдар... Нейкі выбух у галаве... Усплёск чагосьці белабарвовага...

Цемра...

І цішыня...

## Частка II

*Год 2005*

Мітуслівa-дзіўная кветка вогнішча была бачна здалёк у цемры. Яна шапацела-трашчала пра штосьці сваё, спрадвечнае. І людзям, якія сядзелі вакол агню, ніколі не было дадзена зразумець гэта, як і ўсім тым, хто не ведаў, якой была Зямля ў часы, калі на ёй маглі жыць і веліканы, і атланты, і іх прашчуры, пра якіх мы маглі толькі здагадвацца, знаёмячыся з легендамі і казкамі. У кожнага народа свой эпас, свае міфы, паданні. Але шмат чаго агульнага для ўсяго чалавецтва можна ў іх знайсці. І падарожжа ў той нязведаны край здаецца вечным, і толькі для сапраўдных, няўрымслівых, дапытлівых шукальнікаў...

Ля вогнішча іх было чацвёра. Чацвёра маладых мужчын на палянцы, з усіх бакоў акружанай скаламі, якія, здавалася, вяршынямі сваімі дацягваліся да зорак. Зорны шацёр зіхцеў, пераліваўся, Млечны Шлях разліўся туманнай ракою на паўнеба, і гэта надавала ночы яшчэ большую загадкавасць...

Сяргей Ярковіч моўчкі глядзеў на агонь — сімвал нейкай кроўнай блізкасці з далёкімі продкамі, якія, мабыць, пару тысяч гадоў таму маглі сядзець на гэтым самым месцы і думаць пра штосьці сваё, гатуючы вячэру, рыхтуючыся да палявання або ствараючы першыя ў гісторыі чалавецтва творы мастацтва...

Сямён Шац задумліва глядзеў на вогнішча і прутком варушыў бульбіну ў попеле. Больш за ўсё на свеце любіў ён вось такія вечары і смачную бульбачку з дымком, з хрусткай скарынкай і засмажаным на агні кавалачкам сала. Сябры жартавалі, што такі круглаліцы твар мог мець толькі такі аматар бульбы і сала, як Сямён.

Раман Біцюк наліваў у кубкі гарбату, настоеную на травах. Святаслаў Цімковіч сядзеў перад вогнішчам, расклаўшы на каленях карту, і ўважліва яе вывучаў. Спуск у пячору быў прызначаны на заўтра. На краі паляны, адразу за дзвюма елкамі, ёсць вялікі правал — уваход у штольню: спуск амаль вертыкальны.

Сямён узяў у рукі гітару, правёў пальцам па струнах. У начной цішыні пачуўся гімн спелеолагаў — на матыў не то Шварца, не то Акуджавы...

Вогнішча дагарала. Раман падкінуў у агонь сучча, і ён весела затрашчаў — цемры, спачатку, мабыць, задаволенай ад сваёй перавагі над усім, зноўку прыйшлося адступіць.

— Слаўка! Чуеш? А што гэта за гісторыя ёсць пра Саблінскія пячоры? — падаў голас Сяргей.

— Хочаце пачуць яе? Ну слухайце, — Святаслаў нехаця адарваўся ад карты, зрабіў некалькі глыткоў гарбаты, вытрымаў паўзу, абвёў вачыма сяброў і пачаў:

— Гэта здарылася не так даўно. Група альпіністаў адправілася ў горы. Дасягнуўшы вяршыні, пачалі яны спуск, падчас якога самы малады і нявопытны з іх сарваўся. Яго выцягнулі, але спускацца далей з параненым было немагчыма. Таму на адным з горных выступаў яго пакінулі, паабяцаўшы хутка вярнуцца. Але, калі дапамога падаспела, было ўжо позна: ад ран і голаду хлопец памёр. А ягоная душа ніяк не магла супакоіцца. І з таго часу, гавораць, з'явіўся ў гарах Чорны Альпініст, які мог раптоўна ўзнікнуць і напужаць людзей. Аднойчы група старэйшых школьнікаў-турыстаў з кіраўніком адправілася ў паход. І кіраўнік вырашыў пажартаваць з іх. Ноччу ён ціхенька падабраўся да адной з палатак і, прасунуўшы руку ў чорнай пальчатцы ў палатку, жаласлівым голасам папрасіў: «Дайце

хлебушка!». Паколькі ён удзень ужо расказаў дзецям гісторыю пра Чорнага Альпініста, які такім чынам звычайна прасіў у людзей хлеб, то і рэакцыя дзяцей была адпаведнай: яны быццам аслупянелі. Затое ў гэты момант здарылася тое, чаго не мог чакаць ніхто: на плячо кіраўніка раптам лягла чыясьці рука, і нейкі незнаёмы голас спытаў: «А навошта табе мой хлеб?..». Карацей кажучы, загаварыць гэты няшчасны змог толькі на наступны дзень...

Сябры дружным смехам сустрэлі расказ Святаслава.

— Нічога сабе, дажартаваўся! — смяяўся Раман.

— Можаце сабе жартаваць, хлопцы, але, як кажуць, тут павінна быць і доля праўды, — заўважыў Сяргей.

— Правільна, не капа́й іншаму яму — сам у яе трапіш, — дадаў Сямён. — Цікава, а якія яшчэ байкі пра спелеолагаў ходзяць?

— Што, цікава? Толькі не смейцеся. Чорны Альпініст быў? Дык вось... Ёсць яшчэ гісторыя пра Белага Спелеолага...

Сябры ўсміхнуліся. Стваралася ўражанне, што Святаслаў хацеў проста пажартаваць, каб падбадзёрыць сваіх сяброў перад заўтрашнім выпрабаваннем.

— Дзе тут праўда, а дзе не, — не ведаю. Вядома, што ёсць цэлы рытуал, звязаны з ім. Заўтра, калі пашанцуе, вы нават наведаеце яго магілу. На ёй спелеолагі звычайна пакідаюць якія-небудзь рэчы, папярэдне запаліўшы свечку і пасядзеўшы некалькі хвілін побач. Рэчы гэтыя на магіле чапаць нельга — яны ад Белага...

Ён памаўчаў.

— А гэтыя Саблінскія пячоры — сапраўдная анамальная зона. Па-першае, там свой, ні на што не падобны тэмпературны рэжым — плюс сем-восем градусаў. Кажуць, што нават елка, якую б ссеклі і пакінулі там, захавалася б такой жа на ўвесь год. Але самае галоўнае: на ніжніх ярусах можна ўбачыць усялякія дзівосы, якія лічаць за звычайныя галюцынацыі, доўга блукаць і, у рэшце рэшт, не ўбачыць больш свету белага. А чаму — ніхто не ведае. Ні адзін спелеолаг туды яшчэ

не даходзіў — баяцца. Таму магіла там можа быць і сапраўднай... Хаця... Па прыгажосці мясцовыя карсты[1] не ўступаюць сусветна вядомым.

— Слухай, Слава, а чаму лічаць дрэннай прыкметай перад спускам усе размовы пра жанчын? Мы ж нармальныя мужыкі! — не вытрымаўшы, спытаў Раман. Зразумела, што ён не хацеў падымаць гэтую тэму, але цікаўнасць перамагла.

— Ёсць і такі забабон. У нас жанчына, як і ў маракоў: і на карабель, і ў паход пускаць яе нельга аднолькава. Хаця ёсць і жанчыны, захопленыя нашай справай. Дарэчы, шмат страшылак звязана менавіта са слабым полам. Але пра гэта — пасля ўсяго, калі ўжо падымемся наверх, і не раней. Зараз трэба класціся спаць. А заўтра з самага ранку — па конях. Добра?

— Слава, мы ж не дзеці ўжо, і ў розныя казкі пра Белага Спелеолага не верым. Раскажы зараз! — папрасіў Біцюк.

— А заўтра, калі, не дай Бог, што-небудзь здарыцца, я буду вінаваты? У адрозненне ад маладых, мы, бывалыя, у забабоны верым! І хопіць пра гэта. На сёння ўсё.

Сямён таксама асцярожна заўважыў:

— Ромка, а давай пасля пра гэта пагаворым! Ужо позна, заўтра складаны дзень. А калі табе не спіцца, лепш бы вяроўкі праверыў.

— Ужо даўно праверыў усё. Сёма, калі ты баішся, то не слухай. Мне цікава. А табе, Сярго?

Сяргей, у якога быў добры настрой, думаў, што вечар, пачаўшыся з жартаў, жартамі і скончыцца. Ён, хоць і даволі вопытны спелеолаг, не ведаў гэтых забабонаў, яму таксама было цікава, і таму падтрымаў Рамана:

— А праўда, Слаўка, раскажы! Ну што з намі можа здарыцца? Давай, у трох словах. І адразу спаць. Добра, хлопцы?

[1]Карст — сукупнасць працэсаў і з'яў, звязаных з дзейнасцю вады, якія выражаюцца ў растварэнні горных парод і ўтварэнні ў іх пустэч, а таксама своеасаблівых формаў рэльефу. Тут: пячоры ў тоўшчы вапняку.

Раман узрадаваўся. Сямён зірнуў на сябра недаверліва.

У кустах пракрычала нейкая птушка. Месяц амаль схаваўся за хмару і цяпер глядзеў на зямлю загадкавым, з туманнай паволокаю, вокам.

Святаслаў Цімковіч, як бывалы спелеолаг, верыў у забабоны, але зараз усё ж такі змаўчаў: або не хацеў паказаць сваёй слабасці, або не хацелася псаваць цудоўны вечар.

— Ну што... Калі ўсе хочуць пачуць... Добра, сябры. Ёсць адна легенда. Хаця, кажуць, што гэта праўда... Бывае так, што альпініст або спелеолаг, заблукаўшы ў гарах ці ў падземным лабірынце, раптоўна бачыць перад сабою жаночую постаць, абрыс, цень... Гавораць людзі, што гэта душа загінуўшага не сваёй смерцю чалавека прыйшла па тваю душу. І той чалавек, што ўбачыць Белую Жанчыну — так яе называюць у народзе, — знаходзіць потым сваю смерць... Белая прыходзіць да чалавека толькі перад ягонай смерцю — як быццам прадказвае яе яму. Таму лічаць: калі сустрэнеш яе — рыхтуйся да смерці!..

— Мабыць, яна прыходзіць з касою, у чорнай сутане? — засмяяўся Раман.

— Дарэмна смяешся, — працягваў Святаслаў. — Яна, вядома, прыходзіць у розным абліччы, але, па чутках, твар у яе дзяўчыны, што нядаўна пайшла з жыцця. А душа яе пакуль яшчэ не знайшла спакою, таму што памёр чалавек не сваёй смерцю...

Святаслаў замаўчаў, узіраючыся ў слабыя пялёсткі агню, якія, нібы адцвітаючая кветка, дасылалі свае водбліскі даўно адышоўшаму ў небыццё дню.

«Час праходзіць скрозь нас, мы мяняемся пад яго уздзеяннем. І нішто не можа стрымаць гэты адвечны рух», — чамусьці такая думка мільганула ў Ярковіча. Ён адчуў, як халадок прабег па спіне. Нейкая птушка, мабыць, пугач, адпраўляючыся на паляванне, так загухкаў, што невядомы спалоханы звер шмыгнуў у высокай траве і знік за елкамі.

Дрыжыкі пабеглі па спінах сяброў.

У Сяргея мільганула думка, і ён заўважыў:

— А памятаеце легенды пра Чорную панну Нясвіжа, пра гальшанскі прывід у выглядзе маладой дзяўчыны...

— Дык можа наша Белая Жанчына з Гальшан? — перахапіў ініцыятыву Раман. — А што гэта за легенда?

— Расказваюць, што падчас будаўніцтва кляштара ў Гальшанах адна сцяна кожны раз абвальвалася. Будаўнікі з мясцовых даведаліся, што неабходна ў гэтую сцяну замураваць маладую дзяўчыну. Тады яны дамовіліся, што прынясуць у ахвяру тую, якая першай прынясе абед аднаму з іх. А здарылася так, што якраз некалькі дзён таму ажаніўся самы малады з будаўнікоў. Ён з радасцю падумаў: яго маладая жонка будзе спаць доўга, таму ён з лёгкасцю пагадзіўся з усімі. І не ведаў ён: яна так моцна кахала свайго маладога мужа, што, вядома ж, першай прыляцела з вузялочкам ежы для яго. А ён, зразумеўшы ўсё, ужо нічога не мог зрабіць — яго жонку замуравалі жывой у сцяну. Кляштар стаіць і зараз. Але людзі з таго часу шмат разоў бачылі на сцежцы каля кляштара маладую дзяўчыну ў старадаўнім убранні... Хаця на гэтым гісторыя не закончылася... Раскажу потым, добра? — Сяргей, сам захоплены прыгажосцю беларускай легенды, не хацеў спыняцца, успомніў, што час ужо позні, але не стрымаўся і запытаў у камандзіра: — Слаўка, а ці ёсць падобная легенда пра спелеолагаў, і чаму Белая Жанчына звязана менавіта з пячорамі?

Святаслаў падумаў з хвіліну і пачаў:

— Уся гісторыя чалавецтва звязана з пячорамі. Адзін знакаміты археолаг па прозвішчы Петрын калісьці пісаў, што нездарма паўсюль на зямлі, ва ўсе часы змрочны падземны свет лічыцца царствам мёртвых. За ўваходам у яго вандроўніка чакалі адны жахі: трохгаловы Цэрбер, адская рака Ахеронт з перавозчыкам Харонам... Прычым, заўважце, — Святаслаў абвёў позіркам сяброў, — ён, гэты Харон, вязе заўсёды толькі туды і ніколі назад...

— А Арфей з Эўрыдыкай не выключэнне? — заўважыў Сямён. Ён трымаў у руках бульбіну і, разламіўшы чорны асмалак, з задавальненнем рыхтаваўся зняць пробу з гэтай смакаты.

— Гэтая гісторыя скончылася дрэнна, памятаеце? — Сямён зрабіў некалькі глыткоў гарбаты. — Смачна... Арфей страціў сваю Эўрыдыку назаўсёды, калі не вытрымаў — павярнуўся, каб праверыць, ці ідзе за ім цень яго жонкі. Не выканаў загаду Аіда і страціў яе...

— ...Там жа, у гэтым падземным царстве жыў бог смерці Танатас з багіняю Гекатай і ўсялякімі змеямі, драконамі, ведзьмакамі і іншымі жахлівымі істотамі...

— Ну ты і сказаў, Славік, — «жыў бог смерці»! — засмяяўся Раман.

А Святаслаў, не зважаючы на словы сябра, працягваў:

— Не забывайце, пад зямлёю знаходзіцца і хрысціянскае пекла. Са знакамітым надпісам ля ўвахода: «Пакінь надзею кожны, хто ўваходзіць!». І далей, па Дантэ, там «небосвод, зловещий и беззвёздный, был воплями и криком оглашён...». Большасць пячор, як вы ведаеце, утварылася ў вапняках і гіпсах пад уздзеяннем вады на працягу мільёнаў гадоў. І пры гэтым пячоры назапасілі ўнікальную інфармацыю не толькі аб гісторыі свайго развіцця, але і аб навакольным свеце. У чым жа ўнікальнасць той інфармацыі? — спытаеце вы. Яна не патрывожана нічым, не сапсавана часам — яна застыла ў стагоддзях...

Святаслаў на нейкі час сцішыўся, услухаўся ў цішыню і, здалося, на імгненне адчуў тонкі, няўлоўны рух часу. Ён, час, прайшоў праз яго цела, не спыняючыся, без аніякага гуку, і рух гэты можна адчуць толькі сэрцам і памяццю сваёю і чалавецтва.

— Старажытны чалавек жыў заўсёды каля пячор, якія лічыў яшчэ і святымі месцамі, капішчамі, у якіх спраўляў свае абрады. А пасля ледніковага перыяду ён аддаляецца ад іх, і знікае падземны жывапіс — петрогліфы, але ўзнікаюць новыя культы і абрады, суадносна з якімі людзі пачынаюць прыносіць ахвяры самім пячорам. Такіх пячор шмат на паўночным Урале. Дарэчы, у адной з іх знайшлі калісьці больш за трыццаць мядзведжых чарапоў. Вось адна з прыкмет. Любы паляўнічы, праязджаючы каля пячоры, абавязкова пускаў у яе цемру стралу з прывязанай да яе манетаю, каб паляванне або проста доўгае

вандраванне было паспяховым. А яшчэ шмат людзей — ужо значна пазней — шукала ў іх скарбы. Таму такія месцы авеяны і шматлікімі легендамі. Напрыклад, у Башкірыі каля сяла Айліна знаходзіцца Айлінская пячора, якую мясцовыя жыхары называюць «Аверкава яма». Яна мае выгляд глыбокага калодзежа — прыкладна дваццаць пяць метраў, але, па чутках, мае адгалінаванні — гроты і нават падземныя азёры.

Шмат паданняў звязана з гэтай пячорай. Гаварылі, што ў ёй жылі фальшываманетчыкі, звязаныя з Емяльянам Пугачовым; былі таксама звесткі, што тут хаваўся раскольнік Аверкій. А літаральна некалькі год таму здарылася вось што. Двое чарговых шукальнікаў скарбаў паднялі вялікую каменную пліту ля пячоры і ўбачылі пад ёй нешта такое, чаго вытрымаць не змаглі. Адзін з іх звар'яцеў і пачаў заікацца, а другі паспеў уцячы. А вось загадкі засталіся. Напрыклад, чаму, як кажуць людзі, у двух гротах потым знайшлі шмат касцей і каму было выкладваць каменную лесвіцу на дваццаціметровай глыбіні? І тым больш у поўнай цемры.

Пячора тая знаходзіцца за тры кіламетры ад вёскі на беразе ракі Аі, на лясістым узгорку. У ёй на дваццаціметровай глыбіні знаходзяцца два вялікія гроты, да якіх вядзе вертыкальны праваl шырынёй два на тры метры. Падлога гротаў няроўная, засыпаная даламітам і вапняком, перамешанымі з глінаю. У першым гроце — невялікае азярцо з крынічнай вадою, якая захоўваецца тут круглы год. А ў другім гроце вада з'яўляецца толькі вясною. Вышыня грота — шэсць метраў, а глыбіня возера — каля двух. Ад грота ішлі два тупіковыя хады даўжынёю каля пятнаццаці метраў. Паміж гротамі — скурнік больш за дванаццаць метраў. Чаму я ўсё гэта пералічваю? Справа ў тым, што калі аб'яднаць усе ходы, скурнікі, гроты, то ў сукупнасці атрымаецца сто трыццаць метраў. Пячора сырая, са шматлікімі капяжамі са столі. Але галоўнае не гэта. Гавораць, што ў 1965 годзе этнаграфічнай

[1] Скурнік — тут: вузкі падземны праход.

экспедыцый на глыбіні трыццаці пяці метраў на дне правалу было знойдзена азярцо з крынічнай вадой, побач — каменны ложак, а на ім — шкілет чалавека. Легенда была звязана з каханнем беднай верхняайскай дзяўчыны Кацярыны да Аверкі. Але калі той даведаўся, што Каця чакае ад яго дзіця, то ажаніцца з ёю не пажадаў, гаворачы, што нясе «божаскі сан», які, маўляў, забараняе яму рабіць гэта. Засумавала Кацярына, а потым выпадкова даведалася, што яе каханы сустракаецца з блуднымі манашкамі з суседняга манастыра. Нянавісць запаланіла яе душу, і Кацярына кінулася ў глыбокі вір. Пасля гэтага, гавораць, у пячорах, і не толькі ў Башкірыі, бачылі постаць дзяўчыны, апранутай ва ўсё белае. Яе празвалі Белай Жанчынай. І кажуць, гора таму, хто ў поўнай цемры ў бліскучабелым арэоле ўбачыць яе — яна прыходзіць толькі перад смерцю, каб забраць душу...

Святаслаў крыху памаўчаў.

— А вось якая сувязь паміж знаходкай у 1965 годзе і гэтай гісторыяй — дакладна не ведаю. Гаварылі толькі, што жыў у пячоры больш за пяцьдзясят гадоў схімнік, якога звалі таксама Аверкій. Карміўся ён тым, што рабіў нацельныя крыжыкі з «паточнага» каменю. А потым, пасля яго смерці, у Аверкіну яму вадзілі цэлыя экскурсіі, і знайшлі яны шмат чаго цікавага...

Святаслаў замаўчаў, зноў узяў кубак з гарбатай, потым нейкі час задумліва глядзеў на полымя, якое ціха згасала ў начной цемры, і песня агню таксама гучала прыглушана, не замінаючы сябрам услухоўвацца ў словы іх камандзіра.

А ў Святаслава нібы нейкая намітка раптам спала з вачэй — ён схамянуўся.

— Ну што, напужаў я вас? Бачу. Давайце па палатках. У сем пад'ём. Я прасачу, — Святаслаў абвёў позіркам сяброў. — Усім дабранач!

Заліўшы кастрышча вадою, хлопцы нарэшце разышліся па палатках.

## Частка III

Ва ўяўленні чалавека, які больш-менш знаёмы з паняццем «спелеалогія», спелеолаг — гэта звычайны турыст, з рукзаком, ну, можа, яшчэ ў касцы, зрэдку з вяроўкай, які спускаецца пад зямлю, дзе шлях у пячору прыкладна такі ж, як у шматпавярховым доме ў падвал — пяць-дзесяць метраў. І ўсё. Не рызыкоўнае падарожжа, а лёгкі шпацыр.

Але гэта не так. Вядома, што ў зямной кары ёсць пустэчы, якія ў большасці сваёй могуць быць звязаны адна з адной, утвараючы шматкіламетровыя падземныя хады, па якіх без спецыяльнай падрыхтоўкі звычайна прайсці нельга. Мала таго, што спуск пад зямлю можа быць амаль вертыкальным, і тады ў пячору можна трапіць толькі тым, хто сур'ёзна займаецца альпінізмам; але лаз можа быць такім вузкім, што, як гавораць спелеолагі, па ім не пралезеш, пакуль амаль усю скуру не здзярэш — таму нездарма гэты вузкі ход яны называюць «скурнікам». А яшчэ больш цікава, калі такі ход напалову ці поўнасцю запоўнены вадою. І тады альпіністы ператвараюцца ў аквалангістаў — «дайвераў», як цяпер кажуць. Такі вузкі падводны праход спелеолагі называюць «сіфонам». Увогуле шмат перашкод чакае гэтых мужных людзей. Таму сапраўдны спуск пад зямлю — гэта не адпачынак, як уяўляецца многім з нас, а цяжкая праца, што патрабуе выдатнай спартыўнай формы і пастаянных трэніровак. Спелеолаг — гэта адначасова і рамантык у душы, захоплены цікаўнасцю да ўсяго новага, і альпініст, аквалангіст, і добры псіхолаг. Але галоўнае — гэта добры, верны таварыш, які ніколі не кіне ў бядзе сваіх. Спелеалогія — гэта пераадоленне сябе, пастаянны экстрым, праверка на «вашывасць». Звычайна яна адбываецца на вайне. А ў мірны час любы экстрым — перш за ўсё вайна з самім сабою, са сваёй чалавечай прыродай, сваім «эга». Таму ніхто і ніколі не зможа зразумець сучасных экстрэмалаў, да якіх, безумоўна, адносяцца і спелеолагі. І няма людзей, больш шчаслівых за іх, калі яны дасягаюць сваёй мэты. Хаця потым будуць дзясяткі новых планаў, і ўсё пачнецца нанова...

Асобна неабходна сказаць пра экіпіроўку спелеолага, ад якой залежыць не толькі здароўе чалавека, але і яго жыццё. Спачатку на голае цела спелеолаг апранае ізатэрмік. Гэта цеплаізалюючы камбінезон з поліартэка або воўны. Наступны слой — кандэнсатнік — «хабэшны» касцюм, што ўбірае ў сябе вільгаць і пакідае сухім ізатэрмік. Потым апранаецца гідракасцюм сухога тыпу. І, нарэшце, — добры, трывалы камбінезон — «камбез», як называюць яго спелеолагі. На галаве ў іх, як у шахцёраў, заўсёды каска з налобным ліхтаром, які павінен быць надзейным і ніколі не падводзіць. Асобнае месца ў экіпіроўцы спелеолага належыць вяроўцы, пра якую, як і альпіністы, яны павінны ведаць усё — кожны поўнасцю давярае ёй сваё жыццё. Таму перад спускам любая вяроўка праходзіць цэлае выпрабаванне. І перш за ўсё — на трываласць.

* * *

Сонца толькі паспела падняцца над вяршалінамі старых елак і правесці сваімі гарачымі далонямі па роснай, соннай яшчэ зямлі. Горы, як паважныя аксакалы, чые косці не могуць сагрэцца нават пад спякотнымі сонечнымі промнямі, лянiва пазіралі зверху ўніз на лугі, даліны, людзей, што ў параўнанні з гэтымі волатамі былі не большымі за мурашоў, здавалася, снавалі тут, унізе, без аніякай мэты. Мітусіліся на вялікай, неабсяжнай зямлі.

Пачалася праца і ля ўвахода ў пячоры. Пасля вертыкальнай штольні на шаснаццацімятровай глыбіні пачынаўся першы ярус падземных хадоў, які меў некалькі галоўных накірункаў. Усяго такіх умоўных ярусаў было чатыры. У першыя два вопытным спелеолагам можна было дабрацца без асаблівых перашкод, а вось трэці і чацвёрты ярусы былі прызначаны для людзей са спецпадрыхтоўкай. Дарэчы, у чацвёрты не забіраўся амаль ніхто: два гады таму група спелеолагаў увогуле ледзьве выбралася назад. І ніхто з гэтай групы пасля пад зямлю больш

не спускаўся. Акрамя Святаслава. Ён быў тады ў той групе, але што здарылася там, што ён і яго таварышы бачылі, — ніколі не гаварылі...

Кажуць, што ніколі нельга вяртацца ў тыя месцы, дзе табе было вельмі добра — тады адпаведны ўспамін аб ім заўсёды прыцягвае, нанова прымушае перажыць тое ж самае. Хаця сапраўдную прычыну кожны чалавек захоўвае ў душы. І гэта неспазнана. Гэта асабістае, нават інтымнае...

Святаслаў ішоў першым. Ён увогуле па жыцці быў першым. Ва ўсім: у навуцы, якой быў адданы цалкам; у сям'і, таму што шчыра кахаў жонку Людмілу і сваіх дачок. А яны, у сваю чаргу, лічылі, што знаходзяцца за мужам і татам як за каменнай сцяною. І, вядома ж, у спелеалогіі, якой аддаваў шмат часу, хаця не мог дараваць сабе, што пасля той экспедыцыі ў яго быў першы сур'ёзны канфлікт з яго Людаю. Святаслаў імкнуўся ва ўсім ёй дапамагаць, падтрымліваў яе як мог, але тут... нават дайшло да «ўльтыматума», чыста жаноцкага: «Або сябры, або я...». І — слёзы... Ён баяўся яе слёз, не любіў і баяўся. Разумеў, што з яе боку гэта была зброя не для атакі — хутчэй, для абароны. Ад яго, Святаслава, яе мужа, бацькі іх дзяцей. А ён, у сваю чаргу, прывык заўсёды трымаць слова. Таму на гэты «ўльтыматум» адказаў проста, як мог у такой сітуацыі: «А я і сам нікуды не змагу пайсці — чамусьці боязна. А далей пабачым... «Людміла толькі ўздыхнула. Яна рэдка спрачалася з мужам. А тут усім сэрцам адчула: быць яшчэ экспедыцыі, і не адной. Такі ён — ва ўсім. Дзе штосьці не атрымалася — трэба абавязкова вярнуцца, выправіць памылку, нават з другой або з трэцяй спробы...

...Прыбіўшы чарговы шлямбурны крук[1] і завязаўшы двайны булінь[2], Святаслаў, ухапіўшыся за каменны выступ, зірнуў наверх. Усё ішло як па масле. Падабраўшы «вус»[3], папярэдзіў сяброў:

---

[1]Шлямбурны крук — спецыяльны металічны крук, які забіваюць у сцяну для замацавання вяроўкі.

[2]Двайны булінь — вяровачны вузел альпіністаў і спелеолагаў.

[3]Вус» — страховачны канец.

— Уваход на першы ярус праз скурнік убок на сем з паловай метраў — як на схеме!

Ён асцярожна, але разам з тым упэўнена, «крочыў» уніз, выбіраючы для «крокаў» скальныя выступы.

Нарэшце ход пайшоў убок і амаль гарызантальна. Можна было крыху перадыхнуць. Святаслаў зірнуў уверх: над ім чулася ляскание карабінаў, шорканне чаравікоў з «кіпцюрамі» і зрэдку кароткія дыялогі яго таварышаў. Неўзабаве за Святаславам у ход праціснуўся Раман. А за ім — Сямён. Замыкаў групу Сяргей. Падчас невялікага адпачынку Святаслаў паведаміў сябрам:

— Ну што, сябры, памятаеце ўчарашнюю размову? Зараз я вам нешта пакажу.

* * *

Амаль гарызантальны штрэк[1] ішоў, віхляючыся, глыбей. Аднойчы са «столі» пырхнула, зусім як у кіно, некалькі кажаноў, збянтэжыўшы на хвіліну найменш вопытнага з усёй групы Рамана, які ішоў у звязцы са Святаславам.

— Індыяна Джонс адпачывае! — раптоўна вырвалася ў яго. На імгненне ён збянтэжыўся, потым коратка спытаў: — Слава, хутка ўжо?

— Вось, прыйшлі.

Святаслаў паказаў рукою ў цемру перад сабою. Падышлі астатнія. Калідор заканчваўся невялікім памяшканнем. Каля самай сцяны чатыры промні ліхтароў выхапілі надмагілле з жарствы. На ім ляжала каска з чорным вокам ліхтарыка наверсе, а таксама запалкі, свечкі і іншая дробязь.

— Магіла Белага Спелеолага, — успомніў Сямён аповед камандзіра. Цімковіч запаліў свечку і прысеў каля «мемарыялу»: — Такі вось абрад...

Усе таксама прыселі на хвіліну разам са Святаславам. Агеньчык свечкі не згасаў, як загадкавая кветка, палымнеў у цемры каменнага калодзежа, выхопліваючы з яе час ад часу цёмнабарвовыя твары вандроўнікаў.

---

[1] Штрэк — гарызантальная падземная горная выпрацоўка, якая не мае непасрэднага выхаду на паверхню.

Сяргей зірнуў на гадзіннік, стрэлкі якога весела адлівалі светла-зялёным колерам.

— Па часе ўсё добра. Што далей, камандзір? — звярнуўся ён да Святаслава.

— Зойдзем у карст трэцяга яруса. Гэта, праўда, самае халоднае месца ў пячорах і, мабыць, на сённяшні момант галоўная мэта нашага падарожжа. Ну што, наперад?

Сяргей Ярковіч раптам падхапіўся са свайго месца, быццам нешта ўспомніўшы.

— Слава, ты ж памятаеш, што ў самай ніжняй кропцы пячор, дзесьці на ўзроўні чацвёртага яруса, ёсць карст, па прыгажосці якому няма роўных ні ў СНД, ні ў Еўропе. Але там бывалі адзінкі. Нават вы ў мінулым годзе так і не дайшлі да гэтай пячоры. Там, вядома, можа спатрэбіцца кісларод. Але, — ён памаўчаў, — хто не рызыкуе, той, ты ведаеш, не п'е шампанскага. А ў мяне, — са смехам скончыў Сяргей, — ужо бутэлечка прыхавана. Там, наверсе. Рызыкнём?

— А што, хлопцы, — падхапіў Раман, — не адным аксакалам нашым лаўры насіць, трэба і нам паказаць, на што мы здольныя! Тым больш ты, Слава, учора панарасказваў усялякіх жахаў — гэта нават цікава!

— А я б добра падумаў, сябры мае, перш чым згаджацца на гэтую авантуру, — заўважыў Сямён. — Па-першае, мы планавалі сёння ісці не далей трэцяга ўзроўню. Па-другое, у нас няма неабходнай падрыхтоўкі. А па-трэцяе, адтуль амаль ніхто не вярнуўся, а хто вярнуўся — той нічога не мог успомніць. Чаму? Вось гэта і ёсць галоўнае пытанне. А Белая? Пра яе забыліся? А калі гэта не байкі, калі яна сапраўды існуе? Мы ж дарослыя людзі!

Тэмпераментны Сямён Шац заўсёды менавіта так прывык выказваць свае думкі. Дзіўна, што ў ім злучаліся такі выбухны тэмперамент і рэдкая разважлівасць, асабліва падчас спрэчных жыццёвых момантаў.

— Сёма, ты не бойся, мы нічога тваёй Софе не скажам, — жартаўліва парыраваў Раман. — Ты лепш прызнайся, што проста баішся!

— Гэта ты ў нас нічога не баішся, дурань, — ласкава-насмешліва заўважыў Шац. — Малады, дурнаваты і нежанаты. Нічога, жонка калі-небудзь пакажа табе, дзе ракі зімуюць. Вось ажэнішся — заспяваеш па-іншаму!

Святаслаў напружана разважаў пра сябе і ніяк не мог вырашыць, як усё ж зрабіць: спусціцца са сваімі сябрамі да чацвёртага ўзроўню і завяршыць справу мінулага сезона, што давала магчымасць навекі застацца ў аналах гісторыі спелеалогіі ў любым выпадку, калі з іх хаця б адзін выжыве — а ў гэтым ён не быў упэўненым; ці ўсё ж спыніць экспедыцыю на больш лёгкім узроўні, выканаўшы хаця б праграму-мінімум... Адно Цімковіч ведаў цвёрда: ад першапачатковага плана звычайна адступаць нельга. Больш таго, гэта можа быць небяспечна для жыцця ўсіх яго таварышаў. Але мэта была такою блізкаю, яна вабіла і спакушала яго. Што гэта было: салодкі падман або ўвасабленне мары, трыумф і, у рэшце рэшт, — сусветная вядомасць, слава, пашана, бесклапотнае існаванне для Людмілы, дачок?..

Усё гэта маланкаю пранеслася ў галаве Цімковіча (хаця ён зрабіў свой выбар даўно — яшчэ калі праходзіў трасу ў мінулым годзе і, як сапраўдны першаадкрывальнік у душы, не мог не скарыстаць такі выпадак)...

Святаслаў сказаў проста:

— Я вельмі рэдка мяняю свае планы. Але наша падарожжа не зусім звычайнае — я спадзяюся, вы зразумелі гэта з самага пачатку. Мы разам ужо не першы год, і адзін аднаго разумеем амаль з паўслова. І калі ёсць ахвотныя рызыкнуць, вядома ж, узважыўшы ўсе «за» і «супраць», — то і я падтрымаю вас. Але ўмова такая: як толькі адчуем, што нешта не так, — адразу ж вяртаемся. Хто «за»?

Сяргей з Раманам адразу ж паднялі рукі — яны ўжо ўзрадаваліся, ведаючы, што калі Святаслаў будзе на іх баку, то і Сямён будзе вымушаны падпарадкавацца большасці. Але Біцюку гэта бачылася дагэтуль як нейкая гульня, умоўнасць, а Ярковічу — як магчымасць даказаць сабе і іншым сваю

прафесійную сталасць, павысіць узровень і разам з больш вопытным Цімковічам зрабіць вялікае адкрыццё. Але скажыце, хто ў маладыя гады пра гэта не марыць!

— Узроўні тут умоўныя. Гэта, значыць, каб прайсці, скажам, да трэцяга, можна скарыстаць розныя маршруты — яны ёсць на карце. Можна, як у нашым выпадку, прайсці па больш лёгкай трасе праз другі і трэці ярусы, а можна пайсці напрасткі — праз трэці і выйсці да знакамітай Каменнай брамы. А што за ёю — ніхто не ведае. На ўваходзе ў яе быццам каменная пляма — кажуць, што гэта пячатка, якую нельга здымаць — як у скрыні Пандоры. Але даведацца, што там — мара любога з нас... У мінулым годзе мы амаль разгадалі тую таямніцу. Але...

Святаслаў змоўк, узіраючыся ў рознакаляровыя плямкі ад ліхтарыкаў на супрацьлеглай сцяне пячоры.

— Я не ведаю, што чакае нас там, але вельмі рады ад таго, што мы зноўку разам. А калі мы разам — нам падуладна ўсё, нават такія таямніцы.

## Частка IV

Раман, ідучы за Святаславам, думаў пра тое, што вельмі марудна цягнецца час. А яму хацелася пагаварыць, пажартаваць з сябрамі, асабліва са Святаславам. Гэта сапраўдны камандзір, нічога не скажаш, — мудры дарадца, які абавязкова дапаможа, падтрымае амаль ва ўсім. Яму ўспомнілася раптам, — а пра гэты выпадак ён ніколі не забудзе, — як яны з сябрам Міколам пайшлі на пачатку восені па журавіны.

Стаміўшыся, Раман прысеў адпачыць каля нейкага зялёнага лужка на ўзлеску. А пасля заўважыў, што праз луг напрасткі шлях значна карацейшы: каб выйсці з лесу, неабходна было яшчэ абмінуць невялікі лясок з непраходным кустоўем. Сабраўшы, відаць, апошнія сілы, хлопцы намагаліся ўжо дасягнуць гасцінца, пашыбаваўшы па гэтым лужку. Але тут Раман,

які першым ступіў на зялёны покрыў, раптам адчуў, што глеба літаральна захісталася... Яшчэ момант — і ён па пояс апынуўся ў балотным брудзе: дрыгва ніколі не выдае сябе, а, наадварот, можа маскіравацца пад зеляненькі дыванок, з рэдзенькімі раслінкамі, — так што нездарма гэты лужок падаўся сябрам такім ідэальным. А самае галоўнае тое, што глыбіня ў такім месцы можа дасягаць нават дзясятка метраў. Біцюк не паспеў нават спужацца, а толькі інстынктыўна рвануўся наверх, упэўнены ў тым, што балота абавязкова выпусціць яго са сваіх учэпістых кіпцюроў. У гэтым і была памылка Рамана: трэба было проста легчы на паверхню і з дапамогай сябра дасягнуць цвёрдай зямлі. Але хлопец апынуўся ў твані ўжо па плечы. Стала цяжка дыхаць. І з ягонага горла замест крыку вырваўся толькі сіп. Мікола, адстаўшы ад сябра, пакуль што не бачыў, што здарылася з ім: на самым узлеску ў траве ўбачыў прыгожанькага баравічка. Акуратна зрэзаўшы яго, паклаў у цэлафанавы пакет і зноў нахіліўся да зямлі, узіраючыся ў траву: белыя звычайна растуць цэлымі сем'ямі. А Раман тым часам пачынаў разумець, што ягонае жыццё ў руках Боскіх і што нічога яму ўжо не дапаможа, акрамя цуду.

Адкуль з'явіўся гэты чалавек, ён і дагэтуль не ведае. Але з боку невялікай далінкі, што вяла якраз да балота, паказалася чыясьці постаць. Мужчына гадоў трыццаці «з хвосцікам» ішоў даволі спрытна, цвёрдай, упэўненай хадой, танклявы, высокага росту, з худым тварам, на якім добра вылучаўся «арліны», з гарбінкаю, нос, а ямачка на ягоным падбародку надавала яму нават нейкай імпазантнасці, нягледзячы на вопратку зусім не для свецкага раўта. На палінялай штармоўцы хістаўся з боку ў бок невялікі рукзак немаведама якога колеру. Шапачка-«пеўнік», што была распаўсюджана ў СССР пасля зімовай Алімпіяды ў югаслаўскім Сараеве (дзе зараз тая Югаславія!), мела таксама такі выгляд, быццам была равесніцай рэвалюцыі сямнаццатага года. Па ўсім відаць было, што ў гэтага чалавека за плячыма нямалы вопыт ван-

дровак, нягледзячы на яго маладосць. Або ён быў чорнарабочым дзе-небудзь у качагарцы. Чалавек нават прысвіснуў, убачыўшы галаву Рамана над тванню. Не сказаўшы ні слова, ён выцягнуў з рукзака доўгі трос. Абматаўшы адзін канец вакол выламанага ім хісткага танкаватага дрэўца і зацягнуўшы моцны надзейны вузел, другі канец вяроўкі ён прывязаў да вершаліны каржакаватага дубка, што рос ля балота, прыгнуў яе вельмі нізка і ўтварыўшы нешта накшталт спружыны. Потым кінуўся на зямлю і папоўз бліжэй да Рамана, трымаючы перад сабою ствол дрэва.

— Так, хлопец, спакойна, толькі спакойна, — гаварыў ён, падпоўзшы ўжо зусім блізка (ён, пэўна, баяўся, што Раман зробіць зараз адзін рэзкі рух, убачыўшы, што прыйшла дапамога, — і ўсё прапала...). А той зразумеў, што для выратавання ёсць адна або, калі пашанцуе, дзве спробы. Кожная памылка, наадварот, можа каштаваць яму жыцця. І толькі зараз, у тую хвіліну, Раман адчуў, як усё сур'ёзна. Кожная клетачка цела, здавалася, прагна жадала жыць! А ўсё, што здарылася, было такой дурной выпадковасцю! Ён жа яшчэ такі малады!

І, убачыўшы перад сабою незнаёмца, Раман Біцюк чамусьці падумаў, за нейкую долю секунды, што абавязкова выжыве... З усяе сілы ён ірвануў руку наверх, схапіў ёю ствол, а другою ўчапіўся ў штармоўку незнаёмца. І тут здарылася нечаканае: трос нацягнуўся раптам, як струна, і Раман адчуў, як зачвякала балота, з вялікай неахвотай выпускаючы з учэпістых лап сваю ахвяру: гэта Мікола, «дагнаўшы» нарэшце сябра, кінуўся на дапамогу. Схапіўшы трос, ён так моцна пацягнуў за яго, што амаль адразу «вышчыкнуў» Рамана з дрыгвы... Колькі ўжо год прайшло з таго часу, а Мікола нават дагэтуль так і не змог растлумачыць, як у адзіночку справіўся з гэтым. Мабыць, з вялікага перапуду. А імя таго незнаёмца было Святаслаў. Святаслаў Цімковіч, той самы. І потым Раман, дзякуючы свайму новаму сябру, сур'ёзна захапіўся спелеалогіяй...

...Ад пустэчы з надмагіллем скурнік вёў усё далей пад зямлю — пад вуглом градусаў 45, а затым (Святаслаў усіх пра гэта загадзя папярэдзіў) спуск працягваўся амаль вертыкальна. Але, акрамя звычайных каменных выступаў, пачалі трапляцца і нацёкі вапняку, у якія ўжо і не кожны крук увойдзе. Паступова Святаслаў адчуваў, як дыхаць станавілася цяжэй, чым звычайна. Камбез давіў, не даваў свабодна рухацца. Як самы вопытны з хлопцаў, ён думаў пра сваіх таварышаў, ведаў, што маглі адчуваць яны, спускаючыся ўсё ніжэй, да невядомага, нязведанага...

Біцюк, ідучы за ім, думаў, як марудна цягнецца час. Яму хацелася пагаварыць, пажартаваць з камандзірам, хаця адчуваў, што яшчэ ранавата даваць волю тэмпераменту, тым больш баяўся чымсьці пашкодзіць сябрам і асабліва Святаславу.

Сямён, завязваючы «прусік»[1], зноўку праверыў карабін[2]. Яму кожны раз здавалася: штосьці можа быць не ў парадку.

Яркові̇ч, дзясяткі разоў праверыўшы яшчэ наверсе ўсе свае вяроўкі і карабіны, наадварот, упэўнена ішоў наперад. Ён добра ведаў тэхніку «адной вяроўкі»[3], якую калісьці распрацавалі балгары; ведаў, што спелеолаг ці альпініст з добрай аснасткай можа вытрымаць рывок троса ажно да 1200 кг. Таму ў сваім начынні Сяргей не сумняваўся ні на хвіліну. Ён давяраў сваім сябрам і, калі б спатрэбілася, адразу прыйшоў бы на дапамогу кожнаму з іх без аніякіх разважанняў.

— Гэй, Сямён! Як ты? — спытаў ён сябра.

---

[1] Прусік — вяровачны вузел альпіністаў і спелеолагаў. Можа завязвацца шнуром дыяметрам 6–7 мм вакол 9–14 мм асноўнай вяроўкі, забяспечваючы тым самым страхоўку альпініста.

[2] Карабін — прыстасаванне ў альпіністаў і спелеоглагаў для фіксацыі вяроўкі.

[3] Тэхніка «адной вяроўкі» — тэхніка, якая ўжываецца ў спелеалогіі для пераадолення вертыкальных участкаў пячор — уступаў, калодзежаў, шахтаў.

— Хутчэй бы ўжо зайшлі, — адазваўся той. — Дзякуй Богу, гнездаванні кажаноў скончыліся. Я, прызнацца, іх, як і пацукоў, не цярплю.

— Паслухай, Сёма, нават дзіўна: пужалі нас тут рознымі страшылкамі, а спуск самы звычайны, як заўсёды. Так, па-мойму, і павінна быць, без сюрпрызаў. Хаця тады навошта ішлі сюды, калі ўсё як звычайна?

Сяргей намацаў рукою чарговы выступ, на імгненне прытуліўся да сцяны, пераводзячы дух.

— Наадварот, трэба заўсёды нечага чакаць, калі ўсё так гладзенька складваецца. Прыкмета нават ёсць такая!

— Глядзі, Сямён, накаркаеш! — Сяргей нарэшце аддзяліўся ад сцяны.

— Пра што вы там гаворыце? — падаў голас Раман, якому не цярпелася з кімсьці пагаварыць.

— Сачы за дарогаю, Біцюг, і не лічы варон, а мо кажаноў, — жартаўліва адказаў Сяргей.

...Праход звужаўся. Спуск доўжыўся ўжо каля гадзіны, а мабыць, і болей: у пячорах час зусім не заўважаецца — ён жыве сам па сабе, не падуласны нікому на гэтай грэшнай зямлі, адна-му толькі Богу. І нават цемра тут не такая — як малочны кісель, калі застыне: халодная, ліпкая, яе тут фізічна адчуваеш. І не дай Божа, напалохацца, напужацца гэтай цемры — яна абавязкова адпомсціць, прымусіць кожны раз пакрывацца халодным потам і баяцца яе...

...Усё. Далей трэба было паўзці: гарызантальны скурнік шырынёй каля двух метраў і даўжынёй (як на схеме) метраў пятнаццаць. А далей... Самі потым убачаць.

Адшпіліўшы карабін, Святаслаў зняў каску, выцер пот з ілба. Мэта іх падарожжа здавалася настолькі блізкай, што ўжо нават хацелася адпачыць. Але ён, географ, які шмат год прысвяціў геалогіі (Цімковіч збіраў калекцыю камянёў, прывезеных ім з розных экспедыцый), добра ведаў, што гор-

ная парода ў гэтым месцы даволі крохкая, і таму ісці трэба вельмі асцярожна, не шумець: можа быць абвал. А быць жывым пахаваным — не самая зайздросная перспектыва для любога спелеолага. Чалавек не вельмі рэлігійны, Святаслаў тым не менш верыў у розныя прыкметы і таму хуценька, напаўголасу прамармытаў нешта накшталт «прабач, Божа, за дурныя думкі» і насунуў каску на галаву. Акумулятараў без замены хапіла б яшчэ надоўга, і таму ліхтарык весела ззяў у цемры, выхопліваючы час ад часу чорныя выступы з бялёсымі наплывамі вапняку.

Спусціўся Раман. Шумна выдзьмуў паветра. Выцер далонню пот. Адшпіліў карабін.

— Ну што, камандзір, прывал? Ці нават абед? — бліснуў у цемры белазубай усмешкай.

— Чакаем астатніх, — коратка адказаў Цімковіч і зірнуў на гадзіннік: і сапраўды абедзены час. «Неабходна ўсё ж дайсці да месца, а там і паямо,» — падумалася яму.

— Ромка, ты вельмі стаміўся? — спытаў Святаслаў сябра.

— Пакуль што не зусім, — адказаў, салодка пацягнуўшыся, Біцюг.

Праз некалькі хвілін падаспелі Сямён і Сяргей.

— Ну што, хлопцы, у мяне ёсць такая прапанова, — пачаў «нараду» Святаслаў. — Да пячоры засталося метраў дваццаць. Праўда, выключна паўзком. І — усё. А там, на месцы, можна і падсілкавацца. Згодныя? Хто «за»?

Камандзір зірнуў на кожнага. Ліхтарык выхапіў з цемры тры паднятыя ўгору рукі. «Як на партсходзе», — падумаў Цімковіч. А ўслых дадаў:

— Толькі хачу папярэдзіць: паводзіць сябе тут трэба вельмі асцярожна, перасоўвацца як мага цішэй — горная парода даволі крохкая, таму могуць быць абвалы. Зразумела?

Усе моўчкі пагадзіліся — нікому не хацелася гаварыць зараз. Сябры адчувалі, што з кожнай хвілінай яны наближа-

юцца да галоўнай мэты — вялікай і вельмі прыгожай пячоры, якая служыла своеасаблівым уваходам у ніжні, самы загадкавы ярус, адкуль можна нават не вярнуцца. Але хлопцы гналі ад сябе сумныя думкі. Хацелася спадзявацца толькі на самае добрае...

## Частка V

Першым у чарнаце скурніка знік камандзір. «Падлога» лаза не была гладкай, а наадварот, шурпатай, са шматлікімі даволі вострымі выступамі. Але, дзякуючы добраму камбезу, накаленнікам і пальчаткам, амаль як у спецназаўца, гэтыя метры не падаліся Святаславу бясконцымі, як пачынаючаму спелеолагу.

Біцюг рухаўся ў цемры ўпэўнена, нават упарта, — як звычайна. Вузкая палоска святла, якая зіхцела тонкім бялёсым шнурком дзесьці наперадзе, у ягоным уяўленні малявала розныя карціны: Раману здавалася, што ў канцы тунэля (банальна і разам з тым натуральна, наяве) чакае яго штосьці незвычайнае, дзіўнае, нават вычварнае...

Сямён поўз вельмі асцярожна: з галавы не выходзіла думка пра абвалы. Шац раптам успомніў, як калісьці яны разам з вясковымі хлапчукамі (аднаго з іх звалі Пятрусь) залезлі ў стог сена і пачалі рабіць у ім хады накшталт падземных. Другі хлопчык, Васька, гадоў адзінаццаці, лез усё глыбей, а праз нейкі час і ўвогуле сцішыўся. Хлопцы спачатку жартавалі з яго — думалі, што спецыяльна вырашыў напужаць. Але ішоў час, а Васіль не падаваў голасу. Пятрусь і Сямён і сапраўды спужаліся, пачалі крычаць, клікаць яго па імені, раскідаць сена.

Па дарозе ішоў трактар. Сямён выбег перад ім, замахаў рукамі. Трактарыст, малады хлопец, хутка падбег да іх і, адразу зразумеўшы сітуацыю, паслаў Петруся па фельчара, што жыў непадалёк, а сам кінуўся да стога і пачаў раскідаць сена

ў розныя бакі. Мужчына ён быў даволі дужы — палова стажка праз хвіліну была расцярушана. І амаль адразу ўбачыў трактарыст Васеву нагу, якая тырчала з-пад сена. У гэты час якраз падбег фельчар з сялянамі. Убачыў, што хлопчык страціў прытомнасць і не рэагаваў ні на што, пачаў рабіць штучнае дыханне. Праз хвіліну-другую Вася расплюшчыў вочы, здзіўлена зірнуў на людзей, быццам штосьці ўспамінаючы, і заплакаў, раптам зразумеўшы ўсё, што з ім здарылася...

Сямён пасля гэтага выпадку доўга баяўся цёмных невялікіх пакояў. І ў спелеолагі падаўся, пэўна, для таго, каб пераадолець сябе. Тым больш што яшчэ са школы камплексаваў з-за сваёй знешнасці: быў невялікага росту, хударлявы, з чорнымі курчавымі валасамі. Даволі часта старэйшыя вучні яго білі, здзекаваліся з яго, смяяліся, давалі крыўдныя мянушкі. Сямён спачатку цярпеў гэтыя здзекі, а потым не змог трываць і пайшоў у секцыю дзюдо. Першыя паўгода заняткаў не прайшлі дарэмна: яго галоўны «візаві» Валодзька Крук, на тры гады старэйшы за Сямёна, апынуўся на падлозе так хутка, што нават спачатку не зразумеў нічога. Ускочыў на ногі, палез ізноў. А пасля падсечкі і балявога, праведзеных па ўсіх правілах, не толькі прызнаў паражэнне, але нават потым прапанаваў «тусавацца» разам...

«...Кожны з нас павінен ставіць перад сабою мэты і абавязкова дасягаць іх — без гэтага жыццё губляе ўсялякі сэнс», — думаў Сямён Шац, паціху перасоўваючыся па скурніку.

Сямён свята верыў у сваю інтуіцыю, якая неаднойчы выратоўвала яго. Даходзіла нават да смешнага: яшчэ ў канцы 80-х, улетку, калі на гульню мінскага «Дынама» можна было яшчэ глядзець без жаху, адправіліся Шац з сябрамі на галоўны гарадскі стадыён. Сіноптыкі яшчэ зранку абвясцілі спякоту і ніводнай кропелькі дажджу. А Сямён, убачыўшы ўначы зорнае неба, чамусьці адразу ж падумаў, што без нябеснай палівальнай машыны футбол не абыдзецца, — і адзін з усёй кампаніі захапіў з сабою парасон. Піцерскі «Зеніт» у той дзень быў на вышыні, і таму ўжо ў першым тайме мінчане

прапусцілі ў свае вароты два галы, прычым другі — пры «дапамозе» абаронцаў. Стадыён роў, як раз'юшаны звер: ніхто не верыў, што так проста, амаль задарма, «Дынама» аддасць перамогу гасцям. І тут, як гавораць, амаль «сярод яснага неба» аднекуль з'явілася чорная хмара, якая хутка заняла ўсю прастору над галовамі гледачоў. Больш ніхто ўжо не сумняваўся: зараз, акрамя піцерцаў, і нябесная канцылярыя дасць усім прыкурыць. І вось адразу пасля невялікага перапынку пачуўся першы выбух нябеснай кананады. І — амаль праз хвіліну мінчане прапусцілі ў свае вароты чарговы, трэці мяч. Балельшчыкі ахнулі. І тут з неба абрынуліся нават не кроплі — струмені, тоны вады... Футбалісты яшчэ намагаліся бегаць, потым зразумелі, што гэта немагчыма пад такім вадаспадам... Шац яшчэ доўга, успамінаючы той матч (які, дарэчы, так і скончыўся поўным разгромам «Дынама»), дзякаваў Богу і жонцы, што тады ўдалося вярнуцца дадому амаль сухім. «Як гусь з вады», — усміхаючыся, любіў паўтараць ён...

...Сямён раптам спыніўся. Чамусьці моцна, амаль да болю, затахтала сэрца. Услухаўся: штосьці не так. Не так, як звычайна, калі ішлі ўсе заўсёды разам, у адной звязцы. Раптам зразумеў: няма звыклых для вушэй гукаў — нейкая дзіўная цішыня. Трэба толькі высветліць, з якога боку няма руху: рэзананс у вялікіх пустых памяшканнях вельмі моцны...

## Частка VI

— Сярго, як ты там? — ціха, з вялікай асцярожнасцю, спытаў ён, выгнуўшыся крыху назад. Не пачуўшы адказу, паўтарыў сваё пытанне крыху гучней. Зноў прыслухаўся: наперадзе, дзе паўзлі па скурніку Святаслаў і яго сябры, чуўся адпаведны шум. Але ззаду чамусьці было зусім ціха. А павярнуцца немагчыма — трэба паўзці наперад. Чамусьці жудасна адразу стала Шацу. Перад яго вачыма стаяла знаёмая з дзяцінства карціна: на аксаміце зялёнай травы беспрытомны

хлопчык з адкінутай галавой, у валасах сена, над імі маці з бледным тварам, на якім застылі жах і невыносны боль... Усе, як наяве. Сямён паматляў галовой — і балюча ўдарыўся аб нізкі звод. Гэта працверазіла яго: няўжо галюцынацыя, пра якую гаварыў камандзір? Не хапала яшчэ і Белую ўбачыць! Шац адчуў, як здрадніцкі халадок папоўз па спіне, напаўняючы сэрца страхам... «Стоп! Ніякай панікі! — скамандаваў сабе, разумеючы, што страх — гэта верная смерць. Тады ён можа ніколі адсюль не вярнуцца. — А дзе ж астатнія? Дзе Сяргей?» Спачатку рвануўся наперад, каб дагнаць сваіх. А потым прыпыніўся, падумаўшы: а што, калі ён памыляецца? Калі з Ярковічам усё добра і той проста адстае?

Разам з тым, як і яго таварышы, Сямён ужо добра адчуў недахоп паветра. «Мабыць, з-за гэтага і бачу такія дзіўныя рэчы», — зноўку падумалася яму. Пот заліваў вочы. Шац поўз усё далей, не зважаючы на боль у зацёкшай спіне. «Толькі б хутчэй дайсці!» — гэтая думка, як метраном, адгукалася ў галаве, стукала, клікала за сабою...

Святаслаў раптам адчуў, як скурнік пайшоў ніжэй — па карце гэта азначала канец доўгаму шляху ў цемры. І раптам, намацаўшы перад сабою замест «падлогі» пустэчу, зразумеў: усё, прыйшлі... Асцярожна падцягнуўшыся за выступ (да «падлогі» было не дастаць нагамі — адлегласць паўметра – метр), Цімковіч перавярнуўся і асцярожна спусціў ногі ўніз. Устаў у поўны рост, салодка пацягнуўся. Вось яна, пячора!..

Ціха, як здань, у праёме паказаўся Раман. Каменьчыкі радасна сыпанулі з-пад яго ног, напоўніўшы прастору таямнічым шэптам. Гэта гаварыла пра тое, што памяшканне, у якім апынуліся сябры, было вялікім па памерах.

...Ізноў ручай з камення. Потым нейкі хруст. У палахлівым святле налобнага ліхтара Святаслава мільгануў твар Сямёна — нейкі хмурны, нават злы, як падалося Цімковічу. Шац слізгануў уніз і, не ўтрымаўшыся на месцы, ледзьве не ўпаў — яго падтрымалі моцныя рукі камандзіра.

— Хлопцы, слухайце, я, можа, і панікёр, — Сямён цяжка дыхаў і ад хвалявання, здавалася, не мог падабраць патрэбных слоў. — Увесь час было добра чутно, як вы рухаліся наперад. Але я раптам зразумеў, што ззаду ад мяне няма ніякага шуму — цішыня. Магільная. Вось, паслухайце самі.

Сябры падышлі да скурніка, прыслухаліся: у тунэлі было зусім ціха. Сяргея не было чуваць.

— Сярго, — ціхенька паклікаў Святаслаў (грамчэй баяўся). — Ты там як, жывы?

Цішыня была яму адказам. Сумненняў амаль не было: штосьці здарылася.

— Сямён, як даўно ты гэта заўважыў? — Цімковіч зірнуў на гадзіннік: скурнік уся каманда пераадолела прыкладна за гадзіну ці нават менш.

— Хвілін з дзесяць таму, — падумаўшы, адказаў Шац.

Святаслаў зноў прыслухаўся, але ў тунэлі было ціха.

Раман рашуча падышоў, падцягнуўся на руках.

— Камандзір, давай я ў разведку! Хуценька!

— Не, хлопец, пачакай, лепш я сам. А вы тут сядзіце, сачыце ўважліва. Калі спатрэбіцца дапамога, пачуеце. Ну, з Богам!

Праз імгненне ён, падцягнуўшыся за выступ, знік у цемры скурніка.

## Частка VII

Сяргей ціха рухаўся за Сямёнам. Каменьчыкі з нейкім хрустам шморгалі пад тулавам, каленямі. Але самым дзіўным яму падаўся напаўкруглы, амаль гладкі звод, які пад пальчаткамі здаваўся не шурпатым «прадуктам» прыроды, а творам чалавечага «мастацтва». Як вядома, вапняк можа прымаць розныя формы ў залежнасці ад умоў утварэння. Таму і пячоры не паходзяць адна на адну — адмыслова народжаныя самой матухнай-прыродай, яны дадуць фору многім знакамітым творам сусветнага «рукатворнага» мастацтва.

«У кожнага з людзей ёсць такі вось тунэль, у канцы якога можна ўбачыць нешта загадкавае, таямнічае, пра што чалавек можа нават і не здагадвацца. Так людзі, што перажылі клінічную смерць, успамінаюць потым і нейкае святло, тунэль, нават сваіх нябожчыкаў-продкаў. Нараджаючыся на свет, чалавек быццам бы нанова праходзіць свой шлях, «забываючыся» на папярэдняе жыццё. Мабыць, «той» тунэль, перад смерцю, — гэта проста ўспамін пра першыя моманты ў жыцці любога з нас; і мозг, які паступова сціхае, пасылае такія сігналы, што дазваляе «пракруціць» чалавечае жыццё наадварот?..» — разважаў Яркові́ч, паступова перасоўваючыся наперад.

Раптам ён насцярожыўся: ззаду нешта скаланулася, пачуўся нейкі грукат. І тут Сяргей, не разабраўшыся ў сітуацыі, зрабіў памылку.

— Сямён! — інстынктыўна крыкнуў ён у цемру наперадзе.

Ярковіч не бачыў, што шчыліна над ім пашырылася. Адзін неасцярожны рух — і спелеолаг можа быць жывым пахаваны ў каменнай магіле. Але Сяргей не мог падняць галаву, каб убачыць, што робіцца наверсе. Ён толькі здагадваўся, што назад праз гэты скурнік вярнуцца ім хутчэй за ўсё немагчыма. Але ў такіх, амаль баявых, умовах чалавек часцей забываецца на ўсе інструкцыі і парады — інстынкт падказваў: трэба хутчэй выбірацца адсюль!

— Сямён, чуеш мяне? — гучна паўтарыў Сяргей.

Болем адазвалася галава: нешта цяжкае абрынулася на яе. Штосьці бліснула раптам перад вачыма. Моцны выбух у іх... Усё згасла...

* * *

Сямён, на шчасце, памыляўся: абвал напаткаў Сяргея ў той момант, калі яму заставалася літаральна некалькі метраў да пячоры. Вопытны Святаслаў зразумеў гэта, як толькі трапіў у тунэль. Дыхаць было няма чым, а пад рукамі трапляліся дробныя і не вельмі кавалкі пароды. Амаль за хвіліну-другую, разграбаю-

чы камяні, рука Святаслава натыкнулася на штосьці мяккае — то была рука Сяргея. Цімковіч разгроб яшчэ трохі і, абвязаўшы вяроўкаю тулава Ярковіча, зашчоўкнуў яе карабінам на поясе сябра, а потым пачаў шлях назад. Другі канец вяроўкі цягнуўся да пячоры, дзе зараз знаходзіліся Раман з Сямёнам, якія яшчэ не ведалі, што назад па гэтым скурніку дарогі няма. Святаслаў тарганууў вяроўку тры разы, каб хлопцы зразумелі: ён вяртаецца. Перад тым як адправіцца назад, зноў намацаў руку Сяргея, праверыў пульс. Узрадаваўся, пачуўшы, як б'ецца танюсенькай ніткай жыццё ў гэтым, здавалася, нежывым целе.

Прайшло, як падалося, шмат часу, пакуль спелеолагам удалося, нарэшце, выцягнуць Сяргея са скурніка. Сябры паклалі яго на імправізаваны ложак. Святаслаў уключыў моцны ліхтар, прыпасены ім для такіх момантаў. Ярковіч ляжаў на спіне. Вочы былі заплюшчаны. Але нават у беспрытомнасці чалавек дыхае, як звычайна, хоць усе астатнія працэсы ў яго замаруджаны. Чалавек жыве. Ён хутка вернецца, абавязкова. Калі няма нічога горшага... Пасля такой «аптымістычнай» думкі пра горшае Цімковічу зараз жа захацелася хоць што-небудзь зрабіць для сябра. Хоць штосьці... А той, як і раней, ляжаў нерухома, і здавалася, што сон, салодкі, жаданы, напаўняў цела гэтага даволі блізкага для яго чалавека. Напэўна, нічога не магло адарваць Святаслава ад сумных думак, але раптам ён пачуў голас Біцюка:

— Сябры, глядзіце, якая прыгажосць!

Цімковіч міжволі адвёў позірк ад Сяргея і глянуў туды, куды даставаў («дабіваў», як гаворыць любы падлетак на сваім слэнгу) ліхтар. А карціна гэтая і сапраўды варта была, каб пераадолець шматлікія перашкоды і ўсё ж сустрэцца з ёю. У промні ліхтара, які танчыў па пячоры ў руках Рамана (той ці то ад хвалявання, ці то ад жадання ўпрыгожыць убачанае «святламузыкай» вадзіў ім з боку ў бок), рознымі колерамі-кветкамі буяла пярэстым кіпенем відовішча, якому пазайздросціў бы любы фантаст. Пацёкі вапняку зверху і знізу ўтварылі за шматлікія стагоддзі дзівосныя слупы-«іголкі» —

сталактыты[1] і сталагміты[2]. Паміж імі расцякаліся дзівосныя бліскучыя каменныя рэкі розных адценняў — быццам незлічоныя багацці пячоры з усходняй казкі адкрыла людзям прырода! Міжволі можна было ў такой сітуацыі паверыць і ў існаванне Гаспадыні Меднай гары, якая паказвае сваю скарбніцу толькі абраным. Нашы сябры адчувалі сябе такімі абраннікамі самой Гаспадыні-прыроды. Святаслаў прыгадаў словы Высоцкага: «Лучше гор могут быть только горы, на которых ещё не бывал...». «Толькі хаця б дзеля такой хвіліны можна рызыкаваць усім — у гарах ты знаходзішся, на самай высокай вяршыні свету, альбо ў самай глыбокай і прыгожай да знямогі, нават вар'яцтва, пячоры — без розніцы. Толькі дзеля такога шчаслівага моманту можна забыцца на ўсё — працу, вольны час. І нават, у некаторых выпадках, на сям'ю», — Святаслаў пастаянна задаваў сабе пытанне, чаму, нягледзячы на дамову з Людмілаю, ён усё ж такі рашыўся на гэты, як яму думалася, апошні паход у горы. З іншага боку, Цімковіч не мог пакінуць сваіх сяброў сам-насам з незнаёмай мясцовасцю (як найбольш вопытны з іх, увесь час адчуваў адказнасць за іх бяспеку).

Сямён думаў пра тое, што ў прыродзе заўсёды існуе раўнавага: нельга дасягнуць у жыцці больш-менш значнай мэты, папярэдне ці потым не заплаціўшы за гэта. Нават знакамітасці, у якіх, на першы погляд, усё цудоўна, вымушаны плаціць за сваю «зорнасць» перш за ўсё сваім здароўем ці здароўем сваіх родных. А яны, «простыя смяротныя», чым адрозніваюцца ад іх? Але, разам з тым, любуючыся незямной прыгажосцю падземнага царства, Шац падумаў: «Адначасова і добра, і дрэнна тое, што з гэтай прыгажосцю ўвачавідкі могуць пазнаёміцца адзінкі — самыя смелыя, настойлівыя, упэўненыя

---

[1] Сталактыт (*ад грэч. stalaktos — які капае*). Вапняковае ўтварэнне, якое ўзнікае на столі і сценах пячор ад прасочвання і выпарэння вады, насычанай кальцыем.

[2] Сталагміт (*ад грэч. stalagma* — кропля). Вапняковае ўтварэнне на дне пячор, якое ўзнікае пры падзенні кропель вады, насычанай кальцыем.

ў сабе і сваіх таварышах людзі. З аднаго боку, сапраўдную прыгажосць можна адчуць, толькі пабываўшы тут, а з другога — чым менш будзе наведвальнікаў, тым больш гарантыя таго, што неруш скарбаў Зямлі нашай захаваецца для многіх пакаленняў людзей».

Раман Біцюк неадрыўна сачыў за слупам святла і імкнуўся трапіць у самыя аддаленыя куточкі пячоры. Але гэта было немагчыма: святло час ад часу «ўпіралася» ў сцяну цемры, густой, важкай, непраглядной. Нейкая дзіцячая радасць ахапіла яго сэрца. Хацелася пайсці да канца, даведацца, што там, у цемры, за ёю — на чацвёртым, самым загадкавым ярусе...

Тут раптам цішыню прарэзаў ціхі стогн. Сумненняў быць не магло: да Сяргея вярнулася прытомнасць. Біцюк адразу накіраваў ліхтар на тое месца, дзе ляжаў зараз яго таварыш.

Сяргей расплюшчыў вочы. Абвёў позіркам сяброў, спачатку не ўцяміўшы, дзе знаходзіцца. Адразу забыўшыся пра навакольную прыгажосць, хлопцы, радасныя, усхваляваныя, падышлі да яго. Безумоўна, гэта была самая лепшая навіна для ўсіх. Адразу ўсе загаманілі, перабіваючы адзін аднаго.

— Як адчуваеш сябе, Сярго? — гэтыя словы Святаслава аддаліся рэхам у яго галаве. Ярковіч паспрабаваў адказаць, але, адчуўшы моцны боль у патыліцы, зноў заплюшчыў вочы.

— Што будзем рабіць, камандзір? — Сямён ірвануў «ліпучку» камбеза і дастаў карту. — Ромка, дай святла!

Біцюг паднёс ліхтар. Падышоў і Святаслаў. Усе схіліліся над картай. Сябрам было ўжо не да дзівосаў прыроды: трэба ратаваць Сяргея і знаходзіць выйсце ў прамым сэнсе. Абвал у скурніку азначаў адно: шлях назад адрэзаны. Неабходна шукаць новы.

Святаслаў узяў ініцыятыву ў свае рукі.

— Так, хлопцы, падводзім папярэднія вынікі. Спачатку плюсы. Мы на месцы. Усе дайшлі, усе жывыя...

Ён паглядзеў на Сяргея, які ў хісткім святле ліхтара нагадваў хутчэй нябожчыка, чым жывога чалавека: выцягнуты, без

крывінкі, стомлены твар з абвостранымі рысамі, заплюшчаныя вочы, раскудлачаныя доўгія валасы.

— Але, — Цімковіч уздыхнуў, — Сяргей паранены, на трасе абвал, назад шляху няма. На плане (узяў у рукі карту) існуе толькі адзін шлях. Але ён ідзе праз скурнік чацвёртага яруса. Што мы можам там сустрэць — адзін Бог ведае. Ад «галюнікаў» да розных пачвар.

Сямён у першы момант хацеў паведаміць пра свае назіранні, але змаўчаў: думаў, што хопіць ужо тых жахаў, пра якія ішла размова раней, каля вогнішча.

— Хаця, — працягваў Цімковіч, — кажуць, што ёсць яшчэ некалькі хадоў — адзін з якіх нават з выхадам наверх. Іншыя думаюць, што гэта байкі. А на карце ў мяне ёсць адзін скурнік. Ён не правераны раней. Але іншага выйсця я не бачу. Паспрабуем прайсці па ім.

Святаслаў з хвіліну памаўчаў.

— З Сярго не пройдзем, — коратка сказаў ён. — Трэба, каб ён застаўся тут. Ненадоўга. Літаральна на некалькі гадзін. Ты як, Сярожа?

Усе павярнуліся да Сяргея. Той на імгненне расплюшчыў вочы. Зразумеў. Але ці пагадзіўся?

— Вось і добра. Але аднаго Сяргея нельга пакідаць, — Цімковіч уважліва паглядзеў на сяброў. — Ты, Сямён, заставайся з ім. Калі што, паспрабуй звязацца па рацыі. Энергію трэба эканоміць, таму святла старайся не паліць. Тут харчы, лекі і кісларод. — Камандзір працягнуў Шацу рукзак. — Хопіць нават на суткі ці болей, калі што...

Ён адвёў позірк убок. Памаўчаў.

— Чакайце. Да сустрэчы, хлопцы.

Святаслаў і Раман па чарзе паціснулі руку Сямёну, а потым абодва прыселі каля Ярковіча. Той зноўку на імгненне расплюшчыў вочы і сустрэўся позіркам з сябрамі. Знайшоў у сабе сілы ўсміхнуцца аднымі вачыма, нібыта гаворачы: «Ідзіце. Нічога. Усё будзе добра».

— Трымайся, хлопец, хутка выцягнем цябе адсюль. Шчасліва! — Святаслаў лёгка паціснуў руку сябру.

— Сярго, ты не сумнявайся — доўга цябе чакаць не давядзецца! — Біцюк як мог падтрымліваў сябра. Але ўсе добра разумелі: як і калі ўсё скончыцца — яшчэ невядома.

Святаслаў і Раман які раз праверылі экіпіроўку, і праз хвіліну святло іх агеньчыкаў знікла за адным са сталактытаў. Сяргей і Сямён засталіся адны ў пячоры.

## Частка VIII

Ліпкая цемра была паўсюль. Са шматлікімі тварамі, якія то выцягваліся, то расцякаліся, гамонячы на ўсе лады, праз усё гэта даволі ясна даносіўся нейкі гул, падобны на рэха або зумер. Ён гудзеў, як трансфарматар, і прарываўся праз гэты бяссувязны калейдаскоп тлуму. Сяргей раптам зразумеў, што гул гэты аддаецца ў яго галаве. Зноў вярнуўся боль, працяглы, тупы. Балелі галава, спіна, абадраныя рукі. «Відавочна, жыццё да мяне вяртаецца, — з горкай іроніяй сказаў сам сабе Ярковіч. Міжволі застагнаў. Сямён пачуў стогн, нахіліўся.

— Можа, вады?

Сяргей паказаў вачыма: «Так». Прахалода палілася па ягоным змучаным целе, і стала крыху лягчэй.

— Ну што, як ты, дружа? — Сямён зрабіў святло ліхтарыка ярчэйшым. — Што ж, выглядаеш нядрэнна.

Ён хацеў падбадзёрыць сябра.

— Сярожа, мабыць, што-небудзь яшчэ, га?

Ярковіч адмоўна павёў вачыма.

— Тады давай паспрабуй паспаць нейкі час: сон — лепшы доктар, — ліхтарык на касцы Шаца згас. — Трэба эканоміць энергію. Невядома, калі хлопцы вернуцца.

Сямён запаліў свечку, і вялікі ліхтар схаваў свае промні да лепшага часу. Ізноў з усіх бакоў навалілася вялізным цяжарам

цемра. Сяргею больш не хацелася правальвацца ў гэты кашмар, з якога ён амаль толькі што выйшаў. І, нягледзячы на боль у галаве, ён любым спосабам хацеў захаваць прытомнасць. Перш за ўсё паспрабаваў сабрацца з думкамі. З усяго, што з ім здарылася, ён амаль не памятаў нічога. Але ўсё ж нешта не давала спакою, трывожыла, нават палохала. І раптам спаленая болем свядомасць яму падказала. Думка такой маланкай уварвалася ў яго мозг, што Сяргей уздрыгнуў. Ён нарэшце ўсё ўспомніў...

* * *

Гэта здарылася, калі сям'я Ярковічаў жыла яшчэ на старой кватэры. У той сонечны летні дзень яны з жонкай і дзецьмі ехалі на юбілей. Старэнькі дзядзечка вёў не новы, узросту прыкладна такога, як сам гаспадар, «мерс» і, мусіць, не маючы магчымасці перакінуцца словам-другім з кім-небудзь іншым, увесь час ладзіў размову з Ярковічамі. Настрой быў сапраўды святочны, і таму яны з лёгкасцю падтрымлівалі размову.

Каля тэлецэнтра на Макаёнка дарогу раптам перабег чорны кот. Сяргей, які не прытрымліваўся розных забабонаў, толькі пажартаваў: «Ну што, паедзем назад ці проста аб'едзем гэтае месца?». Ён сядзеў побач з вадзіцелем на пярэднім сядзенні і, запытаўшыся, паглядзеў на кожнага: ніхто з ім, вядома, не згадзіўся, усе толькі пасмяяліся. На Карбышава (тут цяпер і жыў Ярковіч, а тады яны якраз ехалі ў той бок), перад паваротам налева да ўніверсама «Віцебск» ім трэба было толькі дачакацца адпаведнай стрэлкі на святлафоры. Дзядзечка ж, убачыўшы зялёны агеньчык, напэўна, вырашыў праскочыць — адразу націснуў на газ, не заўважыўшы, што з боку кальцавой насуперак ім імчыцца іншамарка, набітая людзьмі. Сяргей, седзячы побач з гэтым «Шумахерам», усё зразумеў: сутыкнення ім не пазбегнуць. Ён, быццам у запаволеным кіно, ужо бачыў, як у вадзіцеля іншамаркі насупраць ад жаху вочы лезуць на лоб. А можа, гэта яму толькі падалося...

Машына прасвісцела, здаецца, за міліметр ад Сяргея і... вылецела на тратуар. Пачуўся глухі ўдар. У пажылога гаравадзіцеля іх «мерса» трэсліся рукі і цела білі дрыжыкі. Ён ледзьве змог спыніць сваю «тачку» і заглушыць матор. Але ўсе глядзелі не на яго.

Каля іншамаркі на бетонных плітах тратуара, на баку, раскінуўшы рукі і ногі, ляжала маладая дзяўчына. Каля яе ўжо збіраўся натоўп. Сяргей жа быццам прырос да свайго месца, не разумеючы яшчэ, што здарылася. Ён толькі на імгненне змог убачыць яе твар, на якім ужо застыла смерць, і прыгожыя доўгія светлarусыя валасы. І ўсё. У той дзень Сяргей не памятаў, як яны вярнуліся дахаты. Ва ўсім ён прывык вініць перш за ўсё сябе. Балючай занозаю праціяла яго галаву думка: а калі б тады каля тэлецэнтра яны павярнулі назад ці паехалі іншай дарогай, то дзяўчына засталася б жывою? Калі б хоць трошкі, хоць разок паверыць бы ў забабон, якога прытрымліваюцца, напэўна, мільёны людзей! Калі б...

Спачатку Сяргей успрымаў гэтую думку як глупства. А потым ужо, усё часцей і часцей вяртаючыся да яе, зведваў такія эмацыянальныя ўсплёскі, што сам, здаецца, пачынаў верыць у тое, што менавіта ён, не аддаўшы своечасовы загад дзядзьку, не змог пазбегнуць гэтай драмы. Сэрца аблівалася слязамі. Сяргей разумеў, што яшчэ зусім нямнога — і ён стане пацыентам Навінак. Тое «калі б...» доўга яшчэ стукала ў ягонай галаве, аддавала нейкім надакучлівым «рэхам», і ён зразумеў, што цяжар віны, хаця б ускоснай, — хаця Яркoвіч ужо разважаў па-іншаму, — назаўсёды пасяліўся ў яго сэрцы. Гэтая дзяўчына прыходзіла да яго ў снах. Яе твар ён бачыў у шматлікіх жаночых тварах і ўжо думаў, што ціха вар'яцее. А што, калі гэта было нейкае прадказанне, папярэджанне? Але тады ў чым? На ўсе гэтыя пытанні Сяргей адказаць не мог. Ён даўно заблытаўся ў асабістых пачуццях, пастараўшыся пры тым адгарадзіць сваіх блізкіх ад гэтага маральнага цяжару. Але...

* * *

...Сямён задрамаў. Яму хацелася неяк абстрагавацца ад усяго, што здарылася з ім і яго таварышамі, успомніць штонебудзь прыемнае, каб пратрымацца да прыходу сяброў. Далёка не кожны мог бы, седзячы ў поўнай цемры (энергію неабходна было эканоміць), думаць пра штосьці вясёлае ці хаця б проста аптымістычнае. Такое выпрабаванне — сапраўдны экзамен на сталасць і моц чалавечага духу. Толькі ў такой, як кажуць, крайняй сітуацыі па-сапраўднаму праяўляецца асоба чалавека. Сямёну было ўжо не да прыгажосці пячоры, дзе яны знаходзіліся. Хацелася толькі аднаго: вярнуцца жывымі з гэтага паходу. І пажадана як мага хутчэй. А цяпер, успамінаючы Софу і Давіда, Сямён яшчэ больш губляўся: што ён скажа жонцы, як толькі з ёю сустрэнецца? Ён ведаў, што тады трэба будзе рабіць выбар паміж сям'ёю і спелеалогіяй. Але спярша хацелася б выбрацца адгэтуль. А ўжо далей што будзе — тое й будзе... Сямён запаліў ліхтар, паднёс яго да твару Сяргея. Заўважыў, што галава Ярковіча закінутая назад, рот напалову раскрыты. Схіліўся да яго грудзей, паслухаў, ці стукае сэрца і... раптам аслупянеў: пульсу не было, спачатку падалося яму. Але, пераадолеўшы страх і хваляванне, прыслухаўся зноўку. З палёгкай уздыхнуў: ледзьве чутная пульсуючая нітачка звязвала Сяргея са светам жывых... Сямён трохі супакоіўся. Яго хвалявала ў гэтай сітуацыі ўсё: што там з хлопцамі на чацвёртым ярусе, раненне Ярковіча і самае галоўнае — што будзе далей з імі ўсімі? Як выбрацца з гэтай пячоры жывымі? Праз каменную тоўшчу іх ніколі ніхто не пачуе, сігнал праходзіць слаба. А яшчэ гэтая Белая Жанчына, пра якую расказаў Святаслаў. Таксама дрэнная прыкмета перад спускам. Усё гэта і многае іншае непакоіла Шаца. Асабліва яму хацелася, каб Сяргей ачуняў, поўнасцю папраўіўся... Сямён зноўку кінуў позірк на сябра. Той, як і раней, ляжаў на спіне, адкінуўшы назад галаву, — нерухома, як мёртвы.

Раптам Шац адчуў, як яму падалося, адкульсьці подых свежага паветра, быццам бы нехта адчыніў акно ці дзверы. Але

такога не можа быць тут, пад зямлёю! Ці няўжо каменныя глыбы, як у той казцы, расступіліся, адкрыўшы шлях наверх, да сонца? Неверагодна! У Сямёна халодны пот выступіў на спіне. Але гэта было яшчэ не ўсё. Тое, што здарылася потым, Сямён Шац запомніў на ўсё астатняе жыццё...

## Частка IX

Сяргей Ярковіч ляжаў і ўглядаўся ў цемру, якая, здавалася, была расквечана ўсімі колерамі вясёлкі. Такой прыгажосці ён яшчэ ніколі не бачыў. Сяргею нават падалося, што сцены рассунуліся, а сталактыты і сталагміты ўжо не слупы-нацёкі вапняку, а прыгожыя, велічныя калоны з мармуру. І з паўзмроку якраз на яго рухаецца нейкае белае воблака. Ярковіч раптам адчувае, што нейкая незямная асалода ахоплівае ягонае цела, якое таксама робіцца чамусьці лёгкім, амаль бязважкім. І ён працягвае рукі, каб дакрануцца да вытоку той асалоды. Воблака падплывае зусім блізка — і Сяргей бачыць, што гэта не воблака, як яму падалося, а незямной прыгажосці маладая жанчына, сукенка і валасы якой нібы сатканыя з зіхоткага паветра і пераліваюцца золатам і срэбрам. Твар яе падаўся Ярковічу знаёмым, але ён нічога не разумее, спачатку не пазнае яе. Вось жанчына праплывае зусім блізка ад Сяргея і глядзіць яму проста ў вочы. І гэты яе позірк, здаецца, пранікае ў кожную клетачку яго цела, напаўняючы яго нейкай жыццятворнай сілай. І Ярковіч, асліплены яе прыгажосцю, гатовы ляцець за жанчынай, куды тая пажадае; гатовы ўсё зрабіць для яе, што тая загадае; ён закаханы ў яе, да бяспамяцтва, хоча быць яе ценем да другога прышэсця...

А Белая Жанчына паплыла далей, як мройная намітка, залатое сонца ў цемры падземнага царства. «Як дзіўна, — міжволі падумалася Сяргею, — яна, па словах Слаўкі, павінна заўсёды несці смерць, але мне прынесла доўгачаканае пазбаўленне ад

болю, пакут. Мне зараз так хораша, што хочацца спяваць, радавацца і ляцець, ляцець за ёю, куды б яна ні паклікала мяне!..»

Сяргею падалося, што Белая Жанчына і сапраўды кліча яго за сабою. Вось ён паціху ўстае з каменнага ложку і (не адчуваючы ніякага болю!) ідзе, не — ляціць за ёю! Ярковіч ужо не адчувае нічога, нават свайго сэрца. Усё быццам спынілася вакол яго... Няма нічога, акрамя пульсуючага паветра, ніякага цяжару ў галаве і целе... Ёсць толькі Яна і Ён — бязважкі, як пушынка, як лёгкі матылёк...

А наперадзе, сапраўды, нейкае святло, якое расце, вабіць да сябе, як тысяча сонцаў! Любы матылёк, тысячы, мільёны матылькоў з радасцю паляцелі б туды, на гэта святло — незвычайнае, дзіўнае, асляпляльнае...

І Сяргей здаўся...

* * *

Ярковіч расплюшчыў вочы. Ён ляжаў на вялікім камені. Камень-волат знаходзіўся на агромністым узгорку, парослым лесам. Блакітнае неба з ледзь прыкметным рабаціннем аблокаў падалося Сяргею нейкім цудам: дагэтуль ён памятаў толькі цемру і рэдкія плямы святла ад ліхтароў. А зараз, здавалася, увесь свет быў заліты сонечным святлом. «Цікава, які гэта свет — зямны ці «горні»? — як лязо нажа, мільганула думка. Чамусьці яму было ўжо ўсё роўна. І як бывае, калі адкрываеш для сябе нешта не цалкам, а фрагментарна, то ўсё новае, што выпрабоўваеш, успрымаеш, як немаўля, быццам бы ўвогуле першы раз у сваім жыцці. Да Ярковіча данёсся нейкі гул, які потым падзяліўся на некалькі розных галасоў. Паступова Сяргей пазнаў іх — гэта былі галасы яго сяброў, сярод якіх асабліва вылучаўся адзін. Сямёна Шаца.

— ... Дык вось. Шчыра кажу вам — так і было. Пагллядзеў я на Сярго, а ён ужо не ляжыць на посцілцы, а сядзіць. Потым раптам устае...

Пэўна, ад хвалявання Сямён зрабіў паўзу, каб набраць больш паветра.

— ...устае і, значыць, ідзе, выцягнуўшы рукі, быццам бы цягнецца да чагосьці, як у фільмах пра зомбі. Я адразу ж запаліў вялікі ліхтар і ліхтар на касцы. Кірую святло яму проста ў твар, а ён ідзе кудысь, і вочы ў яго заплюшчаныя, а на твары такое, што я да скону не забуду... А потым Сярго пачаў нешта мармытаць... Я пачуў толькі «жанчына», «за табой... лячу...» А далей — не перакласці. Усё ідзе і ідзе. Я — за ім. А Сярго ідзе ў той бок пячоры, дзе на плане глухая сцяна. Ну, думаю, усё... Як ён мог, так цяжка паранены, раптам ўстаць ды яшчэ пайсці на сваіх нагах? Такое ўражанне, што ім хтосьці кіруе, ці што... А далей — самае цікавае, шаолiньскія манахі адпачываюць. Бачу: падышоў ён да гэтай сцяны, працягнуў рукі — і каменная махіна пачала сыпацца, як пясок. А вось чаму — загадка. А за сцяной — не скурнік, а цэлая «галерэя», настолькі шырокая, што можна нават на аўтобусе праехаць...

* * *

...І зноў Сяргей чуе шум, нават рокат. Гэта верталёт, кружляючы над лесам, выбіраў месца для пасадкі.

Сяргей зразумеў усё, і ўпершыню за ўвесь гэты час на ягоным твары з'явілася ўсмешка...

## Частка XX

*Год 2006*

...Запалілася нейкае святло — белае-белае, балюча-белае. Пачулася мернае гудзенне, якое паступова грамчэла. Праз намітку з малюсенечкіх чорных кропачак спачатку нельга было нічога разабраць. Потым у вачах нарэшце пачало праясняцца. Сяргей убачыў белую столь, белыя сцены з дзівоснымі кропкамі-агеньчыкамі: праз слёзы ў вачах ці туман яшчэ цяжка было штосьці адрозніваць. Ярковіч перавёў позірк ніжэй —

і сэрца яго раптам затахтала моцна і натужліва і аддалося рэхам у скронях. Па спіне прабег халадок. Перад Сяргеем сядзела Яна́. Рысы твару яе ён бачыў даволі смутна, але Яе пазнаў адразу — на такое забыцца нельга! Гэта быў яе твар — Белай Жанчыны з усё тым жа німбам светла-залацістых валасоў. Нібы багіня, ці то анёл, яна глядзела на яго і, здаецца, плакала. Позірк яе быў поўны пяшчоты і цеплыні. І — тугі. Бязмежнай, невычэрпнай...

Раптам штосьці цёплае капнула на яго руку, твар — Сяргей гэта добра адчуў. Няўжо багіня можа плакаць?..

— Глядзіце, ён расплюшчыў вочы! Мілы мой, родны, ты жывы, дзякуй Богу! А я ўжо падумала: усё...

Намітка ўрэшце канчаткова спала з ягоных вачэй, і Ярковіч убачыў сваю жонку Ганну, якая сядзела перад ім і выцірала хусцінкаю вочы. А з іх каціліся і каціліся слёзы. Ярковіч паспрабаваў узняць правую руку, і яна паслухалася. Сяргей асцярожна паклаў яе на руку Ганны.

— Сярожа, як ты? Скажы, калі ласка, хоць што-небудзь!

Было зразумела, што яна доўга чакала гэтага моманту і да канца не ведала, выйдзе з беспрытомнасці яе муж або не. Толькі малілася, спадзеючыся на лепшае.

А да Сяргея пачала вяртацца памяць — паступова, урыўкамі. Ён памятаў з таго апошняга вечара няшмат. Паварот на Карбышава (той самы). Потым асляпляльнае святло фар нейкай машыны... Удар... І — Яна́ перад капотам, у бліскучым воблаку, як анёл — ці то смерці, ці то жыцця... Ізноў яна — Белая Жанчына — выратавала яго. Тая самая багіня з да болю знаёмым тварам. Памяць нібыта адрэзала гэты кавалак, пакінуўшы толькі асацыяцыю з чымсьці невядомым, нязведаным. Ярковіч адчуваў сябе вінцікам, нават цацкаю ў немаведама чыёй гульні. За апошнія два гады двойчы апынуцца на амаль смертным ложку. Быццам бы ён у чымсьці вінаваты. Але ў чым яго віна? А мабыць, гэта яго карма, ён нейкі выбраннік для няшчасцяў? Не прайшло і двух гадоў пасля аварыі, што адбылася... Стоп! На тым жа самым месцы! У мінулым годзе ледзь не загінуў у пячорах. А зараз? Адкуль

узяўся той аўтамабіль? Вуліца — Сяргей добра бачыў! — была пустая. Але паўсюль Яна́ — анёл ці кат? Чаму, толькі быццам бы спазнаўшы смерць, ён зноў вяртаецца на грэшную зямлю? Замальваць свае грахі? Якія? Дык хто яна, Белая Жанчына, якая, па словах Святаслава, нясе смерць?

У галаве Ярковіча мільганулі ўспаміны пра Нясвіж, пра Чорную панну, пра альшанскі прывід. Цікава, а ці ёсць паміж імі штосьці агульнае? Вядома ж. Гэтыя прывіды — блукаючыя душы тых, хто памёр не сваёй смерцю...

Галава ад напружання забалела, нібы мозг ірваўся з яе. Сяргей дазволіў сабе расслабіцца. І адразу ж пачуў:

— Ну, як там наш пацыент? Бачу, што прытомнасць вярнулася.

Нейкі халодны прадмет раптам упёрся Сяргею ў вока. Ён заміргаў вачыма.

— Віншую вас, даражэнькая. Самае цяжкае, спадзяюся, пройдзена. А зараз набярыцеся цярпення — нагадваю, што ўсё далейшае ў большасці залежыць ад вас. І не плакаць! Дамовіліся? Так, зрэнкі паглядзелі... Сэрца... У норме. Ціск амаль таксама. Заўтра камп'ютарная тамаграма. І ўсё. Некалькі дзён — і, глядзіш, у агульную палату хутка. А там — абяцяю: будзе яшчэ танчыць.

— Доктар, паслухайце. Сярожа мармытаў у сне пра аварыю, а таксама пра нейкую Белую Жанчыну, прасіў у кагосьці, мабыць, нават у яе, прабачэння.

Сяргей скрозь забыццё чуў напружаны голас жонкі, якая расказвала доктару пра тую, двухгадовай даўніны, аварыю, пра прыгоды ў пячоры.

— ...І ўвесь час ён успамінае гэты прывід. Што з ім? Падкажыце, я болей не магу! Ён, можа, ужо звар'яцеў — столькі пераждыць?!

Ганна закрыла твар рукамі, і плечы яе задрыжалі.

— Я магу вам зараз сказаць толькі адно, даражэнькая. Што робіцца ў яго снах — гэта загадка, якая звязана са шматлікімі перажываннямі падчас усіх паходаў і здарэнняў. А вось быццам

бы наяве ён бачыць не яе, гэтую, як вы называеце яе — Белую Жанчыну, — а самога сябе, увасобленае пачуццё віны за тое здарэнне два гады таму. Сяргей Уладзіміравіч, па вашых словах, хоць і невінаваты, але ніяк не можа пазбавіцца гэтага ўспаміну, таму што ў нейкай меры лічыць вінаватым ва ўсёй гісторыі менавіта сябе. Гэта застарэлы комплекс і ўжо не проста стрэс, а прымушальны стан. Яшчэ трошкі — усё гэта перарасце ў хваробу, справіцца з якой будзе надзвычай цяжка. Трэба ратаваць вашага мужа. Гэты жаночы вобраз, на маю думку, — не проста нейкае прароцтва (успомніце экспедыцыю), а псіхалагічны буфер паміж нармальным станам і вар'яцтвам, як своеасаблівы абаронца чалавечай псіхікі. Гэта — з пункту гледжання медыцыны, а ўсё астатняе — па-за яе межамі. І, выбачайце, ужо не ў маёй кампетэнцыі. Здараецца, хаця і рэдка, тое, што прыносіць няшчасце і нават смерць, можа стаць і паратункам. І самы яскравы прыклад — гэта ваш муж, даражэнькая... Ну, што... Мне трэба ісці. Мужнасці вам, усяго найлепшага. Зайду праз гадзіну...

Голас доктара сціх. Стукнулі дзверы.

## Эпілог

На Радуніцу было цёпла. Прысады на Паўночных могілках запоўнены народам. Зрэдку па іх праязджалі аўтамабілі. Сям'я Ярковічаў, як і ўсе мінчане, таксама была тут: на розных участках родныя магілы, а іх неабходна было даглядаць. Пакуль Ганна даставала з пакетаў расаду, Сяргей узяўся прынесці вады — паліць кветкі. Узяў з сабою невялікае вядзерца і накіраваўся да крана каля самай сцяны могілак. Але вада сцякала танюсенькім струменьчыкам, а людзей у чарзе было чалавек дваццаць, і Сяргей вырашыў пайсці на суседні ўчастак...

«Галоўнае, — думаў Сяргей, — не дастатак, а памяць. Чалавек працягвае жыць і пасля смерці, калі памяць аб ім жыве

ў сэрцах тых, хто прыйдзе на гэты свет пасля яго. На жаль, ён нічога пра гэта даведацца ўжо ніколі не зможа. Увогуле, пакінуць добры след у жыцці тых, хто акружае цябе, — і ёсць мэта знаходжання кожнага з нас на грэшнай, але бясконца прыгожай зямлі...»

Запрыкмеціўшы мармуровую лавачку каля вялікага прыгожага помніка ў выглядзе бутона кветкі, вырашыў прысесці адпачыць хвіліну-другую. Ярковіч толькі нядаўна выйшаў з бальніцы, і балячкі пакуль яшчэ час ад часу нагадвалі пра сябе. Прысеў, з палёгкай уздыхнуў. Падняў вочы на здымак у сярэдзіне мармуровага бутона і... аслупянеў: на Сяргея з фотаздымка глядзела Яна́ — Белая Жанчына! Той жа прыгожы лоб, цёмныя вочы з нейкім дзіўным бляскам, трохі прыпухлыя губы ў ледзь прыкметнай мілай усмешцы і німб прыгожых светла-ружовых валасоў. Сяргей нарэшце пазнаў яе. Усё праўда. Вось чаму яе твар падаўся яму знаёмым. Пад прозвішчам і імем быў надпіс «трагічна загінула» і стаяла дата — той самай аварыі насупраць аўтобуснай станцыі на Карбышава... Якраз два гады таму...

Сяргея нібы штосьці падкасіла — так балюча ўдарыла яго цэлая хваля ўспамінаў, дастаткова падрабязных. Але... твару яе ён ніяк успомніць не мог. І вось толькі зараз падсвядомасць аказалася добрай падказчыцай — гэта была Яна́...

Сяргей раптам споўз на зямлю і нізка схіліўся перад помнікам. Здарылася тое, чаго Ярковіч так баяўся калісьці: сустрэцца з ёю вочы ў вочы. Хаця б і тут, зараз... Сяргей заплюшчыў вочы, закрыў твар рукамі, быццам засланіўся ад усяго свету. Ён зноў бачыў яе — маленькую постаць на тратуары — дзяўчыны, якой ужо нельга было дапамагчы. Плечы яго затрэсліся...

І раптоўна чыясьці рука лягла Ярковічу на плячо.

— Вось і вы прыйшлі да маёй Танечкі. Але ёй ужо нельга дапамагчы. Нікому і ніколі...

Сяргей азірнуўся. Каля яго стаяла жанчына ў чорнай хусцінцы з амаль такімі ж рысамі твару, як на фотаздымку.

У яе быў прыгожы цёплы грудны голас. Яна ўважліва паглядзела яму ў твар — у Ярковіча аж дрыжыкі пайшлі па ўсім целе.

— А я вас добра памятаю. Вы былі на судзе. Памятаю і вашы словы, калі абвінавацілі ва ўсім сябе. Я запомніла ўсё. Не vініце сябе — вы ні ў чым не вінаваты. Я ведаю. Я маці... Сэрца маё ведае... Так, выходзіць, ёй было наканавана лёсам...

Яна адвярнулася.

Сяргей узяў яе руку ў свае, усё яшчэ не ўстаючы з зямлі. Жанчына павярнулася, паглядзела яму ў вочы.

— Як вас завуць? Сяргей?

Жанчына ўзняла галаву, паглядзела на неба, па якім плылі белыя аблокі — чыстыя-чыстыя, як нявінныя душы тых, хто пайшоў з жыцця, не дачакаўшыся свайго часу...

* * *

Сяргей Ярковіч ішоў па прысадах да выхаду з могілак. Побач з ім ішла Ганна з дзецьмі. Гледзячы на іх, ён некалькі разоў нават усміхнуўся. Яны заўсёды будуць разам. Назаўжды. Што б ні здарылася...

Прайшоўшы цэнтральную арку, яны нарэшце мінулі вароты. На прастор. Да жыцця. Сяргею зараз хацелася проста жыць...

*26.07.2008 г.*

# ДЖЭК

## Частка I

Быў канец лета, калі жнівеньская вясёлая пара паступова змянялася надыходзячай восеньскай сур'ёзнасцю; калі на лісці бяроз праступала першая жаўцізна, а асіны патроху ахоплівала барвістае полымя; калі птушыныя караваны ўжо цягнуліся на поўдзень, пакідаючы на радзіме лёгкую тугу і нейкае расчараванне: птушкам, як і людзям, чамусьці заўсёды здаецца, што лета будзе бясконцым, — як і само жыццё...

Пост ДАІ знаходзіўся за кіламетр ад Мінска, ля кальцавой. Заступіўшы на дзяжурства яшчэ апоўначы, супрацоўнік ДПС сустракаў новы дзень вельмі стомленым. Ён штохвілінна пазяхаў, пазіраў на гадзіннік, які паказваў сем. Змена хутка заканчвалася. Падняўшыся на пост, старшы лейтэнант зняў фуражку, спаласнуў стомлены твар вадою, выцер яго насоўкаю і зірнуў у невялікае люстэрка, прымацаванае над шклом. На яго глядзеў мужчына сярэдніх год — з невялікай залысінай галава, твар крыху круглаваты, з даволі поўнымі шчокамі; падбародак валявы, з ямачкай, якая звычайна падабаецца жанчынам. Позірк светла-шэрых вачэй адлюстроўваў, здавалася, неблагі жыццёвы вопыт, што назапашвае чалавек да гэтага ўзросту. Словам, Уладзімір Іванавіч Гулевіч, старшы лейтэнант міліцыі, заканчваў чарговае дзяжурства.

На пульце раптам заміргала сігнальная лямпачка. Інспектар падняў трубку, далажыў па форме дзяжурнаму па Мінску маёру Кудраўцу, што ўсё нармальна, змена прайшла без здарэнняў і што ён гатовы перадаць вахту наступнаму паставому.

Машын амаль не было. Інспектар любіў слухаць звон цішыні, настолькі пранізліва-льдзістым, што, здавалася, паруш

яе — і яна, як люстэрка, разаб'ецца на мноства драбнюткіх звонкіх асколачкаў.

Раптам цішыню прарэзаў нейкі гул, які хутка мацнеў, шырыўся, запаўняў сабою ўсю прастору. Неўзабаве на шашы паказалася аўто: у бок Мінска нёсся стары сіні «форд», які выглядаў так, быццам пабываў у баях ці гонках на выбыванне, прычым выбыў з іх, напэўна, апошнім, калі нічога цэлага на ім не засталося. Мабыць, шмат разоў перафарбаваны, аўтамабіль даўно страціў першапачатковы выгляд. Левая фара нагадвала падбітае чалавечае вока. Павуціна разыходзілася на увесь правы бок лабавога шкла. Усё гэта інспектар заўважыў, ледзь толькі машына наблізілася да паста.

Як уладальнік гэтага «багацця» прайшоў тэхагляд, заставалася загадкай, якую старшаму лейтэнанту Гулевічу неабходна было абавязкова разгадаць. І ён, узяўшы мікрафон, гучна загадаў:

— Вадзіцель сіняга «форда», загадваю спыніцца! Вадзіцель сіняга «форда», загадваю спыніцца!

Кінуўшы позірк на радар, зразумеў: машына імчалася па шашы з завышанай хуткасцю — за сотню кіламетраў у гадзіну! Нічога сабе! І гэта каля кальцавой, за якой пачынаецца Мінск!

Яшчэ некалькі разоў паўтарыў загад. Безвынікова. Што за нахабства? Нават каля міліцэйскага паста не зніжае хуткасці!

Інспектар сеў за руль сваёй міліцэйскай «шасцёркі», і праз хвіліну машына з «мігалкай» імчалася ўслед за парушальнікам. Вадзіцель «форда» адразу пачуў выццё сірэны. Адначасова віск тармазоў абвясціў пра тое, што «ліхач» гатовы сустрэцца з інспектарам.

Гулевіч падышоў, назваў сябе, ускінуўшы руку да фуражкі. Дзверы машыны расчыніліся, і перад інспектарам з'явіўся «ліхач» — немалады ўжо чалавек, гадоў пяцідзесяці, з сівізной на скронях і, як падалося Уладзіміру Іванавічу, з нейкай тугой у пачырванелых вачах. Вакол іх — цёмныя плямы, ад чаго позірк незнаёмага таксама здаваўся пацямнелым, нават змрочным. «Як нейкая пячатка гора на твары», — падумалася

інспектару. Было ўражанне, што гэты чалавек плакаў. Апрануты ён быў у шырокія цёмныя штаны, лёгкі шэры пуловер, з-пад якога быў відаць расшпілены каўнер белай кашулі. На нагах чорныя боты, на галаве зялёны капялюш, які можна было ўбачыць у магазіне для паляўнічых. «Толькі пяра фазана не хапае», — падумалася інспектару.

— З палявання ляціце, шаноўны? Ці якраз на паляванне, у Мінск? — Гулевічу хацелася паказаць «кузькіну маці» гэтаму гора-аўтамабілісту або гора-паляўнічаму — хто яго ведае? Хацелася так правучыць яго, каб... Але ён прадстаўнік закона, не мае права, і нават без сведак, сам-насам.

— Чаму лячу? — вінавата ўсміхнуўшыся аднымі вуснамі, але з нейкай горыччу ў голасе, адказаў пытаннем на пытанне мужчына.

— А на спідометр вы глядзіце хоць калі-небудзь? — зноў з сарказмам спытаў Гулевіч.

— Ну вядома ж, — баязліва адказаў незнаёмец.

— Дык вось, хуткасць у вас за сто зашкальвае, — заўважыў інспектар. — Нават каля міліцэйскага паста. А гэта як мне разумець? Вы не ведаеце, што трэба зніжаць хуткасць, калі пад'язджаеце да населенага пункта?

— Выбачайце, калі ласка, інспектар. Такое са мною ўпершыню. Я ж ужо амаль трыццаць год за баранкай. Прафесіянал. Ніколі не парушаў. Вось, паглядзіце, — «ліхач» выйшаў з машыны, працягнуў Гулевічу дакументы.

Старшы лейтэнант узяў правы, тэхпашпарт. Пры гэтым ён заўважыў, што рукі незнаёмца дрыжаць.

— Так, паглядзім. Война Васіль Сцяпанавіч, — прачытаў ён, уважліва ўгледзеўся ў фотаздымак, потым перавёў позірк на мужчыну.

З фатаграфіі на яго глядзеў маладжавы чарнявы мужчына з акуратнай прычоскай, чорнымі вусамі «пад Мулявіна», прамым носам з невялікай гарбінкай. А зараз перад Гулевічам стаяў амаль пажылы чалавек. Жыццёвая стома і нейкая разгубленасць, відаць, даўно пасяліліся ў ягоных калісьці цёмных,

а зараз быццам выцвілых вачах і такіх жа цёмных прыпухлых кругах пад імі. Гэтая ж стома ляжала снегам на валасах і вечным цяжарам на сутулых плячах. Войціку зараз можна было даць гадоў семдзесят, хаця на самой справе, паводле вадзіцельскіх правоў, яму нядаўна споўнілася толькі пяцьдзясят два.

— А што ў вас з аўтамабілем? — пацікавіўся інспектар. — Калі праходзілі тэхагляд?

Гулевіч зірнуў на талон на лабавым шкле і сам жа адказаў:

— Амаль два гады таму праходзілі. А што са шклом і фараю, Васіль Сцяпанавіч?

Войцік, здавалася, збіраўся з думкамі. Адказаў не адразу.

— Шкло пабіў з месяц таму. Няма пакуль грошай на новае. Абяцаю, што хутка замяню.

— А фара? — зноў запытаў інспектар. — Няўжо самі дзенебудзь у гаражы, калі выязджалі, а? Мне калісьці адзін разумнік так і растлумачыў. Хаця гэта няважна. Усё роўна трэба будзе заплаціць штраф за неахайны выгляд аўтамабіля, а таксама за перавышэнне хуткасці.

Штосьці насцярожвала Гулевіча з самага пачатку, але той ніяк не мог зразумець што. Нейкае шостае пачуццё гаварыла яму, што з Войцікам нешта не тое. І раптам ён зразумеў: нервуецца. Калі падаваў дакументы, рукі хадуном хадзілі. «А мабыць, проста «алканаўт»? — хацеў супакоіць сябе Гулевіч. — Не можа быць. Мае паляўнічы білет, напэўна, стрэльбу, — а на гэта дазвол алкаголікам не даюць».

— Выпіваеце? — спытаў інспектар Войціка і ўважліва паглядзеў яму ў вочы.

— Як і ўсе, толькі на свята якое, — не задумваючыся, адказаў той.

«Праўду кажа, — адзначыў Гулевіч. — А чаму ж тады так нервуецца?»

І раптам новая думка амаль асляпіла інспектара: Войцік гаворыць, што едзе з палявання. Прычым, вяртаючыся дадому, ляцеў як на пажар. «А дзе ж твая здабыча, шаноўны паляўнічы? Мабыць, там, у лесе кагосьці падстрэліў і не прызнаецца, а да-

кумента адпаведнага няма? Значыць, ты яшчэ і браканьер? Трэба ўсё праверыць».

— Дык вы з палявання вяртаецеся, Васіль Сцяпанавіч? — асцярожна спытаў Гулевіч.

Той, згаджаючыся, кіўнуў галавою.

— А зброя дзе?

— У багажніку.

— Пакажыце. А таксама дакументы на яе і дазвол на паляванне разам з паляўнічым білетам.

Войцік падышоў да багажніка, Гулевіч — за ім. Зірнуўшы ў цемру адсека, інспектар зразумеў, што ён на правільным шляху: акрамя стрэльбы ў чахле ды «запаскі», у багажніку нічога больш не было. Падазронасць Уладзіміра Іванавіча яшчэ больш узмацнілася, калі ён сцягнуў чахол, узяў стрэльбу, «разламаў» яе надвое і зірнуў у ствол на прасвет. Потым яшчэ і панюхаў. «Вось дык змена сёння, ёлкі-палкі! Яшчэ, глядзі ты, пашчасціла мне, напэўна, забойцу затрымаць! Не браканьер гэта, адразу відаць». А ўслых сказаў:

— Дык, кажаце, з палявання едзеце? А дзе ж гэта вашы трафеі, Васіль Сцяпанавіч? У лесе засталіся?

«Можа, вядома, сказаць, што страляў, але прамахнуўся. А на самой справе? Нават цікава! — інспектар уважліва зірнуў на дакументы Войціка. — Ого! Кандыдат у майстры спорта. Такія рэдка прамахваюцца».

— Спартсмен?

— Нават чэмпіёнам рэспублікі калісьці быў.

— Які від спорта?

— Стэндавая стральба.

Гулевіч нават прысвіснуў.

— Дык дзе ж вашы трафеі, грамадзянін Войцік?

Той адвёў позірк убок.

— На жаль, не было па кім страляць. Нічога не трапілася.

«Не навучыўся хлусіць. Гэта і лепш — папаўся ты, чалавеча», — заключыў Уладзімір Іванавіч.

— Вы ж вопытны стралок, паляўнічы. Дык навошта хочаце мяне падмануць? Думаеце, не зразумеў, што з вашага ружжа стралялі? Нагар свежы, ды і пах адпаведны.

Войцік адразу панік. У інспектара паступова складвалася ўражанне: гэтаму «стралку» было ўсё роўна, што чакае яго.

«У іншай сітуацыі, напэўна, змог бы выкруціцца. А тут, вельмі нервуючыся, не звярнуў увагі на тое, што па стрэльбе можна было заўважыць, карысталіся ёй ці не. Напэўна, нешта вельмі турбуе яго. Ці проста здарылася што. У любым выпадку я зрабіў нават больш, чым патрабавалася. Неабходна здаць гэтага Войціка куды трэба — няхай там з ім разбіраюцца!» — падвёў вынікі свайго даследавання інспектар Гулевіч.

З боку Мінска паказаліся міліцэйскія «Жыгулі».

— Ну вось, едзе мая змена. Зараз вас, грамадзянін Войцік, адвязуць у аддзяленне. Там усё і расскажаце, — рашуча сказаў інспектар.

— Вы мяне затрымліваеце? За што? Што я такое зрабіў? Штраф заплачу, абавязкова. Выпісвайце квітанцыю! А на зброю я маю ўсе дакументы! — у Войціка раптам прарэзаўся голас.

Пачуўшы маналог «ліхача», Гулевіч лішні раз пераканаўся, што Войціка адпускаць нельга. Нешта падказвала інспектару, што гэты «Шумахер» расказаў не ўсё.

У Войціка раптам задрыжалі рукі, ён нават не ведаў, куды падзець іх. Ён падышоў да сваёй машыны, сеў на вадзіцельскае месца, не зачыніўшы дзвярэй, паклаў рукі на руль і ўтаропіў свой позірк кудысьці ўдалеч. Уцякаць не спрабаваў, так і прасядзеў да прыбыцця міліцыі.

* * *

Здавалася, што яго быццам ніхто не затрымліваў. На ягоных руках не было наручнікаў. Войцік проста перасеў у міліцэйскія «Жыгулі», і яны памчаліся ў Мінск. За імі на сінім «фордзе» ехаў сяржант-паставы.

У машыне, акрамя Войціка і вадзіцеля-сяржанта, сядзеў ужо знаёмы нам старшы інспектар Гулевіч і разам з ім, па правы бок ад затрыманага, капітан міліцыі ў форме, як потым высветлілася, намеснік начальніка таго аддзялення, куды везлі цяпер «Шумахера». Міліцыянеры час ад часу ціха перагаворваліся.

— Слухай, Іванавіч, — гаварыў капітан. — І чаму, скажы, табе так шанцуе? Канец дзяжурства — і на́ табе, такі «фрукт»! Не хапала нам яшчэ агнястрэлу!

— Ну не кажы, Пятро Фёдаравіч! — стомлена сказаў Гулевіч. — Вядома ж, хочацца ўжо дадому, але...

Уладзімір Іванавіч падняў фуражку, выцер успацелы лоб.

— Лічу, усё ж неабходна высветліць, што з чалавекам, — пакасіўся на затрыманага. Мы ж нічога не ведаем. Ён маўчыць ужо з паўгадзіны. Як вады ў рот набраў.

— Нічога, Іванавіч, — адказаў капітан, — вось і прыехалі. Тут разбяруцца.

Машына спынілася ля ганка трохпавярховага шэрага будынка з чырвонай дошкай над уваходам.

Неба зацягнулі хмары. Церусіў дождждык, і шэры будынак аддзялення міліцыі быццам бы зліваўся з шэранню жнівеньскага ранку. Капітан працягнуў руку Гулевічу:

— Усё, Іванавіч, дзякуй. Давай толькі напішы рапарт у дзяжурцы і дадому, адпачываць. Далей ужо мой клопат.

Пятро Фёдаравіч звярнуўся да Войціка:

— Выходзьце!

* * *

Прайшоўшы некалькі калідораў і падняўшыся на другі паверх, капітан з Войцікам апынуліся ў невялікім кабінеце з сейфам ў куце, шафай ля ўвахода і сталом, які перагароджваў памяшканне надвое.

Тут толькі Войцік звярнуў увагу на капітана. Гэта быў амаль яго аднагодак. Коратка астрыжаны, шыракаплечы, з высокім

прамым ілбом, глыбока пасаджанымі шэрымі вачыма, гарбаносы, капітан Пятро Фёдаравіч Корань быў вельмі ўпартым у жыцці чалавекам, меў цвёрдую асабістую пазіцыю ва ўсім: і ў сямейных справах, і ў службовых. Мог сказаць чалавеку ў вочы тое, што думае, а гэта далёка не ўсім падабаецца. Пра такіх звачайна з павагаю кажуць «сапраўдны крэмень». І праўда, калі Пятро Фёдаравіч ставіў перад сабою задачу, то абавязкова дабіваўся свайго. Таму ўсе падначаленыя называлі яго «наш Корань», або, калі, бывала, крыўдавалі на яго, — «Козьма Пруткоў».

Калісьці, на адной нарадзе, калі падводзілі вынікі за паўгоддзе па раскрывальнасці злачынстваў у раёне, Корань перад усімі прысутнымі (а было чалавек трыццаць), адказваючы на чыёсьці пытанне, у запале выдаў такі маналог: «Каб вырашыць праблему, неабходна добра бачыць яе падаплёку, — і працытаваў: — Нездарма Козьма Пруткоў сказаў: "Зри в корень..." Вось пасля той палымянай прамовы капітан і атрымаў адпаведнае прозвішча-мянушку. Быў ён даволі прынцыповым, нават жорсткім, а галоўнае, справядлівым: у кожным, з кім зводзіў лёс, добрасумленным або злачынцу, бачыў перш за ўсё чалавека — асобу адметную, непаўторную. Яго паважалі ўсе: і таварышы па працы, і, як у нас кажуць, «прадстаўнікі крымінальнага свету». А зараз перад капітанам сядзеў чалавек, якога можна было падазраваць у некалькіх адміністратыўных парушэннях закона або нават у цяжкім злачынстве. А калі гэта памылка і чалавек не вінаваты ні ў чым?

Стол у кабінеце быў паміж імі своеасаблівым бар'ерам: з аднаго боку — прадстаўнік закона, а з другога — той, хто парушыў закон або падазраваўся ў гэтым.

Перш чым пачаць размову, Корань уважліва паглядзеў затрыманаму ў вочы. Глядзеў доўга. Адразу адчуў, што яго субяседнік чагосьці баіцца: вочы бегаюць, не ведае, куды рукі падзець. Выцягнуўшы з кішэні пачак цыгарэт, капітан прапанаваў Войціку:

— Бярыце.

Той дрыжачымі рукамі ўзяў адну. Запалкі не слухаліся яго. Толькі з трэцяй Войцік закурыў. Зацягнуўся, выпусціў дым, і нейкае падабенства задавальнення, няхай і часовага, з'явілася на ягоным твары. Раптам кашаль вырваўся з яго грудзей. Войцік затушыў цыгарэту ў попельніцы. І зноў нервова. Заўважыўшы, як капітан прыглядаецца да яго рук, Войцік схаваў іх пад стол.

— Даўно курыце?

— Шчыра кажучы, ўжо дванаццаць год не курыў.

Капітан кіўнуў:

— Я бачу. Дарэчы, вы кожны раз з такой хуткасцю ездзіце... — Корань зірнуў на дакументы затрыманага. — ...Васіль Сцяпанавіч?

— Я... не... толькі сёння... Паверце...

Было відаць, што Войцік вельмі разгублены.

— Скажыце, а вы заўсёды ездзіце на паляванне ўначы, а вяртаецеся а сёмай гадзіне раніцы?

— Я...

— А па кім вы стралялі ноччу, хаця ніякай здабычы пры вас няма? У паветра палілі? З кім вы былі на паляванні? Мабыць, вашы трафеі ў іх?

Раптам вочы Войціка напоўніліся слязьмі. Нервы яго не вытрымалі. Ён закрыў твар рукамі. Плечы затрэсліся.

— Джэк... — пачуў капітан. — Мой Джэк... Я страляў у Джэка, — ледзьве чутна вымавіў Войцік.

## Частка II

Яркае вясенняе сонца рэзала вочы. Дом на ўзгорку, і таму з вышыні восьмага паверха Мінск бачны як на далоні. Аднолькавыя шэрыя панэльныя шматпаверхавікі ды некалькі вялізных заводскіх труб на гарызонце — вось і увесь пейзаж. Андрэй уздыхнуў. Больш пашанцавала тым, чые вокны выходзяць на другі бок іх панэльнага гмаху. Там цягнецца бліскучая

сярэбраная стужка вадасховішча, па беразе якога яны ўсёй сям'ёй так любяць прагуляцца ўвечары, асабліва летам, калі спякота спадае, а па вадзе паважна плывуць дзікія качкі. Для іх Войцікі заўсёды бяруць з сабою хлеб. Некалькі разоў тут бачылі нават лебедзяў.

У свае чатырнаццаць год Андрэй Войцік, здавалася, меў усё: тата са спаборніцтваў прывозіў шмат сувеніраў, у тым ліку машынак, якіх не было ў аднакласнікаў. На мінулы дзень нараджэння Андрэй атрымаў доўгачаканы падарунак — касетны магнітафон. Японскі. Яго тата прывёз з Германіі. Раеснікі Андрэя карысталіся або дабітай «савецкай» тэхнікай, або таннымі тайваньска-кітайскімі падробкамі «пад Японію». Яго «Панасонік» адрозніваўся перш за ўсё якасцю гучання, што вельмі падабалася Войціку, а таксама тым, што сапраўдныя «японцы» не ламаліся так, як іх кітайскія «сябры». Такая тэхніка спраўна магла служыць дзесяць і нават пятнаццаць гадоў.

У спартыўнай школе Андрэй Войцік займаўся дзюдо ўжо сем гадоў, меў першы дарослы разрад. Тата колькі разоў гаварыў яму: «І навошта табе, сын, гэтае дзюдо? Ідзі лепш да мяне — на стэндавую стральбу. У мяне аўтарытэт, столькі знаёмых — зробім з цябе чэмпіёна.» І хоць у яго школе кожны ведаў, што Андрэй — сын чэмпіёна рэспублікі Васіля Войціка, але Войцік-малодшы цвёрда стаяў на сваім: «Буду дзюдаістам». Яму, сапраўды, зусім не падабалася доўгае чаканне на адным месцы, прыцэльванне. Андрэй любіў рух, дынаміку, прыёмы. Віктар Тарасавіч, трэнер, часта хваліў яго. І не толькі таму, што добра ведаў Войціка-старэйшага, але і таму, што бачыў у сваім выхаванцу спартсмена, асобу, прычым такую, якая зможа дасягнуць пэўных вынікаў. Пасля чарговых спаборніцтваў бацька такі адчапіўся ад сына. «Твой ВТ сказаў, што з цябе можа атрымацца неблагі спартсмен — у наступным сезоне на рэспубліку паедзеш», — змоўніцкім тонам тады паведаміў яму Войцік-старэйшы.

Андрэй і яго таварышы па спартыўнай школе звычайна паміж сабою называлі свайго трэнера ВТ або па імені. Таму

што калі скласці першыя склады яго імя і імя па бацьку — «Вік» і «Тар», — усё роўна атрымлівалася слова «Віктар». Праўда, Ягор Ляшкевіч, сябар Андрэя, прапанаваў называць трэнера «торы», што з японскай мовы перакладаецца як «нападаючы». Але гэта неяк не прыжылося. Увосень пачнуцца рэспубліканскія спаборніцтвы, і тады, ведаў Андрэй, ёсць шанс атрымаць наступны разрад і новы пояс. За сваімі думкамі Андрэй забыўся, чаго зайшоў сюды.

— Андруша, — пачуўся голас маці. — Ты там не заснуў часам? Нясі агуркі!

— Ой, і праўда! — раптам успомніў Андрэй.

Узяўшы з паліцы слоік, хлопец вярнуўся ў пакой.

Пасярод залы стаяў вялікі, накрыты святочным абрусам стол. Сёння вырашылі нікога не запрашаць, а абмежавацца сямейным колам — святкавалі чатырнаццацігоддзе Андрэя. Дата не круглая, ды і імяніннік яшчэ не сталы.

— Андрэй, дапамажы хлеб парэзаць! — у залу заляцела, нібы ў вальсе, Лана, старэйшая сястра. У белай блузцы, джынсах, якія падкрэслівалі статную дзявочую постаць, яна здавалася сапраўднай прыгажуняй. Лана якраз нядаўна адсвяткавала паўналецце і лічыла сябе ўжо дарослай. Уся ў маці — разумная, шчырая, але ўпартая. Можа такое ў вочы сказануць, што толькі трымайся! Таму яе паважалі і нават пабойваліся. Андрэй, хоць, бывала, і сварыўся з сястрою, як здараецца ў любой сям'і, але прывык прыслухоўвацца да Ланы. Поўнае імя яе было Святлана. Але яшчэ даўно, як толькі пачынала гаварыць, не магла цалкам паўтарыць яго. Спачатку гучала цікава і весела. А потым прыжылося...

Андрэй заляцеў на кухню, дзе завіхалася маці.

— Нешта наш імяніннік сёння зажурыўся — не дазвацца! — пажартавала маці і ласкава зірнула на сына. — А мо марыць пра што?

Гаварылі, што ў маладосці Таццяна Яўгенаўна Война была падобная да Марыны Уладзі, жонкі Высоцкага. Вось і цяпер, убачыўшы матулю і пачуўшы яе прыгожы голас, Андрэй

падумаў пра гэта падабенства. Чорна-белы фільм «Вядзьмарка» па Купрыну з Уладзі ў галоўнай ролі ён бачыў шмат разоў — у сям'і любілі класіку, і асабліва гэтую карціну.

Андрэй не адказаў матулі, толькі ўсміхнуўся.

— Ланачка! — паклікала маці дачку. — Ты тату не тэлефанавала? Калі ён будзе?

— Зараз пазваню, — адказала Лана.

Яна стаяла каля люстра і прыхарошвалася. Светлыя доўгія валасы залатымі хвалямі струменіліся па плячах, а ясныя вочы, здавалася, увабралі ў сябе ўсю непаўторную прыгажосць васількавага лугу, блакітных азёр і чысцюткага бясхмарнага неба, вечна юнага, як сама Зямля...

* * *

Пранізлівы званок у дзверы, напэўна, напужаў усіх. Ён азваўся грукатам на кухні: маці не ўтрымала нешта ў руках. Лана азірнулася, трымаючы памаду. Андрэй выйшаў у вітальню. За ім — Таццяна Яўгенаўна.

На парозе стаяў Васіль Сцяпанавіч Войцік — бацька гэтага дружнага сямейства. Як доўга ні чакалі яго, з'яўленне адбылося эфектным. Тым больш што ў руцэ ён трымаў нешта падобнае да клеткі, але з пластмасы — памерам з добры чамадан. У другой трымаў насоўку, якой выціраў пот з ілба.

— Прабачце, мае даражэнькія! Ездзіў да твайго ВТ, — кіўнуў сыну, — па падарунак. Замовіў яшчэ вясною. А ён малайчына, твой Віктар Тарасавіч, дастаў усё ж такі! — скорагаворкаю выпаліў Войцік гэтыя словы. І раптам успомніў, што не павіншаваў сына. — Ой, сын, прабач... Андруша, я віншую цябе з днём нараджэння. Жадаю, каб усе твае мары абавязкова здзяйсняліся. А адна з іх, спадзяюся, збудзецца й зараз. Зразумеў, пра што гавару?

У Андрэя перахапіла дух. Няўжо пра сабаку? Калісьці бацька катэгарычна не згаджаўся трымаць у доме каго-небудзь з братоў меншых. «Вось падрасцеш — і тады атрымаеш

сабе сябра, калі зможаш даглядаць яго», — гаварыў ён. Вось і прыйшоў час...

— Трымай, — скончыў нарэшце бацька, перадаючы сыну пластмасавы «чамадан».

Усе прыселі над скрынкаю. Андрэй дрыжачымі рукамі, якія не слухаліся ад хвалявання, з заміраючым сэрцам, адчыніў дзверцы «доміка». Паказаўся цікаўны цёмны шагрэневы нос, потым галава, і, нарэшце, на падлогу выслізнуў увесь сабака — яшчэ не дарослы, а толькі шчанюк. Але які! Прыгожы, напэўна, пародзісты. Будучая аўчарка. Дакладней кажучы, аўчар. А выраз сабачага «твару» быў сапраўды наіўным, даверлівым. І гледзячы ўсім у вочы, сабачка праклыпаў да новага крэсла і прысеў каля яго: шчанюкі яшчэ не ўмеюць задзіраць лапу.

— Ну вось і прапісаўся на новым месцы! — усміхнуўся Васіль Сцяпанавіч, робячы націск на трэцім складзе ў слове «прапісаўся».

— Дакладней кажучы, «прапісаўся»! — паўтарыла гэта слова Лана, акцэнтуючы на другі склад.

Усе засмяяліся.

— Сапраўдная аўчарка, як у Альхоўскіх! — заўважыла Таццяна Яўгенаўна. — Толькі маленькая. Маленькі. Хлопчык.

— Не, мама. У Альхоўскіх нямецкая аўчарка, а гэта ўсходнееўрапейская. Хаця па шчанюку, бывае, цяжка адрозніць яшчэ, — Андрэй шмат літаратуры «праглынуў» на гэтую тэму і таму гаварыў упэўнена. — Потым паглядзім. Нямецкая — чорная, а ўсходнееўрапейская — чорна-залацістая, з падпалінамі. А якія яны разумныя! Вядома, калі вырастуць...

Таццяна Яўгенаўна паднялася.

— Так, спецыялісты-кінолагі! — звярнулася яна да ўсіх. — Усім зараз жа мыць рукі — і за стол! У нас жа сёння свята!

Неўзабаве сям'я сядзела за сталом. Усе дружна віншавалі імянінніка. Андрэй радаваўся: свята не толькі падняло яму настрой, але і прымусіла па-іншаму зірнуць на жыццё — столькі клопатаў прынёс з сабою новы маленькі член сям'і!

— А як завуць яго? — раптам спытаў Андрэй.

— Прабачце, даражэнькія, зусім забыўся! — успомніў пра нешта Войцік-старэйшы. — Вось якраз і пашпарт нашага сабакі.

Васіль Сцяпанавіч устаў, выцягнуў з кішэні дакумент, падаў яго сыну.

— Міжнародны пашпарт, — прачытаў Андрэй на вокладцы. Разгарнуў.

— Дай мне, я хутчэй знайду! — папрасіла нецярплівая Лана.

— Вось, тут напісана... усходнееўрапейская аўчарка... пародзістыя... А завуць яго... Поль.

— Дык ён француз! — засмяялася Лана.

— Ну што гэта за мянушка для сабакі — Поль? — Андрэй не згаджаўся з тым, што напісана ў сабачым пашпарце. Хоць і ў міжнародным. — Давайце будзем зваць яго па-іншаму, а?

— А забабонаў не баішся? — Васіль Сцяпанавіч хітра, усміхнуўшыся аднымі вачыма, паглядзеў на сына. — Кажуць, што мяняць мянушку ў пашпарце нельга, бо жыццё сабакі будзе нешчаслівым: ці доўга хварэць будзе, ці нават памерці можа, бывае, і не сваёй смерцю...

Андрэй спачатку нічога не адказаў. Задумаўся.

— А калі гаспадару не падабаецца, чаму нельга мянушку змяніць?

— А што ты прапануеш, гаспадар? — Войцік зірнуў сыну ў вочы.

— Хачу назваць сабаку па-свойму.

— Як?

Андрэй акінуў позіркам кніжную паліцу над галавою бацькі, які сядзеў за сталом насустрач. Адна з кніжак не стаяла разам з усімі, а ляжала наверсе. Падлетак прачытаў: «Джэк Лондан. Апавяданні». Гэта быў адзін з яго любімых пісьменнікаў, як Янка Маўр, Фенімор Купер, Майн Рыд.

— Слухайце. Я прыдумаў, — Андрэй абвёў позіркам усіх. — Давайце назавём яго Джэк. Як Лондана.

— А што, гучыць нядрэнна, — падтрымала брата Лана. — Джэк. Не тое, што Поль гэты. Няхай будзе не французам, а англічанінам. Але тата гаварыў...

— Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць, — Васіль Сцяпанавіч усміхнуўся. — Вядома, калі верыць усім забабонам, то і з хаты нельга ўвогуле выходзіць, каб не сурочылі.

— Хаця іншы раз трэба прыслухоўвацца, што добрыя людзі кажуць, — асцярожна заўважыла Таццяна Яўгенаўна.

— Ведаем мы такіх добрых людзей! — ці то сур'ёзна, ці то жартаўліва сказаў Войцік-старэйшы. — Адны плёткі навокал. І кроку без іх нельга зрабіць. Толькі штосьці скажаш на пачатку калідора, як у канцы яго табе пра гэта ўжо дакладаюць, але ў якім выглядзе! З ног на галаву паставяць. І асбліва ў бабскім калектыве! Вось дзе расаднік!

— У мужчынскім не горш бывае! — жартаўліва парыравала жонка. — Сваё начальства ўспомні! Толькі плёткам і верыць!..

Андрэй баяўся, што гэтая, з жартачкамі спачатку, размова магла перарасці ў нешта больш сур'ёзнае.

— А чым карміць будзем Джэка? — ён трымаў сабаку на руках, а той з задавальненнем імкнуўся ўхапіць новага гаспадара за палец.

Бацькі адразу спынілі «баталіі». Успомнілі, што ў сына дзень нараджэння.

— Я корму яму купіў, для шчанюкоў, імпартны. Джэк наш, мяне папярэдзілі, прывучаны ўжо да гэтага корму. У вітальні мяшэчак.

Насыпаўшы ў пластмасавую місачку корм, Андрэй з цікавасцю стаў назіраць, як яго гадаванец пачаў са смакам частавацца...

Так у сям'і Войцікаў з'явіўся Джэк — галоўны герой гэтай гісторыі.

## Частка III

Сонца сваімі промнямі, здавалася, парэзала ўвесь пакой на бліскучыя астраўкі. Цень ад аконных кратаў адбіўся на стале і на твары Васіля Сцяпанавіча. Але Войцік нічога на заўважаў. Слёзы прынеслі часовае суцяшэнне, і ён нібы скінуў нейкі цяжар з плячэй.

Капітан Корань наліў вады.

Войцік уздыхнуў, дрыжачымі рукамі ўзяў кубак, зрабіў некалькі глыткоў і, гледзячы кудысь убок, нібы ўзіраючыся ў мінулае, зноў пачаў расказваць.

— Ажаніўся я яшчэ ў канцы сямідзясятых. Пасля інстытута працаваў інжынерам у канструктарскім бюро на заводзе. Актыўна займаўся спортам. Атрымаў магчымасць выступаць на раёне, горадзе, а потым і рэспубліцы. У пачатку дзевяностых, калі Саюз разваліўся, як і іншыя, спрабаваў ездзіць з адным маім таварышам у Польшчу — яшчэ ў інстытуце разам вучыліся. А дзе грошы браць? Пазычыў у сяброў-спартсменаў трохі, і тое, што было на кніжцы, узяў. Накупілі сяго-таго. Усяго два разы з'ездзілі. А на трэці — ледзьве жывымі засталіся. На вакзале ў Беластоку да нас падышоў малады хлопец і па-руску запытаў, каторая гадзіна. Мы, напэўна, па інэрцыі па-руску і адказалі. А калі апынуліся ў бязлюдным месцы (за намі, безумоўна, сачылі), падышлі нейкія людзі, дасталі нажы, ткнулі адзін мне ў бок, сказалі, што заб'юць, калі нават пікнем, і забралі ўвесь тавар...

Войцік горка ўсміхнуўся. Памаўчаў. Глытнуў вады.

— ...Пакінулі толькі дзесяць долараў — на білет да Мінска... Пасля таго выпадку ўвогуле баяўся ездзіць кудынебудзь. А мой таварыш не думаў здавацца. Яго знаёмы быў брыгадзірам калымшчыкаў у Расіі. Яны будавалі катэджы. Я таксама вырашыў паспытаць шчасця. Быў align рознарабочым: раствор там прынесці, цэглу разгрузіць... Ды і гэта справа не заладзілася. Аднойчы пасля дажджу паслізнуўся на мокрых рыштаваннях. Упаў. Зламаў пару рэбраў. Страхоўкі ніякой не

было. Гаспадар заплаціў нейкія капейкі, каб я вярнуўся дадому. Схуднеў, счарнеў... Нават Таня, жонка, ледзьве пазнала. А дзяцей карміць трэба. Мае таварышы па спорце таксама кінуліся ў заробкі: хто таксістам, а хто і ў ахову. Нарэшце і я, нікуды не ад'язджаючы, тут, у Мінску, знайшоў сабе працу па душы: выпадкова сустрэў яшчэ аднаго інстытуцкага прыяцеля і пайшоў да яго ў магазін будаўнічых матэрыялаў менеджарам-кансультантам. Спатрэбіўся мой былы інжынерны вопыт. Адрамантаваў кватэру. Купіў старэнькага «форда». Паступова з'явілася сякая-такая капейка. Кожны год з жонкай і дзецьмі пачалі ездзіць у Крым... Чаго яшчэ чалавеку патрэбна?

— А Джэк? — нарэшце перахапіў ініцыятыву Пятро Фёдаравіч. Капітан курыў чарговую цыгарэту, стоячы ля расчыненай форткі.

Войцік раптам здрыгануўся, нібы ўспомніўшы пра нешта балючае.

— Вы толькі што прыгадалі пра дзень нараджэння сына, пра тое, як зрабілі яму падарунак, — Корань узяў попельніцу, сеў за стол.

У вачах Войціка раптам паказаліся слёзы. З кішэні ён выцягнуў партманэ, з яго — фотаздымак.

— Вось наша сям'я. І Джэк... Хіба ж не прыгажун?

Ён зноў схіліў галаву, а калі падняў, на твары была такая горыч, што капітану, чалавеку далёка не сентыментальнаму, захацелася яго суцешыць. Пятро Фёдаравіч узяў фотаздымак. Фота было зроблена, напэўна, дзесьці на прыродзе. Старэйшы Войцік разам з жонкаю стаяць, абняўшыся. Перад імі на траве сядзяць дзеці, ужо амаль дарослыя. Андрэй гладзіць па галаве сабаку, які быццам шчасліва ўсміхаецца, мружачыся ад сонца.

Пятро Фёдаравіч калісьці таксама меў чатырохногага сябра. Некалькі год таму ў яго жыў маленькі чорненькі «тойчык»[1] Тоша. Жонка з дачкой, ды і ён сам, не маглі нарадавацца на

[1] «Тойчык» (той-тэр'ер) — дробная парода сабак.

свайго любімца. Але чумка — адкуль толькі ўзялася тая хвароба? — забрала ў іх Тошку. Гаравалі па ім, як па чалавеку. Пасля вырашылі: больш ніякага сабакі ў доме не будзе...

Цяпер, гледзячы на фатаграфію Джэка, Пятро Фёдаравіч нібыта зноў пераажыў страту свайго ўлюбёнца. Любы сабака нагадваў яму Тошку...

А з гэтага здымка на Кораня глядзеў прыгожы дарослы аўчар. Вострыя вушы, чорны бліскучы нос, жоўта-чорная з падпалінамі поўсць — як быццам звычайная «знешнасць» сабакі гэтай пароды. Але штосьці незвычайнае было ў Джэка. Але што? «Вочы!» — раптам здагадаўся капітан. Позірк Джэка быў не падобны на звярыны. «Гэта амаль чалавечы позірк, у якім адлюстроўваўся не інстынкт, а нешта разумнае, больш глыбокае... — усё гэта маланкай пранеслася ў галаве Кораня. — Дзіўна, — падумаў ён, — сабака з чалавечымі вачыма...» Уздыхнуў. «Амаль як у Тошкі», — зноў прамільгнула думка.

— Колькі радасці ён нам прыносіў, — працягваў Войцік, — быў сапраўдным членам сям'і. Для Андрэя, ды і ўсіх нас, Джэк быў добрым сябрам, надзейным абаронцам — вялікім, ласкавым, прыгожым...

Мужчына на хвіліну змоўк, апусціўшы вочы долу. Зноў на ягоным твары з'явілася нешта падобнае на горкую ўсмешку.

— Джэк, як і любы добра выхаваны сабака, ніколі не мог пакрыўдзіць чалавека, асабліва малое дзіця альбо каго-небудзь з нашай сям'і. І калі для дзіцяці дзесяць-дванаццаць год не ўзрост, то для сабакі гэта ўжо старасць.

Твар Войціка зноў стаў змрочным.

— Узрост заўсёды бярэ сваё... Уявіце сабе старога чалавека, які занядужаў, хварэе, патрабуе шмат увагі. Так і Джэк. Колькі я аб'ездзіў ветэрынараў! Усе гаварылі, што доўга ён не працягне. А з вясны гэтай стаў не падобным на сябе — раздражнёным, нават агрэсіўным. Я якраз хацеў паехаць з Джэкам да ветэрынара. Але не паспеў...

Войцік хутка зірнуў на капітана.

— Вы нічога не падумайце толькі... Я ніколі не думаў аб тым, каб усыпіць Джэка. Паверце, ніколі такой думкі не ўзнікала... Але ўчора...

Ён на хвіліну замаўчаў...

* * *

Капітан Корань разумеў, як цяжка гаварыць чалавеку, што сядзеў насупраць яго. Той, здавалася, згінаўся пад цяжарам сваіх слоў, той віны, якую адчуваў, тых падзей, якія зараз перажываў нанова. Але ў чым была віна яго?

— Учора, — відаць, сабраўшы ўсе сілы, працягваў Войцік, — я якраз быў у гаражы — пяць хвілін ад дома. І тут пазваніла маці — яна жыве зараз з намі. Я добра чую, як рычыць Джэк і разумею: нешта здарылася. А маці як загалосіць у трубку: «Сынок, ляці хутчэй! Сабака звар'яцеў! Зараз усіх пакусае! Як мяне...» Не дагаварыла, кінула трубку. У мяне зямля пайшла з-пад ног... Але сумеўся. Кінуўся на машыне дахаты. Уляцеў у кватэру. Маці пасярод кухні. Стаіць, прыціскае правую руку. З яе цячэ кроў. Побач жонка з нейкай анучкай. Паміж імі — Джэк. Ашчэрыў зубы. Рык на ўвесь дом. Аказваецца, калі сабака еў, маці хацела змяніць у ягонай паілцы ваду (паілка стаяла побач з міскай сухога корма для Джэка). У гэты момант сабака нечакана зарычаў (такога яшчэ ніколі не было) і цапнуў маці за руку. Яна збянтэжылася не столькі ад болю, колькі ад крыўды на яго. Хаця якія зубы ў аўчаркі, вы, пэўна, ведаеце... Маці закрычала. Прыбегла жонка. Замахнулася на Джэка павадком. Той ашчэрыў зубы і на яе. Маці толькі тады заўважыла, што з рукі цячэ кроў. Рана была невялікая, але жанчыны спалохаліся. Маці патэлефанавала мне. Дзякуй Богу, я быў недалёка...

— А чаму вы не выклікалі міліцыю або ветслужбу? — пацікавіўся Пятро Фёдаравіч.

— Я быў упэўнены, што Джэк мяне, свайго гаспадара (а любы сабака заўсёды выбірае сабе ў сям'і галоўнага «га-

спадара», якога ва ўсім слухаецца), пакрыўдзіць не пасмее. Але, заляцеўшы тады ў кватэру, усё ж схапіў намордніk і павадок. А ўбачыўшы, як па руцэ маці сцякае кроў, сам быццам звар'яцеў: як ён мог пакрыўдзіць роднага, самага дарагога мне чалавека?! Гэтага я зразумець не мог. Маці імкнулася нешта сказаць... Але злосць цалкам захапіла ўсе мае думкі, пачуцці. З-за дзвярэй я ўбачыў збялелы твар Ланы — яна баялася заходзіць. Дачка чакае дзіця — ёй нельга хвалявацца. Выклікалі «хуткую». Усё раптам закруцілася навокал, як у страшэннай завірусе... Я задыхаўся ад крыўды, болю і злосці на таго, хто да апошняга моманту быў дамашнім улюбёнцам, сапраўдным членам сям'і. Гэты боль рос. І мне стала страшна. Душа чакала помсты. Я, не гаворачы ні слова, падляцеў да Джэка, начапіў павадок і пацягнуў сабаку за сабою. Як на бяду, позірк мой упаў на жалезную шафу, дзе стаяла ў чахле стрэльба. Схапіў яе. Джэк раптам усё зразумеў. Пакорліва паплёўся за мною. Жанчыны мае хорам залямантавалі: «Куды ты? Не трэба!». Але я нікога не чуў: не мог дараваць Джэку...

Войцік на хвіліну змоўк. Корань наліў яму вады. Той зрабіў некалькі глыткоў.

— Дык вось... Я зацягнуў Джэка ў машыну. Даў па газах. Як звар'яцелы, ляцеў праз увесь горад, за кальцавую. Памятаю толькі нейкі туман у вачах, галаве... Вылецеў з трасы на прасёлак. Як быццам калісьці ездзіў сюды на паляванне. Нырнуўшы паміж бяроз у нізінку, спыніў машыну на паляне, каля вялікай паваленай бярозы. Выцягнуў з чахла стрэльбу. Уставіў два патроны — не памятаю, з якім дробам. Джэк не супраціўляўся... Ён стаяў перада мною. Толькі трохі схіліў галаву набок... А ў яго вочы чалавечыя... Я не мог у іх глядзець... Я не мог вытрымаць гэты позірк... Ускінуў стрэльбу. Рукі не слухаліся... Не цэлячыся, пальнуў дуплетам. Куды трапіў, не ведаю: слёзы заслалі вочы. Толькі пачуў прыглушаны енк — і ўсё... Свет захістаўся перада мною. Жыць у той момант не хацелася...

Войцік закрыў галаву рукамі. Плечы яго затрэсліся... Пятро Фёдаравіч пачакаў некалькі хвілін. Потым пасунуў да яго кубак з вадою.

— Супакойцеся. Выпейце вады.

Войцік дрыжачымі рукамі ўзяў кубак. Глытнуў. Цяжка ўздыхнуў.

— Не памятаю, як апынуўся ў машыне... Кудысьці ехаў... Потым спыніўся, доўга стаяў. Перад вачыма быў збялелы твар маці... і вочы Джэка... Я не ведаю, што з ім стала... Памятаю, што машынальна набраў маці, спытаў, як яна. Сказала, што рука ў парадку... А астатняе вы ведаеце...

## Частка IV

Нягледзячы на тое, што ў летнія месяцы школьнікі раз'язджаюцца хто куды, у мастацкім музеі было людна. Розная публіка: адзінокія інтэлігенты, аматары (зрэдку прафесіяналы) са стажам, невялікія групкі іншаземцаў з фотаапаратамі і, вядома ж, вялікія дэлегацыі вучняў з заклапочанымі настаўнікамі (пэўна, са школьных летнікаў) — таўклася у фае на першым паверсе перад вялізнай прыгожай лесвіцай, што «вяла ў незвычайны свет мастацтва». Так казала чорнавалосая мініяцюрная дзяўчына-экскурсавод, якая стаяла перад адной з такіх дэлегацый падлеткаў-гімназістаў. Побач з дзецьмі знаходзіўся і іх настаўнік — малады мужчына гадоў пад трыццаць, хударлявы, у светлай тэнісцы з гальштукам і лёгкіх штанах «у тон». Светлашэрыя вочы яго, здавалася, выпраменьвалі цікавасць да ўсяго, што адбывалася навокал. Амаль кожную хвіліну ён папраўляў рукою акуляры, якія спаўзалі на кончык носа. Андрэй Васільевіч Войцік быў у музеі далёка не першы раз. І сёння настаўнік гісторыі прывёў сваіх выхаванцаў на чарговую экскурсію. Ён і сам мог бы шмат чаго расказаць вучням — вельмі ж захапляўся жывапісам, асабліва заходнееўрапейскім, хаця і ў рус-

кім разбіраўся нядрэнна. Але тут, у храме мастацтваў, заўсёды перакладаў гэты «пачэсны абавязак» на плечы прафесійных экскурсаводаў.

*...І тчэ, забыўшыся, рука*
*Заміж персідскага узору*
*Цвяток радзімы васілька...*

Гэтыя радкі Багдановіча вярнулі Андрэя да рэчаіснасці...

— Сёння, дзеці, вы ўбачыце калекцыю славутых слуцкіх паясоў, і таму да гэтага верша «Слуцкія ткачыхі» мы з вамі яшчэ вернемся. А зараз — прашу наверх, — дзяўчына паказала рукою ў бок лесвіцы. Хлопцы і дзяўчаты паслухмяна рушылі за ёю.

«Які прыгожы голас, — раптам падумалася Войціку, і ён міжволі зірнуў на постаць экскурсавода. — Можа, пазнаёміцца? Я і сам для такой дзяўчыны экскурсію правёў бы...» Андрэй адразу засаромеўся сваёй думкі, бо ў сардэчных справах ніколі не быў асам.

Праца ў школе і розныя прыватныя заняткі займалі амаль весь вольны час Андрэя — на «розныя глупствы», як лічыў Войцік, ні хвіліны не заставалася. Сярод школьных калегінь «каханай і адзінай» не знайшоў. Бацькі ўжо даўно ў адкрытую гаварылі, што «нядрэнна было б паняньчыць унукаў». Лана, яго старэйшая сястра, дзякуй Богу, паспела не толькі выйсці замуж, але і чакала дзіця. Так што мара бацькоў павінна была хутка здзейсніцца...

Толькі што ў музеі расчынілі дзверы новыя залы, і таму Андрэй надаваў сённяшняй экскурсіі яшчэ больш увагі, чым звычайна. А тут да ўсяго і такі цікавы экскурсавод! Гэта быў добры знак!

Яны ўвайшлі ў памяшканне, дзе віселі партрэты з радзівілаўскай калекцыі. Насупраць, у вялікіх вітрынах, знаходзіліся слуцкія паясы. Рознакаляровыя, кожны са сваім непаўторным узорам, яны прыцягвалі позірк любога з наведвальнікаў экспазіцыі. Войцік заўважыў, што дзеці адразу ж пачалі перага-

ворвацца, і з задавальненнем адзначыў: ніводнага абыякавага сярод сваіх выхаванцаў не засталося.

— Тут на бэджах напісаны старажытныя беларускія, правільней кажучы, ліцвінскія, імёны — яны будуць вашымі імёнамі на гэты час.

Экскурсавод раздала бэджы вучням.

Падлеткі пачалі аглядаць адно аднаго.

— О, я — Марцэля! — радасна-здзіўлена піскнула светлавалосая дзяўчынка ў джынсах. — А ты хто?

Яна звярнулася да суседкі — паўнаватай, у міні, з рыжымі фарбаванымі валасамі.

— Я Барбара! — адгукнулася тая, і абедзве прыглушана засмяяліся.

— Цішэй, дзеці! — перарваў свае думкі настаўнік. — Памятайце, дзе знаходзіцеся!

Гімназісты, як па камандзе, сціхлі. Нават хлопцы, якія таксама пачалі агучваць свае «імёны».

— А ў вас, Андрэй Васільевіч, якое імя? — пацікавілася Марцэля.

Усе дзеці павярнуліся да Войціка. А ён раптам заўважыў, што трымае ў руках бэдж. Экскурсавод таксама глядзела на яго.

— Якуб, — прачытаў Андрэй. — А ў вас? — машынальна спытаў ён, гледзячы на экскурсавода.

Дзеці засмяяліся.

Дзяўчына таксама ўсміхнулася.

— Даратэя, — прыгожым меладычным голасам адказала яна. І злёгку пачырванела.

Андрэй таксама адчуў, як шчокі яго наліваюцца чырванню. «Вось дурань, да такіх год дажыў, а чырванею, як дзіця. І з жанчынамі размаўляць не ўмею», — падумаў ён.

— Дзеці, а што вы ведаеце пра слуцкія паясы? — «Даратэя» звярнулася да гімназістаў.

Вучні пачалі адказваць. Экскурсавод слухала кожнага, рабіла заўвагі. Андрэй з цікавасцю ўзіраўся ў твар дзяўчыны,

зноў і зноў позірк яго спыняўся на прыгожых светла-блакітных яе вачах, маленькім, злёгку курносым носіку, доўгіх чорных валасах, залатым крыжыку у выразе белай блузкі і — чаго хлусіць! — надзвычай прывабных яблычках грудзей, што ўздымаліся з кожным уздыхам...

Дзяўчына пачала расказваць пра слуцкія паясы. З кожнай хвілінаю Андрэй разумеў, што тая тэма, дзеля якой ён прыйшоў сюды, не цікавіць яго сёння: яго ўвага была прыкавана да гэтай мадонны, што распавядала аб нечым... І ён у сваіх марах, напэўна, плыў да яе, як раптам пачуў:

— ...А вось гэты пояс — французская падробка, імітацыя беларускага. Я толькі што вам пра яе расказала. А ваша задача — прыдумаць гісторыю пра тое, як такі пояс з'явіўся ў нас на Беларусі. Можаце ўжываць любыя імёны, назвы. Хто будзе першым адказваць, назаву сама. Пачынайце...

Дзеці згрупаваліся хто з кім хоча — і пачалася творчасць. Андрэй таксама паклаў перад сабою аркуш, узяў ручку. Прыгадаў усё, што ведаў пра залатыя паясы. Зразумеў, што нямала, і вырашыў, як былы «кавээзэшнік», троху «пахуліганіць». Зірнуў на чыстую старонку і раптам вывеў: «Пра Якуба і Даратэю...». «Кавээзэшны» вопыт дапамагаў яму ў такіх сітуацыях. І вось зараз нараджаліся адзін за адным радкі, якія цяжка было назваць паэзіяй — проста нейкае графаманскае свавольства... Праз некалькі хвілін, паставіўшы апошнюю кропку, Андрэй раптам схамянуўся: «А дзе ж мая Даратэя?».

А «Даратэя» прысела на лаўцы, паставіла побач нейкую скрыначку і з цікавасцю глядзела на вучняў. Раз-поразу яна кідала і на яго позірк, але адразу ж адводзіла вочы ўбок.

«Яна амаль маіх гадоў, — падумалася Войціку, — і крыжык праваслаўны. І не сучасны, нейкі незвычайны — чымсьці нават аздоблены. Такога ні ў кога няма». Дзяўчына раптам зірнула на яго — вочы ў вочы. Андрэй зразумеў: калі зараз не падыдзе да прыгажуні — будзе апошнім дурнем...

Войцік нясмела падышоў — і ледзь не сеў на скрыначку.

— Ой, прабачце, калі ласка! — войкнуў ён. Выхапіў скрынку, сеў на лаўку.

— Нічога, — усміхнулася дзяўчына. — Давайце сюды.

Яна ўзяла скрынку, пры гэтым злёгку дакрануўшыся рукою да яго рукі. Андрэй у чарговы раз паправіў акуляры на носе і зразумеў, што патрэбна нешта сказаць. Звычайна ён знаходзіў неабходныя словы, каб падтрымаць размову, хоць і з відавочнай цяжкасцю. Але зараз амаль «страціў прытомнасць» і не ведаў, з чаго пачаць.

— А вы даўно тут працуеце, у музеі? — нарэшце «знайшоўся» ён.

— Амаль тры гады — адразу пасля ўніверсітэта.

Гэтыя словы яна прамовіла, гледзячы кудысь убок. Потым зірнула яму ў вочы.

— А я вас памятаю. Вы вучыліся на гістфаку, толькі на два курсы «вышэй». І былі ў камандзе КВЗ. А я, памятаю, аднойчы нават была ў камандзе балельшчыкаў.

Андрэй з цікавасцю зірнуў на яе. Цяпер ужо па-новаму. У іх на курсе было шмат дзяўчат. А на іншых курсах — і не ўспомніць усіх.

— А памятаеце, вы аднойчы на практыку нават сваю аўчарку прывозілі?

— Джэка? — машынальна спытаў ён.

— Не ведаю. Вы яшчэ гаварылі, што спортам займаецеся.

«Вось табе і студэнцкая памяць! А я ж ні ў зуб нагою!» — Войціку, вядома ж, было прыемна сустрэць «баявога таварыша» па ўніверсітэце. Але ж адначасова было і няёмка, што не памятае тую, з кім ужо, здаецца, калісьці быў знаёмы.

— Кінуў ужо спорт — няма часу.

Памаўчаў.

— Мяне Андрэем завуць. А вас?

— Іна.

— А для дзяцей? Імя па бацьку?

— Іванаўна...

Іх позіркі зноў сустрэліся... І Андрэю падалося, што вярнуўся той светлы і амаль бесклапотны час, калі знешняя сур'ёзнасць лёгка спалучаецца з буйнасцю вясёлага юнацтва, калі тая шчаслівая студэнцкая пара, як і вясна, здаецца вечнай...

Ён адчуваў сябе яшчэ зусім маладым чалавекам. Але кожны пражыты год надаваў развагі, жыццёвага досведу. Хаця Андрэй лічыў сваю прафесію з пункту гледжання кар'еры бесперспектыўнай.

Нават бацька часта гаварыў яму: «І хіба гэта прафесія! Вось камп'ютаршчыкі альбо юрысты — дык яны маюць жывыя грошы! А ты?..».

Але Андрэю падабалася праца з вучнямі і рэдкія экспедыцыі з краязнаўцамі-археолагамі...

— Дзеці! Час выйшаў. Трэба падводзіць вынікі! — Іна-Даратэя звярталася да яго выхаванцаў.

Гімназісты расселіся на лавах вакол яе.

Андрэй зразумеў: размова пакуль што скончана. Але яму было прыемна. Ён адчуваў, што гэтае «знаёмства» невыпадковае. За плячыма яго нібыта раслі крылы: надзея на штосьці светлае, чыстае напаўняла душу...

— Заданне ўсе памятаеце?

— Так, — як адзін, адказалі вучні.

— А можна паўтарыць? — спытаў Андрэй.

Іна паглядзела на яго. Неяк па-новаму, падалося Войціку.

«А можа, таму што знаёмага сустрэла...»

— Паўтараю. Пытанне было такім: «Як на нашай зямлі з'явіліся французскія паясы і чаму іх выдавалі за беларускія?». Неабходна было прыдумаць сваю гісторыю. У гэтай скрыні імёны будучых апавядальнікаў. А вось першым раскажа нам сваю гісторыю...

Іна расчыніла скрыначку, апусціла ў яе руку і, не гледзячы туды, выцягнула кардонку з іменем. Кінула на яе позірк — і гарэзліва зірнула ў вочы Андрэю.

— ...Якуб!

На нейкую хвіліну зрабілася вельмі ціха. І раптам гэтая цішыня выбухнула дзіцячым смехам!

— Хлопцы і дзяўчаты, цішэй — вы ж у музеі! — Іна звярнулася да вучняў.

Андрэй зразумеў: ён «ці пан, ці прапаў». Трэба ісці ва-банк: каб зарабіць аўтарытэт, неабходна шмат год, а каб згубіць — і адной хвіліны дастаткова... Ён весела зірнуў у вочы Іне, зрабіў паўзу і рашуча абвясціў:

— «Легенда пра Якуба і Даратэю, або Як Еўропа вучылася ткаць па-беларуску».

Пракашляўся і дадаў:

— Са студэнцкага фальклору!

Падумаў пра сябе: «Блазан. Але што зробіш?».

Дзеці не разумелі, як ставіцца да ўсяго гэтага — сур'ёзна ці не. А Войцік, як былы «кавээшнік», зрабіў вялікую паўзу «па Станіслаўскаму» і неяк пафасна, нібы акцёр на сцэне, пачаў:

*З французскага Ліона багацея,*
*Што ткала для Еўропы ўсёй абрусы*
*(Імя яна насіла Даратэя),*
*Спаткалася аднойчы з беларусам...*

Андрэй не лічыў сябе паэтам, хаця часам грашыў вершамі. «Пісаў у стол», па ягоных словах. А сёння быў сапраўдны экспромт. Дзеці учынілі цэлую авацыю — нават Радзівілы са сваіх партрэтаў, здавалася, здзіўлена пазіралі на іх — «Якуба» і «Даратэю». Войцік зірнуў на Іну: яна ледзь стрымлівала смех, а вочы яе неяк дзіўна свяціліся радасцю, маладосцю. Было відавочна, што яна ў захапленні...

* * *

Музейны занятак скончыўся. Усе спусціліся ў хол. Дзеці на хаду абмяркоўвалі ўсё ўбачанае сёння. За імі па лесвіцы, не спяшаючыся, сыходзілі Андрэй і Іна.

— Вельмі прыемна было ўбачыцца з вамі, Іна, — сказаў Войцік, адчуваючы, якім сумам напаўняецца душа. Яму так хацелася яшчэ ўбачыцца з ёю, пачуць яе голас, дакрануцца да яе рукі і... ніколі больш не адпускаць гэтую руку. І любавацца прыгожым залатым крыжыкам у выразе светлай, як яго мара, блузкі...

— І я таксама... Дзякуй за верш... Цудоўна напісалі, — здавалася, Іна таксама не знаходзіла слоў.

Яна калісьці, яшчэ у студэнцкія гады, звярнула ўвагу на гэтага прыгожага юнака. Ведала, што ён займаецца спортам. А як выступаў на «кавэзэшнай» сцэне! Усе дзяўчаты былі закаханыя ў яго. А Андрэй... У яго была толькі адна любімая дзяўчына — Гісторыя. Падчас практыкі, на раскопках, быў памочнікам кіраўніка. Дыпломная праца — лепшая на курсе. Гэта дзяўчаты гаварылі — тыя, што вучыліся з ім. А яна... Хто яна такая? Звычайная дзяўчына з вёскі пад Мінскам. І на гістфак трапіла выпадкова — за кампанію з сяброўкай, Валяй Нячай. Дык Валька ўжо аспірантуру хутка скончыць. А яна? Па знаёмстве ўладкавалася на працу сюды, у музей. А што далей? Ніякай перспектывы. Трэба ўжо замуж выходзіць і дзяцей заводзіць. Гэта толькі Валька Нячай замужам за сваёю навукаю! Іна не зайздросціла сяброўцы — кожны сам робіць свой выбар. Нічога, з заўтрашняга дня ў яе водпуск, такі доўгачаканы! Іна з'ездзіць, як любіла сама гаварыць, «на вёску», адпачне, дапаможа матулі — працы вунь колькі!.. Але сёння, сустрэўшы Андрэя, Іна раптам зразумела, што хацела б яшчэ ўбачыцца з ім, хоць гэтая думка падалася ёй «крамольнаю». Маці выхоўвала дачку даволі строга, і таму яна была вельмі сарамліваю дзяўчынай. Лічыла, што трэба шлюбам брацца толькі адзін раз і назаўсёды...

— Сёння якраз заканчваецца змена ў школьным летніку, і я заўтра зранку еду ў экспедыцыю — на паўмесяца. Як бы мне з вамі сустрэцца? Вы ж мая Даратэя, а я ваш Якуб...

Іна зноў усміхнулася, але адказаць не паспела...

— Іна Іванаўна, вас выклікаюць у прыёмную! — да іх падымалася жанчына з бэджам на блузцы. Убачыўшы Андрэя, яна падміргнула Іне і змоўніцкім тонам дадала: — Наконт адпачынку. Але хутчэй, дырэктар чакаць не любіць!

Жанчына зноў усміхнулася ім і хутка пакрочыла ўніз.

— Прабачце, Андрэй, мне трэба бегчы. Гэта вельмі важна. Убачымся... Пакуль...

Іна неяк вінавата зірнула на яго і пабегла ўніз...

— Андрэй Васільевіч! Тамашэўскі і Бурак выйшлі за дзверы, не дачакаліся нас! — падбегла дзяўчынка, што нядаўна была Марцэляй.

— Добра, Галя, зараз іду.

Войцік яшчэ зірнуў услед Іне, і, уздыхнуўшы, пакрочыў па лесвіцы да выхаду...

## Частка V

Капітан Корань разумеў, што неабходна даць Войціку выгаварыцца. Па тым, што паведаміў гэты чалавек, выходзіла: ніякага злачынства няма, толькі «шумахерства» на дарозе і неахайны выгляд «форда». І ўсё. Што яму яшчэ інкрымінаваць? Забойства аўчаркі? Або спробу забойства? Такога артыкула няма, ды і ён дастаткова ўжо сябе пакараў. А калі сабака сапраўды шалёны і можа, калі выжыў, пакусаць кагосьці яшчэ? Ды і Войцік гэты мог не пра ўсё расказаць... Трэба ўсё праверыць!

Пакуль Пятро Фёдаравіч разважаў, у кішэні яго візаві прачнуўся мабільны тэлефон. Войцік папрасіў дазволу адказаць на званок.

— Таня, ты? Нармальна... Дзе я?..

Зірнуў на капітана, падумаў.

— У знаёмага... Што з маці? Два швы наклалі? А як цяпер? Нядрэнна? Дзякуй Богу!.. Як Джэк?.. Ну...

Памаўчаў, не ведаючы, што адказаць.

— Танюша, давай потым пагаворым. Добра? Дома калі буду? Думаю, неўзабаве — праз гадзіну-другую... Цалую. Пакуль.

Войцік моцна сціснуў тэлефон.

— Жонка тэлефанавала. З маці ўсё добра. Два швы наклалі на руку. Адышла ад болю і страхаў. Але... вельмі хвалюецца за Джэка... Нават цяпер... Пасля ўсяго...

Ён нізка апусціў галаву.

— Эх, што я нарабіў!.. Каб толькі Джэк выжыў!

Раптам Войцік ускінуў вочы на капітана.

— Паслухайце! — хутка загаварыў ён. — Трэба зноў паехаць на тое месца! Хаця...

Корань думаў якраз пра тое самае: «Баіцца вяртацца туды... Вядома, паліць казённы бензін было б неразумна. Але калі ўсё ж наш герой чагосьці не дагаворвае?».

— А вы зможаце знайсці тое месца?

Войцік паціснуў плячыма.

— Паспрабую...

Корань зірнуў на гадзіннік. Зняў трубку тэлефона, што стаяў на стале.

— Міхневіч! Ксенафонтаў там вольны? Давай яго да мяне ў кабінет! Куляй! І Сямёнавічу перадай, што пасля трох буду!

Не паспеў пакласці трубку, як у дзверы пастукалі.

— Заходзьце! — крыкнуў капітан.

Дзверы расчыніліся. На парозе стаяў малады сяржант.

— Старшы сяржант Ксенафонтаў... — пачаў той.

— Заходзь, Сяргей, — перарваў Корань. — Няма часу. Па конях!

Праз некалькі хвілін усе былі ў машыне Войціка.

* * *

Сонца ўжо высока стаяла над гарызонтам, калі сіні «форд» перасёк мяжу горада. Жнівеньскі дзень быў насычаны пахамі лугавых кветак, скошанай сям-там травы, птушынымі

спевамі. Таполі паабапал шашы стаялі як ганаровая варта, вітаючы ўсіх, хто праязджаў тут. Справа, на ўзгорку, паўсталі калгасныя будынкі на чале з сіласнай вежай, купал якой срэбрам зіхцеў на сонцы. Адразу за ёй на агароджаным участку стаяла розная сельскагаспадарчая тэхніка: камбайны, грузавікі, сеялкі. Праз расчыненыя вароты не спяшаючыся поўз гусенічны трактар.

Нічога гэтага не заўважаў Васіль Сцяпанавіч Войцік, які сядзеў напружана, учапіўшыся ў руль сваёй машыны. Сяржант прапанаваў яму сесці разам з ім, паказваць дарогу. Але ён адмовіўся, адказаўшы, што самому будзе няцяжка весці, ды і ўспомніць маршрут будзе лягчэй. Капітан не стаў перашкаджаць. Яму ўсё ж было шкада гэтага чалавека, яго маці, дачку. Але таксама хацелася, каб Джэк выжыў. «Мабыць, справа не толькі ва ўзросце аўчаркі. Вядома, што сабака можа любога цяпнуць падчас свайго абеду, калі лезці да яго і тым больш адбіраць ежу ці піццё. Няўжо маці Войціка гэтага не ведала? А можа, прычына ў чымсьці іншым? Ці сапраўды сабака ашалеў? Нічога, Ксенафонтаў разбярэцца...» Корань спецыяльна ўзяў з сабою сяржанта-кінолага.

Павярнуўшыся да свайго маладзейшага калегі, капітан у некалькіх словах пазнаёміў яго з сітуацыяй, у якой ім неабходна было разабрацца.

* * *

Войцік ледзь не прапусціў, як падалося яму, «той самы паварот», пра які адразу паведаміў капітану. Машына з'ехала на правы бок і апынулася ў невялікім бярэзніку.

Маладыя танкаствольныя бярозкі, нібы вясёлыя сястрычкі, ціха шапацелі дробнымі зялёнымі лісточкамі, перашэптваючыся паміж сабою пра нешта сваё, дзявочае. А некалі шчодрае сонца лашчыла іх рэдкімі промнямі, саграваючы апошнім летнім цяплом.

Праехаўшы яшчэ некалькі метраў, «форд» спыніўся каля паваленай старой бярозы. «Божа, якая прыгажосць!» — падумаў Корань, выбраўшыся з машыны. Ён з дзяцінства любіў бярозавы гай каля плошчы Бангалор. Узімку там заўсёды была пракладзена лыжня, і Пятро Фёдаравіч разам з сынам любіў прайсціся на лыжах вакол ляска, які, здавалася, выпраменьваў нейкае дзіўнае святло, калі бярозавая бель злівалася з беллю снежнай... «Дзіўна, — думаў ён зараз, — што на фоне такой ляснной прыгажосці магла адбыцца якая-небудзь трагедыя».

Войцік выйшаў з машыны і адразу накіраваўся да старой бярозы. Беластволая прыгажуня ляжала на зямлі, агаліўшы тоўстае чорнае карэнне. Яна была падобна на хворага старога чалавека на зыходзе жыцця, якому ўжо нічога не можа дапамагчы...

— Тут!

— Вы не памыляецеся? — Корань уважліва зірнуў на Войціка.

Войцік не адказаў. Ён падбег да карнявішча, прысеў і ўтаропіў вочы долу.

На зямлі нікога не было.

Капітан уважліва сачыў за ім. «Цікава, чаму ён замёр? Быццам штосьці ўбачыў там!»

Корань падышоў, прысеў побач. І адразу заўважыў: на высокай траве, пасыпанай бярозавымі пажаўцелымі лісточкамі-залатоўкамі, сям-там цямнелі рэдкія плямы. Пятро Фёдаравіч зразумеў: гэта былі плямы засохлай крыві... Адразу за бярозай трава была прымята. Тут плямы сям-там зліваліся ў невялікія бурыя палосы: «Відавочна, кагосьці валаклі... А куды?» — думкі ў галаве капітана, як заўсёды, утваралі лагічны ланцужок. Корань прайшоў, уважліва ўзіраючыся, далей і раптам убачыў дзве абсалютна роўныя палоскі — сляды ад воза.

# Частка VI

Вясковая дарога шмат чаго пабачыла на сваім вяку. Яна вялікай стужкай бегла-вілася пасярод прыгожага лугу, на якім, як на палатне, ствараючы свой цудоўны пейзаж, невядомы майстар выкарыстаў усю стракатую жнівеньскую палітру: кветкі казяльца, сумніку, канюшыны, зверабою, а таксама іншыя прыродныя дарункі. А які пах зыходзіў ад гэтага разнатраўя! Здавалася, такі водар можна было піць з вялікаю асалодаю, як боскі нектар...

Сярод зялёнай муравы стаяла цялушка, лянiва жуючы сваю жвачку. Другая ляжала ў цяньку пад невялікай бярозкай. Наводдалек пасліся дзве каровы. Часам яны адрываліся ад травы, падымалі галовы, і тады на ўсю ваколіцу чулася іх незадаволенае «му-у-у». Шмат аваднёў вілася каля іх у гэты спякотны жнівеньскі дзень, і цялушкі, і каровы шчоўкалі хвастамі, як пугамі, адганяючы іх.

Якраз на тым месцы, дзе дарога агінала старыя могілкі, на ёй паказаўся воз, у які быў запрэжаны гняды конь. У каня былі тыя ж праблемы з аваднямі, што і ў кароў, таму яго хвост, як памяло, разганяў насякомых. Гняды час ад часу трос галавою, таму што кусачыя зумкары пікіравалі і на яго вочы. Нетаропка конь набліжаўся да павароту за могілкамі.

Чалавеку, які сядзеў на возе з лейцамі ў руках, на выгляд было гадоў за пяцьдзясят. Твар худы, з добра акрэсленымі скуламі, прыгожым, з ямачкай, падбародкам, прамым тонкім носам, шырокім лбом, блакітным, як неба, вачыма — такі партрэт намаляваў бы мастак, беручыся за працу. Нягледзячы на спякотнае надвор'е, апрануты наш герой быў зусім не па-летняму: шырокія цёмна-сінія штаны, кірзавыя боты, чорны заношаны пінжак, з-пад якога была відаць светлая, у карычневую палоску кашуля. На галаве — старая шэрая кепка. З-пад яе выбіваліся пасмы чорных, з сівізною, валасоў. Хударлявасць ягонага твару ніяк не спалучалася з шырокімі плячыма і дужымі рукамі, якія ніколі не адлыньвалі ад сялянскай працы.

Іван Данілавіч Собаль ехаў у лес па дровы. Побач на возе ляжала бензапіла (калгасная — выцаганіў у агранома, яго прыяцеля, хаця на ўсялякі выпадак захапіў і звычайную), а таксама сякера і вяроўка.

Іван Собаль нарадзіўся адразу пасля вайны і таму адчуў на сабе ўсе цяжкасці таго галоднага часу. У яго бацькі было пяцёра дзяцей, якія даволі рана навучыліся працаваць на зямлі, рана зразумелі, якім потам і крывёю даецца кавалак хлеба. Яго двое сыноў абралі сабе розныя шляхі: старэйшы, Мікалай, падаўся ў Мінск. Скончыўшы інстытут, застаўся ў горадзе, ажаніўся. Малодшы, Даніла, якому толькі споўнілася васямнаццаць, атрымаў «белы білет» па зроку і рыхтаваўся ва ўніверсітэт на агранома. Іван Данілавіч спадзяваўся, што хоць ён застанецца ў вёсцы, пры бацьку. «Не хочуць маладыя жыць з бацькамі ў вёсцы... Вядома ж, не за горкія калгасныя капейкі ім выкладвацца! Таму і шукаюць лепшай долі. А хто ж на зямлі працаваць будзе, калі не яны? А мужыкі ў вёсцы... Эх, што ім патрэбна? П'янкі ды гулянкі — і больш нічога...» — так разважаў Іван Данілавіч, час ад часу панукаючы каня.

Собаль уздыхнуў, успомніўшы жонку-нябожчыцу. Нарадзіўшы Данілу, сама адышла ў лепшы свет. Што б ён рабіў, каб не Кацярына, родная сястра яго Марыі, якая жыла па суседстве? Мала таго, што ў яе самой тады была маленькая дачка, яна фактычна стала другой маці яго сына. Дапамагала чым магла. Дваіх дзяцей падняць, ды плюс яшчэ і сваё, — гэта далёка не кожны здольны зрабіць! Іван быў вельмі ўдзячны Кацярыне і за гэты час вельмі прывязаўся да яе. Усё жыццё жыла адна, не выйшла замуж, хаця да яе заляцалася шмат хлопцаў, ды яшчэ якіх! А дзяўчына яна была хоць куды — прыгожая, чарнабровая, ганарлівая, бы каралева якая! Але ніколі нікому не гаварыла, хто прыходзіўся бацькам яе дачцэ. Мясцовыя кумушкі любілі смакаваць гэтую тэму, але праўды ніхто не ведаў. Гаварылі толькі, што Кацярына праз колькі год пасля заканчэння школы паехала ў Мінск — паступаць у вучылішча на фельчара. Скончыла. У горадзе працы не шукала, вярнулася

дадому, да старой хворай маці. Але не толькі з дыпломам — прывезла двухгадовую дачку. Калі маці памерла, засталася ў хаце адна з дзіцем.

* * *

Іван Данілавіч дастаў з кішэні насоўку, выцер успацелыя лоб, патыліцу.

— От, пекла якое сёння! — паскардзіўся ён нябачнаму субяседніку. — Но, Сярко, халера цябе бяры!

Ён сцебануў лейцамі каня, каб той рухаўся хутчэй, хаця было відаць, як таму прыходзілася цяжка на гэтай летняй спёцы. Неабходна было знайсці ваду, каб спатоліць смагу самому і напаіць каня.

Адразу за шашою пачыналася суседняя вёска. Ля ваколіцы стаяў калодзеж. Собаль спыніў каня каля яго, прывязаў да плота, а сам зайшоў на двор першай ад дарогі хаты. Вароты былі расчыненыя. Палову двара займаў калгасны «ЗІЛ», у які якраз садзіўся гаспадар хаты, малады чарнявы мужчына.

— Прывітанне, Данілавіч! Якім ветрам да нас?

— І ты здароў будзь, Сяржук! Ды вось па дровы еду ў лес. Дай вядра каня напаіць!

— Вазьмі каля ганка.

— Дзякуй! А ты на поле?

— Куды ж яшчэ ў такую пару?

Собаль узяў вядро і накіраваўся з ім да калодзежа. «ЗІЛ» выехаў з двара і, падняўшы цэлае воблака пылу, знік за паваротам дарогі. Іван Данілавіч напіўся сам, наліў у вядро каню. Чакаючы, пакуль той спатоліць смагу, прысеў на лавачку каля плота, дастаў пачак «Прымы», закурыў. Хутка павінен быў падысці сын Даніла. Нарэшце на вуліцы паказаўся светлавалосы хлопец у камбінезоне. Убачыў Собаля, вінавата ўсміхнуўся.

— Прабач, тата! На калгасным двары затрымалі — у час уборачнай ім каб усе машыны былі на хаду! А дзе «запцацкі»

для «газонаў» дастаць? Хіба толькі Васільевіч са свайго «Жыгуля» здыме!

Даніла зноў усміхнуўся.

— Слухай, Даніла, я колькі разоў табе гаварыў — трэба ў механізатары ісці, а ты ў аграномы сабраўся! Хаця ў свае гады разважаеш як дарослы!

— А які я? Ці не дарослы? Васямнаццаць жа ёсць!

Нягледзячы на свой малады ўзрост, Даніла Собаль дапамагаў на калгасным двары механікам у гаражы, паколькі добра разбіраўся ў тэхніцы. Васільевіч, сваяк Собаляў, узяў на працу здатнага да машын і трактароў юнака, хаця, як гавораць, спуску таму не даваў.

— Давай, дарослы, вазьмі вядро і занясі на гэты двор, — з усмешкаю сказаў Собаль сыну.

— Да Сержука?

— Да яго. І паехалі хутчэй! Сонца ўжо высока...

* * *

Воз нетаропка рухаўся па шашы. Справа, адразу за вёскаю, шалясцеў дробнымі зялёнымі лісточкамі бярэзнік

Вось і паварот. Калі спусціцца ў лагчыну, праехаць якую сотню метраў, будзе поле, за якім пачынаецца змешаны лес — мэта сённяшняга падарожжа.

Раптам ранішнюю цішыню разарваў плач. Так звычайна плача дзіця — жаласліва і разам з тым пранізліва. Здавалася нават, што ўсё навокал застыла ў маўклівым чаканні: сцішыўся лес, вецер замёр, прыслухоўваючыся да гэтых дзіўных, незвычайных для яго гукаў.

Плач ішоў якраз з глыбіні бярозавага гаю.

— Што гэта? — спытаў Даніла, які сядзеў за бацькам. — Можа, дзіця? Але адкуль яно ў лесе?

— Зараз убачым.

Собаль накіраваў каня ўніз. Праз пару метраў воз спыніўся. Зноў пачуўся плач, ужо прыглушаны. Прыгажуні бярозы

паўсталі вакол, і на гэтым бела-чорным фоне нічога нельга было ўбачыць. Іван Данілавіч падышоў да старой паваленай бярозы і раптам убачыў распрасцёртага на траве вялікага сабаку, які ціха стагнаў. З галавы і шыі яго ішла кроў, барвовымі плямамі адліваючы на сонцы. Крыві было няшмат, але Собаль раптам сэрцам адчуў, як балюча зараз гэтай жывой істоце, як пакутуе кожная клетачка яе цела.

— Глядзі, тата, гэта ж аўчарка! — Даніла стаяў побач. — І хто яго так, а?

— Злыдзень нейкі! Няўжо нармальны чалавек будзе калечыць сабаку? — Собаль сціснуў зубы ад злосці. — Эх, сустрэць бы яго... Я б яму паказаў!

— Слухай, баця, што будзем рабіць?

— Пачакай. Дай падумаць.

Іван Данілавіч адчуў, як сэрца сцялася ад болю: як так можна рабіць? Няўжо не мае межаў людская несправядлівасць? Собаль падышоў да аўчаркі, прысеў перад ёю, уважліва агледзеў галаву сабакі. Кавалак левага вуха быў нібыта адсечаны чымсьці.

— Напэўна, палілі з ружжа, сволачы! Бачыш, што з вухам? — Іван Данілавіч асцярожна правёў па жоўта-чорным баку сабакі.

Даніла прысеў побач.

— Глянь, ён плача!

І сапраўды, з цёмных вачэй аўчаркі каціліся слёзы. Джэк глядзеў на людзей, нібы просячы іх дапамогі. Хрыпы вырываліся з горла сабакі. Дыханне перарывалася.

— І вочы, як у чалавека, бач ты! — Собаль адчуў у горле нейкі камок.

— Трэба яго да цёткі Каці — яна ж доктар! А, баця?

Іван Данілавіч не вельмі разбіраўся ў паляўнічых справах. Але разумеў, што калі стралялі буйным дробам, то шансаў у аўчаркі мала, а калі не, то... «Каб куляй, то сабака, напэўна, адразу б сканаў. А тут, Бог дасць, выжыве...» — ён уздыхнуў.

— Вось так, браце мой, пацярпі, прыдумаем што-небудзь», — звярнуўся Собаль да сабакі. Той, відаць, зразумеў, што яму ліха не зробяць — цярпеў, пакуль Іван Данілавіч асцярожна аглядаў ягоную галаву. Раптам аўчарка прыўзняла галаву і лізнула руку Собаля.

— Ляжы, ляжы, — усміхнуўся той. — Глядзі ж ты, усё разумее, а! Ну і дзе ж твае баявыя раны?

Ён дакрануўся да шыі аўчаркі, і тая страпянулася.

— Глядзі, баця, можа ўкусіць! Не чапай, — Даніла ўстаў.

— Падгані, сынок, воз сюды. Толькі асцярожна.

Даніла выканаў загад бацькі. Собаль зняў з воза і рассцяліў на траве стары брызентавы плашч, які звычайна браў з сабою ад дажджу.

— Ну, цярпі, браце! — сказаў сабаку, нахіліўся, акуратна падхапіў яго і паклаў на брызент. Аўчар застагнаў — зусім як чалавек, і прыглушаны рык вырваўся з ягонага горла.

— Спакойна, спакойна, — ці то сабаку, ці то сабе сказаў Собаль.

Разам з Данілам перанеслі аўчарку на воз.

— Ну што, сын, на сёння, па-мойму, дровы адмяняюцца! — Іван Данілавіч узяў лейцы. — Но, Сярко!

Воз нетаропка пачаў аддаляцца.

## Частка VII

Старое замчышча і возера, паверхня якога блішчэла, як люстра пад апошнімі промнямі, амаль патанулі ў вячэрнім сутонні. Рэшткі сцен і нават некалькі ўцалелых байніц-машыкуляў надавалі гэтай мясціне нейкую таямніча-чорную панурасць. А вогнішча недалёка ад былой брамы ажыўляла змрочны пейзаж. Здавалася, што зараз з варотаў панясуцца на конях узброеныя рыцары, а над галоўнай вежай-данжонам успыхне, як полымя, сцяг феадала — гаспадара замка.

Але ўсе гэтыя гатычныя летуценні развейвалі светлыя плямы каля вогнішча. Калі ўважліва прыглядзецца да іх, то можна было пазнаць тры сучасныя турыстычныя палаткі колеру «вырві вока», якія, нібы прывіды, зіхцелі ў паўзмроку. Каля вогнішча сядзела некалькі маладых людзей і дзяўчат. Адзін з іх перабіраў струны гітары. Гэта быў Андрэй Война. Моладзь нястройнымі галасамі спявала:

*Едкий дым создаёт уют,*
*Искры тлеют и гаснут сами.*
*Пять ребят о любви поют*
*Чуть охрипшими голосами...*

— Цудоўная старая песня, душэўная... Яе яшчэ мой бацька спяваў, — уздыхнуўшы прамовіў Андрэй. — Вось і вы вывучылі яе. Нездарма ўсё лепшае народ заўсёды перадаваў з пакалення ў пакаленне. А то зараз на танцы можна не хадзіць — адны толькі «умца-умца» цэлую ноч.

— Ну, не кажыце, Андрэй Васільевіч, — не згадзілася з кіраўніком чарнявая дзяўчына, якая толькі што натхнёна спявала разам з усімі. — А з хлопцамі дзе знаёміцца, а?

Усе засмяяліся.

— Ведаеш, Таня, з хлопцамі табе пазнаёміцца можна, памойму, вельмі лёгка. Усе будуць тваімі — такая прыгажуня!

Нават у надыходзячай цемры было бачна, як дзяўчына зардзелася і з удзячнасцю паглядзела на Война.

— Андрэй Васільевіч, слухай, ты якраз пра танцы ўспамінаў, — падаў голас мужчына з правільнымі рысамі твару, на выгляд, такога ж узросту, як Война, — а калі мы з табой для моладзі выхадны абвесцім?

— Калі квадрат пройдзем, Аляксандр Віктаравіч. А я на гэты дзень у Мінск скокну. У мяне справы там ёсць, — Андрэй уважліва паглядзеў на субяседніка, і ў вачах яго мільганула ледзь прыкметная хітрынка...

* * *

Электрычка падыходзіла да перона. Людзі нетаропка рыхтаваліся да таго, каб уліцца ў вялікую плынь мінчан, якая шырокай ракой разлівалася па тратуарах вуліц, парках, скверах, бульварах і пры гэтым знаходзілася ў пастаянным руху. Горад жыў, дыхаў, як чалавек — вялікі і прыгожы, як знешне, так і духоўна. Па ўсім было відаць, як мінчане любяць і берагуць свой родны горад: які ён чысты, дагледжаны, сапраўдная еўрапейская сталіца... Так думаў Андрэй, перасякаючы Прывакзальную плошчу. Ён са сваёй нецярплівасцю не мог чакаць і таму вырашыў адразу зайсці ў музей, да Іны.

«Як там мая Даратэя? — усю дарогу думаў ён. — А калі я дарэмна еду?»

Сеў у «соты» аўтобус, перавёў дух. «Так быў заняты, што нават некалькі дзён не тэлефанаваў да сваіх, — міжволі ўспомніў Андрэй, адчуўшы, як стала сорамна. — Нічога, потым заскочу дадому».

Гэтая думка супакоіла яго. Але што скажа Іна, калі ўбачыць яго, запыленага, у штармоўцы — не такім, якім быў у музеі? «Не, Якубе, трэба было ўсё ж спярша дадому забегчы!» — мільганула думка.

Вось і музей. Андрэй узляцеў па прыступках і раптам спыніўся: ён жа не ведае яе прозвішча! «Разбяруся на месцы!» — вырашыў Войцік. Ён рашуча расчыніў дзверы і ўвайшоў.

Народу на першым паверсе было мала. Каля касы стаяла некалькі чалавек і — о ўдача! — тая самая жанчына, што падышла, калі яны з Інаю стаялі на лесвіцы.

— Добры дзень! — Андрэй наблізіўся да яе.

Жанчына паглядзела на яго і, вядома ж, спачатку не пазнала.

— Добры дзень, малады чалавек! Чым магу дапамагчы? — добразычліва спытала яна.

— Скажыце, а як я магу ўбачыць Іну... Іванаўну? — дадаў Войцік, спадзеючыся, што так жанчына хутчэй успомніць.

— А яе няма, — адразу ж расчаравала яна Андрэя. — Іна Іванаўна ў адпачынку.

— А як знайсці яе ў Мінску, не падкажаце? — Войцік ухапіўся за апошнюю саломінку.

— Я думала, што вам самому вядома як. Я ўспомніла: вы так міла шчабяталі тады на лесвіцы, — жанчына ўсміхнулася. — Прабачце, гэта, вядома, не мая справа... Але хто яна вам?

У вачах яе добра чыталася цікаўнасць.

«Мабыць, аматар свежых плётак», — падумаў Андрэй.

— Мы з Інаю вучыліся калісьці разам, — ён раптам адчуў, як расце нецярпенне, але трымаў сябе ў руках.

— А, — неяк расчаравана працягнула яна і дадала: — Зразумела...

Агеньчык цікаўнасці ў яе вачах раптам згас.

— Да пабачэння! — Андрэй павярнуўся, каб пайсці, але за спінаю пачуў:

— Успомніла, малады чалавек! Іна гаварыла, што збіраецца да маці ў вёску.

Андрэю гэта нічога не сказала. Ён сціпла падзякаваў і пайшоў.

* * *

Андрэй расчыніў дзверы, увайшоў у кватэру. Паставіў сумку, скінуў штармоўку. І адразу ўбачыў маці. Яна амаль нячутна падышла да яго. Андрэй уздрыгнуў ад нечаканасці. Звычайна матуля яшчэ з кухні ці залы пытаецца, хто прыйшоў, — гучна, весела. А тут падышла, не гаворачы ні слова. Андрэй зразумеў: штосьці здарылася.

— Прывітанне, мама, — падышоў, чмокнуў у шчаку, як заўсёды. — Ты нейкая не такая...

— Прывітанне, сын. Ты чамусьці раней...

— Я вырваўся на дзень. Заўтра назад, — нецярпліва адказаў Андрэй. — Штосьці не так? Што здарылася?

Ён азірнуўся.

— А дзе Джэк? Чаму не сустракае? Лана выгульвае? — Андрэй міжволі адчуваў, як расце нейкая неўтаймаваная трывога.

— Лана паехала дадому сёння, Павел забраў яе.

— А бабуля? Ты нешта не дагаворваеш? — Андрэй зразумеў, што амаль крычыць.

Таццяна Яўгенаўна апусціла вочы.

— Бабуля ўжо некалькі дзён у бальніцы. Хацелі адразу яе забраць, але ўрачы забаранілі — хочуць паназіраць. Заўтра будзе дома.

— А што здарылася? — Андрэй яшчэ нічога не разумеў.

— Джэк пакусаў яе. Два швы наклалі на руку, — на вачах маці паказаліся слёзы. — А Джэка бацька пасадзіў у машыну і кудысьці павёз...

— Куды павёз, мама? — Андрэй адчуў, як ёкнула сэрца і закружылася галава.

— Ой, не ведаю, сынок... Я баюся...

Яна на хвіліну замаўчала.

— Я бацьку званіла на мабільны нядаўна... Спачатку гаварыў, што зараз у нейкага сябра. Што за сябар? Не разумею... Проста, думаю, хацеў супакоіць мяне. Потым на два дні знік — шукаў Джэка. А самае галоўнае...

Яна паглядзела на сына, нібыта шукала ў яго дапамогі.

— ...бацька ўзяў з сабою стрэльбу...

Свет раптам выбухнуў у вачах Андрэя, разляцеўся на шматлікія асколкі. Ён усё зразумеў: бацька, абураны ўсім, што ўбачыў, раззлаваны, павёз кудысьці Джэка, каб забіць яго...

Заплакала маці. Ён абняў яе за плечы.

— Мама, не плач... Я ўсё зразумеў... Я знайду Джэка...

Памаўчаў.

— Калі ён жывы...

Накінуў куртку. Пацалаваў маці ў шчаку.

— Усё будзе добра.

Выскачыў за дзверы.

На хаду выхапіў мабільны. Набраў бацькаў нумар. Тэлефон спачатку маўчаў. Нарэшце пачуўся голас бацькі.

— Алё! Прывітанне, сын! Як справы?

— Прывітанне, тата! У мяне ўсё нармальна. Я зараз у Мінску. Толькі што быў дома... Тата!..

Голас Андрэя задрыжаў.

— Што з Джэкам?

Бацька замоўк. Потым праз нейкую хвіліну пачуўся яго ціхі голас:

— Калі шчыра, то не ведаю, сынок... Я... вывез яго за горад і... пакінуў там... у лесе...

— А навошта табе стрэльба? Мама сказала... Ты ж не страляў у Джэка? — Андрэй здрыгануўся ад гэтых слоў. Да апошняга моманту ён спадзяваўся, што такога не можа быць.

— Я... не буду хлусіць табе, сын... Я... страляў у Джэка... Але я не бачыў, куды трапіў... Праўда...

«Усё... Гэта канец... Каб бацька прамазаў, прафесіянал, чэмпіён...» — Андрэй горка ўсміхнуўся.

— Я толькі што быў на тым месцы, Андрэй... у тым лесе... Джэк кудысьці знік... Але... — голас бацькі задрыжаў, — ...там была кроў. І сляды ад воза. Джэка хтосьці вывез адтуль... Мабыць, нехта з мясцовых... Думаю, што Джэк паранены...

— Ты дзе цяпер, тата?

— Спачатку быў у міліцыі... А потым аб'ездзіў некалькі вёсак. Слядоў Джэка нідзе няма.

— А чаму ў міліцыі?

— Мне не паверылі. Паехалі са мною ў лес. Потым зрабілі экспертызу. Кроў не чалавека... Сабакі... Джэка...

— Дзе той лес? Я паеду туды і знайду Джэка! Хоць тыдзень буду шукаць! — Андрэй адчуў, як ногі яго падкошваюцца. Прысеў на лаўку ля пад'езда.

— Нікуды не трэба ісці. Давай разам. Ты дзе?

— Каля нашага дома. Чакаю цябе. Давай хутчэй!

...Праз нейкі час сіні «форд» ляцеў да кальцавой.

## Частка VIII

У гэты жнівеньскі дзень на вясковай вуліцы было бязлюдна: поўным ходам ішла ўборачная. Толькі час ад часу праносіліся грузавікі з зернем — адвозілі збожжа на ток, а потым адтуль вярталіся парожнімі.

Хата Собаля стаяла амаль у канцы вёскі, дзе пачыналася дарога ў лес. Адтуль і вярталіся Іван Данілавіч з сынам. Каля зялёнай брамкі прытулілася старая бяроза, якую выкапаў у лесе і пасадзіў тут калісьці яшчэ дзед Собаля. Шмат чаго зведала на сваім вяку гэта прыгожае магутнае дрэва. Яно не толькі радавала вока, але і паіла ўвесну ўсю сям'ю сокам. Заўсёды вяртаючыся дадому, Іван Данілавіч яшчэ здалёк бачыў сваю бярозу. І адразу цяплела на сэрцы, усё дрэннае адыходзіла на другі план.

Кажуць, што дрэвы могуць лячыць чалавека ад розных хвароб. Дастаткова падысці, прытуліцца спінаю і, заплюшчыўшы вочы, падумаць аб нечым добрым, пажадаць сабе здароўя. Іван Данілавіч, вядома, саромеўся такога рытуалу на людзях. Хаця, бываючы ў лесе, часам, стомлены, рабіў гэтую «працэдуру» — боль і нават стому як рукою здымала... Вось па маладосці яму было што ўспомніць. Па бацькавай лініі ўсе мужчыны ў сям'і былі дужымі. І Іван Данілавіч не выключэнне...

Уся вёска ведала пра той выпадак. Летась Собаль, як і сёння, аднойчы вяртаўся з лесу. І ў нізінцы раптам убачыў: на звілістай лясной дарозе, пасярод асенняй гразюкі, якую не было магчымасці аб'ехаць, пагразшы «па самыя вушы», сядзеў «Запарожац» мясцовага агранома. Прычым сядзеў надзейна — ні туды ні сюды нават не зварухнуцца. Аграном — за рулём. Але вылезці не можа: гразі па калена. Іван Данілавіч, на шчасце, меў пры сабе сякеру: рабіў засечкі на дрэвах, што рыхтаваў на дровы. Ссек ён тады невялікую, але даволі трывалую на выгляд сасонку, падсунуў пад машыну. Крыкнуў аграному: «Заводзь!» — і прыўзняў гэты «транспарт» над паверхняй... Любы аўтамабіліст скажа, што ў такім становішчы нельга заводзіць

машыну. Але аграном быў настолькі напалоханы, што адразу ж паслухаўся. А Собаль моцна падштурхнуў бервяном «Запарожца». Той вырваўся і, праехаўшы некалькі метраў, спыніўся, весела завуркатаў, як сыты кот. А аграном пасля таго здарэння стаў ледзь не лепшым сябрам нашага героя. Якраз сёння Івану Данілавічу ўдалося ўзяць у леташняга бедака бензапілу, якая, на жаль, не спатрэбілася...

Здалёк убачыўшы сваю бярозу, Собаль падумаў, што чалавек усё ж вельмі мала ведае пра таямнічыя сілы прыроды, у адрозненне ад нашых продкаў. А дзе гэтыя сакрэты зараз? Чалавек цалкам залежыць ад прыроды, хоць і лічыць сябе яе гаспадаром. «Цікава, а дзе быў гэты «цар прыроды, калі рвануў Чарнобыль? — падумалася Собалю. — Чалавек усё ж такая слабая істота...»

Іван Данілавіч ужо набліжаўся да сваёй бярозы. Раптам бразнула суседская брамка, і з варот выйшаў стары з двума пустымі вёдрамі ў руках. Тыя весела звінелі на ўсю ваколіцу. Дзядок перайшоў вуліцу, яшчэ не заўважаючы Івана Данілавіча з яго возам. Сеў на лаўку, закурыў. Раз-пораз сплёўваў у шэры пыл, мружачыся на сонцы. Убачыў воз, паднёс далонь да лба. Потым пазнаў Собаля, усміхнуўся.

— Здароў будзь, Данілавіч! Нешта ты рана з лесу едзеш. І воз пусты. Там што, дрэў не засталося, га?

Дзядок з задавальненнем зацягнуўся папяросай. Даніла тым часам пайшоў адчыняць вароты.

— Здарова, Кузьміч! Табе б толькі свае цыдулкі смаліць ды лясы тачыць! Ты як сарока якая! — Собаль хітра паглядзеў на дзеда. — Даў бы і мне перадыхнуць колькі часу, можа, і сам бы расказаў, што дзіўнага ў нас бывае! Садовая твая галава! Хто ж пераходзіць вуліцу перад носам з пустымі вёдрамі!

Кузьміч не пакрыўдзіўся на суседа. Яны даўно прызвычаіліся да такіх сяброўскіх кпінаў. Але не раз прыходзілі на дапамогу па-суседску і на сямейныя святы звычайна запрашалі адзін аднаго. Вось такая склалася сялянская ідылія.

— А ты што, баба, Данілавіч, каб у розныя забабоны верыць? І што такое дзіўнае з табою сёння было? Хіба толькі гаршчок з золатам знайшоў у якім-небудзь дупле?

Кузьміч хітра прыжмурыў адно вока.

— Лепш чым золата. Зірні сюды, — паклікаў Собаль суседа.

Той падышоў да воза і ўбачыў сабаку, які з заплюшчанымі вачыма ляжаў на брызенце.

— Бач ты! — толькі і змог сказаць Кузьміч. — Вось гэта ўлоў! І за што ты яго, а?

— А з чаго гэта ты ўзяў, што гэта я яго? Па сабаку з ружжа стралялі! — з запалам адказаў Собаль. — А дзе ты бачыў у мяне стрэльбу, га?

— Дык ён нежывы, па-мойму! — дзед ніяк не мог супакоіцца. — І хто гэта мог яго, а? Трэба да Кацярыны ісці. Яна ж фершал!

— Фельчар, а не «фершал», Кузьміч! — перадражніў старога Собаль. — А дарэчы, дзе яна? Не бачыў часам?

— У сваім медпункце, дзе ж яшчэ ёй быць! Вось звяры, а!

Кузьміч вылаяўся, узяў чарговую «цыдулку», закурыў.

Джэк, пачуўшы словы Кузьміча, расплюшчыў адно вока і слаба вільнуў хвастом.

— Ой, дзякуй Богу, жывы! Нічога, Кацярына нават мёртвага на ногі паставіць!

Тым часам падышоў Даніла.

— Гатова, заязджай!

Воз пакаціўся на двор.

— Даніла, — звярнуўся Собаль да сына. — Бяжы да цёткі Каці ў медпункт. Скажы, каб хутка ішла сюды. Давай. Адна нага тут, другая там! Добра?

— Хутка буду! — Даніла пабег на вуліцу.

* * *

Пакуль Іван Данілавіч паіў каня, на двор хуткаю хадою ўвайшла Кацярына — чарнявая жанчына з прывабнымі рысамі твару, у жоўтай майцы з кароткімі рукавамі, светлай доўгай спадніцы і хусткай у руках. «Дзякуй Богу, што халат белы свой скінула, а то людзі падумаюць, што нешта здарылася. Чым менш будуць ведаць — тым лепш!» — падумаў Собаль. За Кацярынаю ішоў Даніла.

— Мне Даніла ўсё расказаў. Дзе наш паранены? — ці то з жартам, ці то ўсур'ёз спытала яна.

Потым падышла да воза.

— Зразумела. Патрымайце сабаку, каб не пакусаў! — яна пачакала, пакуль мужчыны займуць свае месцы, і пачала агляд.

Праз некаторы час Кацярына сказала:

— Жыць будзе. Толькі трэба дроб падаставаць з галавы, шыі і лапы. Я хутка на пункт па медыкаменты, а вы падрыхтуйце стол на двары. Вядома, можна было б адвезці сабаку на пункт, але ў мяне не ветлячэбніца. А да горада далёка. Ён слабы, можа не дацягнуць. Увогуле ніколі не думала, што сабак лячыць буду.

Кацярына выцерла хусткаю ўспацелы лоб і ўпершыню ўсміхнулася, паказаўшы белыя прыгожыя зубы.

— Прабач, Ваня, я нават не павіталася — стамілася, пакуль бегла! — яна зірнула на Собаля.

— Бачыш, якія сёння дровы, Кацюша? — Іван Данілавіч прысеў на прызбу. — І хто па ім паліў з ружжа? Рукі б паабрываў злыдню!

Ён успомніў «дзіцячы» плач у бярозавым гаі і павёў плячыма, нібыта ад холаду.

— Даніла, — раптам успомніла Кацярына. — Я сама не паспею, збегай да мяне, скажы Іне, каб прынесла навакаін у ампулах і некалькі шпрыцоў.

Кузьміч забыўся на свае вёдры і пазіраў з-за плота цікаўнымі вачыма. Нарэшце не вытрымаў, заскочыў на двор.

— Мабыць, і я на што згаджуся, а, моладзь?

— Ты, Кузьміч, лепш нікому не гавары, што тут бачыў. А то ўся вёска зараз будзе ў нас. Потым няхай языкамі мелюць, добра? — Собаль звярнуўся да суседа.

— Добра, Данілавіч. Ты ж мяне ведаеш!

На двор тым часам уляцелі Даніла і Іна. Так, тая самая... Вы, паважаныя чытачы, не памыліліся. Гэта была наша Даратэя.

* * *

Сонца, як заўсёды, рыхтавалася сысці за гарызонт, каб адпачыць і даць магчымасць выспацца людзям, што правялі дзень у працы, каб хапіла моцы на дзень наступны.

У стопцы, каля печкі, у якой весела спявала полымя і трашчалі паленцы, на старым брызентавым плашчы ляжаў Джэк. Яго галава, шыя, тулава і адна лапа былі ў бінтах. Вочы заплюшчаныя. Сабака спаў пасля наркозу. Кацярына разам з Іванам Данілавічам сядзелі ля печы і глядзелі на агонь. Даніла качаргою час ад часу варушыў дровы, і тады іскры ляцелі ва ўсе бакі, а чырвона-шызыя вугалькі са звонам сыпаліся на металічную пласціну пад дзверцаю. Іна сядзела каля маці і, паклаўшы галаву ёй на плячо, узіралася ў полымя, слухаючы адвечную яго песню.

— Слухай, матулечка, а ты ў мяне такая смелая, — адарваўшы галаву ад пляча маці, Іна зірнула той у вочы. — Такая ў цябе прафесія мужная! Не тое што ў мяне.

— Кожны выбірае свой шлях сам, гаварылі калісьці. Бога няма... А ён ёсць! І ёсць пакуты, якія ты павінен прайсці, каб застацца чалавекам... І не кожны гэта можа вынесці. Нават, як ты сказала, дачушка, чалавек мужнай прафесіі, — Кацярына глядзела на агонь, які, здавалася супакойваў яе, ачышчаў душу...

— А ты ж вунь столькі вынесла, Кацюша. І дзяцей дапамагла падняць, людзям якую карысць прыносіш! — Собаль паглядзеў

на яе і раптам усміхнуўся, паказаў на Джэка: — Цяпер вось і сабакам...

Кацярына ўсміхнулася.

— Бог дае чалавеку столькі, колькі ён можа адужаць. Але, — яна абвяла позіркам усіх, — ва ўсім раўнавага ў жыцці ёсць. Ты атрымаў нармальную прафесію, грошы сякія-такія маеш. Кар'ера угару ідзе — але... ніякага асабістага жыцця.

Яна горка ўсміхнулася.

— Кацярына, ты ж ведаеш: мы — адна сям'я. Чаго табе яшчэ трэба, га? — Собаль здзіўлена паглядзеў на яе.

— Нічога ты не разумееш, Ваня. Чаго бабе ў жыцці не стае? Мужыка, дзяцей, дома, і каб у ім, у гэтым доме, шчасце жыло ды не пераводзілася.

— А якое яно, тваё шчасце?

— Нічога вам, мужыкам, і невядома. Жыццё пражыў, а нічога не зразумеў, Іван Данілавіч... — з горкаю іроніяй прамовіла, гледзячы на полымя, Кацярына.

— Ой, мама, а я ж сёння свой крыжык згубіла! Той самы, бацькаў падарунак табе, памятаеш? — Іна дакранулася да шыі, на якой зіхцеў-пераліваўся залаты ланцужок.

— Дрэнны гэта знак, дачушка мая. Але нічога, дасць Бог, знойдзем. Усё бывае. Вось і гэты гаротнік, — яна паглядзела на сабаку, — пэўна, нездарма сюды трапіў, таксама штосьці нарабіў, раз у яго нехта пальнуў. Гэта як трэба ненавідзець жывую істоту, каб у яе кулю пусціць!

— Дык добра, што дроб быў на птушку, а не на буйнога звера, а то б сканаў аўчар гэты адразу, — заўважыў Іван Данілавіч.

— І ўсё роўна дараваць такому чалавеку нельга! Я так лічу! — рашуча сказала Іна. — Я ніколі не выйшла б замуж за чалавека, калі б даведалася, што ён ці яго блізкія забіваюць жывёл і птушак, няхай бы і дзеля палявання! Паляванне — гэта тое ж забойства. Толькі ўзаконенае!

Іна ўскочыла. Вочы яе палалі.

— Бедненькі ты мой! — яна прысела каля Джэка, правяла рукою па яго боку. — І хто ж цябе так, а?

Даніла сказаў:

— А калі гэты чалавек даведаецца, дзе сабака і прыйдзе да нас, мы яму аўчарку не аддамо! Няхай лепш у нас жыве. А таму...

Ён махнуў рукою.

— ...Так яму і трэба, дурню такому!

— Давайце лепш спаць сёння. Усім хапіла напоўніцу! — Собаль устаў. — Ужо позна.

— Нічога, заўтра ўся вёска ўжо будзе ведаць пра сабаку. Кузьміч пастараецца, — Кацярына таксама ўстала. — Іна, пойдзем ужо.

— А я тут пакуль пабуду. Хутка ў печы дагарыць — тады і я спаць. А так і сабаку цёпла будзе, і нам спакайней, — сказаў Даніла і, не ўстаючы, паварушыў вугольчыкі.

Усе, акрамя яго, развітаўшыся да заўтра, выйшлі ў ноч.

## Частка IX

Мінула некалькі дзён. Нягледзячы на цёплае летняе надвор'е, людзі ведалі, што не за гарамі восеньскія халодныя дажджы, і спяшаліся атрымаць асалоду ад кожнага жнівеньскага дня.

На лавачцы каля плота сядзелі Собаль з Кузьмічом і курылі.

— Што, Данілавіч, — перарваў маўчанне дзед, — на тваім падворку можна палявы шпіталь адкрываць. Бач, як аператыўна ўсё ў вас. Нават сабака можа стаць чалавекам, хоць на час. Галоўнае...

Кузьміч глыбока зацягнуўся.

— ...каб не наадварот. Хаця, бывае, сабакі лепшыя за некаторых людзей.

Ён задумаўся. Твар стаў сур'ёзным. Собаль рэдка бачыў Кузьміча такім.

— Я, от, тады яшчэ малым быў. У сорак трэцім, па-мойму. Партызаны ахфіцэра нямецкага кокнулі і кагосьці там яшчэ.

Вось... І нашага аднаго падстрэлілі. Калі адступалі ў лес, пакінулі партызана гэтага ў Піменавай хаце. Ну, Пімен, той, што... шасцёра ў яго малых было. Вось... Нейкая гніда данесла ў паліцыю. Пімена, жонку яго... разам з дзецьмі, і таго партызана — усіх загналі ў хату... Ну, і падпалілі, гады! Як людзі гэтыя крычалі... Крык той, лямант і зараз чую, хоць столькі мінула... Тыя, двухногія, няўжо яны людзі, га? Сабакі! Нелюдзі!

Кузьміч апусціў галаву. Нервова раскрыў пачак «Прымы». Некалькі цыгарэт паляцела на пясок. Дзед вылаяўся. Падняў «пnative»рыміны».

— Дзядзька Ваня! Паглядзіце на нашага госця! Бачыце, ачуняў ужо! — пачуўся голас Іны.

— Я ж гаварыў табе, Данілавіч — зажыве, як на сабаку! — пераняў адразу тэму Кузьміч, убачыўшы, як аўчарка ідзе па двары да дзяўчыны. Бінтоў на ім ужо не было. — Бач ты, які разумны!

Тым часам Іна наліла нечага ў міску, і Джэк накіраваўся да ежы.

— Вось і есці пачаў нармальна, — падхапіў Собаль. — Значыць, неўзабаве паправіцца.

Іван Данілавіч быў задаволены тым, што сабака ачуняў. «І дзеля чаго нам Бог даў яго?» — разважаў ён, успамінаючы словы Кацярыны. Пахаваўшы жонку, ён праз нейкі час зразумеў, што, акрамя сыноў і яе з дачкою, нікога з родных у яго няма. Бацькі даволі рана памерлі. Кацярына з яго Марыяй былі з дзетдома пасляваеннага «гатунку» — цудам знайшлі адна адну. І так усё жыццё раслі як два дзікія дрэўцы, дорачы пяшчоту, якой самім калісьці не хапіла, сваім родным. Собаль адчуваў, што Кацярына была для яго, напэўна, больш чым сястра жонкі, але столькі год баяўся прызнацца ў гэтым не толькі ёй, але нават сабе... Калісь у метрыцы Іны Кацярына запісала ў графе «Імя па бацьку» «Іванаўна», хаця імя сапраўднага бацькі яе дачкі, відавочна, было іншым. Собаль ведаў, што маці таго «мужа» яе забараніла яму сустракацца з Кацярынаю і, калі нарадзілася Іна, не прыняла яе з дачкою. Таму імя па бацьку дзяўчыны

было яго — Іванаўна. Іна была яго дачкою... Хаця называла Собаля «дзядзька Ваня». А ён любіў іх — сваіх Міколу і Данілу і іх — Кацярыну і Іну. Гэта была яго сям'я...

Іван Данілавіч доўга глядзеў туды, за хаты, дзе каласілася калгаснае поле, над якім раз-поразу праносіўся вецер, гайдаючы жывое золата. І яно ззяла-пералівалася пад промнямі жнівеньскага сонца...

* * *

Пасля полудня тое месца ля плота на двары, дзе ляжаў сабака, раптам накрыў чорны цень. Сёння Джэк, бадай, упершыню пасля здарэння самастойна мог устаць і падысці да міскі з ежаю. Прымружыўшы вочы, ён ляжаў, адчуваючы, як прыемная стома паступова ахоплівае ўсё цела. Потым ён быццам бы праваліўся кудысь...

...Ён у машыне. Рознакаляровыя агеньчыкі скачуць перад вачыма, калі аўто падкідае на ўхабах. Рэзкі ўдар — машына спынілася. Дзверы расчыняюцца — у салон уварваўся свежы струмень паветра... Нешта сціснула шыю... Нешта цягне яго за сабою... Цяжка дыхаць... Цяжка... Шоргат лісця... Чыесьці крокі, гулкія... Кожны аддаецца ў галаве... Белы твар на бела-чорным фоне... І — агонь... Сноп агню... Боль у галаве... Чырвоныя пялёсткі болю... Ён расце, гэты боль, запаўняе кожную клетачку змучанага цела... Чырвоныя пялёсткі гаснуць адзін за адным, паступова, у чорнай, непрагляднай цемры... Усё... правал...

Джэк усхапіўся ад сну... Над ім, замест яснага цёплага сонейка, вісела вялізная чорная хмара. Шэрань сціскала паветра вакол. Штосьці бліснула на ўсходзе — і пакаціўся па небе раскат грому, нібы груда камення звалілася на зямлю. Неўзабаве яшчэ адна бліскавіца — ужо бліжэй — уваткнулася ў дол. І зноў гром скалануў паветра. Першыя кроплі, тугія, цяжкія, упалі на зямлю, малюсенечкімі фантанчыкамі, як кулямі, прасяваючы яе. Джэк ускочыў і, не зважаючы на боль, панёсся да стопкі, дзверы ў якую былі расчыненыя. Ускочыў туды. Лёг. Затаіўся...

## Частка X

Над вёскаю навіс чорна-шэры полаг, які, здавалася, увабраў у сябе і зямлю, і неба. Чорныя абрысы хат былі ледзьве бачныя ў гэтай смузе. І толькі часам яна адступала перад асляпляльным бляскам маланкі — тады станавілася светла, як удзень. На імгненне. Раптам на зямлю абрынуліся тоны вады. Дождж лупцаваў па хатах, дрэвах. Ніводнага чалавека не было зараз на вуліцы: нікому не хацелася апынуцца ў самым цэнтры гэтай стыхіі.

Як ні дзіўна, але, калі кінжал бліскавіцы ў чарговы раз распароў шызае неба, можна было заўважыць легкавы аўтамабіль, які невядомы вандроўнік-смяльчак спыніў пад высокім адзінокім дубам, што рос недалёка ад ваколіцы ля дарогі. Гэты волат узвышаўся над усёй вёскай і, як Ілья Мурамец, узіраўся ўдалеч, мабыць, ужо не адну сотню гадоў. На сваім вяку бачыў ён нямала навальніц, але вядома, што бліскавіцу можа прыцягнуць не толькі дрэва — тым больш адзінокае, — але і метал...

Пачуўся чарговы ўдар грому, і маланка трапіла якраз у вяршаліну магутнага дрэва, запаліўшы некалькі галін. Падпаленыя, яны абгарэлі. Адна з іх палаючым факелам абрынулася на капот машыны, якая тут жа рванула з месца і памчалася ў бок вёскі.

Гэта была кульмінацыя дзівоснага прыроднага спектакля. Бо неўзабаве дождж пачаў сціхаць, а праз хмары прабіліся першыя, пакуль яшчэ нясмелыя, сонечныя промні. І — раптам чорна-шызае неба нібы расчынілася, прапускаючы наперад гарачае, асляпляльна-залатое сонца. Яно, як пераможца на п'едэстале, заззяла на нябесным Алімпе, узіраючыся ўдалеч і дорачы ўсяму свету сваё цяпло. Праз лічаныя хвіліны ўжо нельга было зразумець, быў дождж альбо не: слёзы на твары карміцелькі-зямлі высахлі.

Вёска таксама нібы абудзілася ад сну: пачалі расчыняцца дзверы, вокны, падалі свой голас каровы ў хлявах.Ляснула чыясьці брамка.

Машына стаяла ля калодзежа, недалёка ад старой бярозы. Гэта быў стары сіні «форд», у якім сядзелі двое. І ніхто з іх нават не падазраваў, наколькі блізка знаходзіцца зараз мэта іх падарожжа.

— Слухай, Андрэй, гэтую вёску я праязджаў двойчы — адразу ж пасля ўсяго, ну... ты разумееш, — Васіль Сцяпанавіч нешта горача даказваў сыну. — Што нам тут яшчэ шукаць? Паехалі далей!

Ён хацеў завесці машыну, але сын не згаджаўся з бацькам.

— Ты ж гаварыў, што пытаўся ў людзей пра Джэка, так?

— Так.

— І колькі іх было, тых дарадцаў?

— Двое. Бабулька нейкая каля магазіна і хлопец на адным двары.

— А ты ў хаты заходзіў? Не? А ў той жа магазін? Прадавец ведае усё, што ў вёсцы робіцца!

— Дык людзей у той вёсцы няма — усе ў полі! Хаця... наконт магазіна я, і праўда, не скумекаў.

— Слухай, тата, я пайду вады нап'юся — вунь якраз і калодзеж побач. Я неяк сэрцам адчуваю, што наш Джэк дзесьці тут. А вось чаму? — Андрэй выйшаў з машыны, — ...не ведаю пакуль. Пойдзем лепш разам да калодзежа — карысна ногі размяць, а?

— Не, сын, ідзі. Я пасяджу.

— Як хочаш.

Андрэй пайшоў, а бацька доўга глядзеў яму ўслед праз расчыненыя дзверцы машыны.

Бразнуў металічны ланцуг, да якога было прывязана вядро, і гулкі плёскат дзесьці ўнізе абвясціў, што яно дасягнула вады. Праз хвіліну вядро было ўжо на паверхні. Андрэй з прагнасцю піў, вада пралівалася на кашулю. Сцюдзёная, яна не шкадавала зубоў, але ён не адчуваў гэтага. Наталіўшы смагу, Андрэй нахіліўся, каб выліць астатнюю ваду пад плот. І раптам паміж дошкамі, на якія звычайна ставілі вядро, ён убачыў нешта бліскучае. Засумняваўшыся, лінуў туды трохі вады. І раптам

убачыў крыжык. Залаты. «Праваслаўны. Божа! Як той самы, аздоблены камянямі... Яе, Іны, — падалося Андрэю. — Але так не бывае. Толькі ў казках якіх...»

Усё яшчэ баючыся паверыць асабістай думцы, падняў крыжык, як найвялікшую каштоўнасць, і схаваў у кішэні кашулі. «Гэта яе... Безумоўна, яе... Археолаг не можа памыліцца... І бацьку сюрпрыз будзе. Калі, дай Божа, маю Даратэю сустрэнем — пазнаёмлю іх!» — у душы засмяяўся сваёй думцы Андрэй. Гэта быў добры знак. Чаму? Ён пакуль уцяміць не мог, але адчуваў, што рухаўся ў правільным накірунку.

...І тут толькі ўбачыў старога, які выйшаў з варот суседняй хаты і сеў на лаўку каля плота. Дастаў папіросы. Закурыў. Гэта быў Кузьміч.

Андрэй падышоў. Прысеў побач.

— Дзень добры! — павітаўся Андрэй. — Смачная ў вас вада. У горадзе такой няма.

— І табе добры дзень, хлопец, калі не жартуеш. Праездам у нас ці да каго-небудзь у госці?

— Ды навальніца паламала ўсе планы, — пачуўся ззаду голас Войціка-старэйшага. — Мы за вёскай пад дубам спыніліся, калі ўсё пачалося. Думалі перачакаць. Не паверыце: маланка па нашым дубе жахнула. Падпаліла яго. Мы — адразу сюды.

— Дуб, гаворыце, падпаліла? — Кузьміч павярнуўся да Васіля Сцяпанавіча і ўважліва паглядзеў на яго, прыплюшчыўшы адно вока. — Дык гэта... ўсім вядома, што пад дрэвам... адзінокім тым больш... хавацца ад навальніцы няможна. Хаця... старыя гавораць... Пярун не па ўсіх б'е...

Бацька і сын зірнулі адзін на аднаго.

— ...А звычайна толькі па тым, на кім цяжкі грэх... Вось...

— А мы тут пры чым? Мы ж толькі пад гэтым дубам стаялі! — не паверыў Андрэй. — Глупства нейкае...

Апошняя фраза амаль прашалясцела ў цяжкім восеньскім паветры. Але стары пачуў яе.

— Ты, хлапец, малады яшчэ зусім, не ведаеш шмат чаго... — пачаў Кузьміч.

Але Войцік-старэйшы перарваў ягоную думку.

— Вы, пэўна, здзівіцеся, — пачаў ён. — Але мы сабаку свайго шукаем. Я, вядома, разумею, наколькі дзіўна гэта гучыць... Вось ваша вёска бліжэйшая да бярозавага гаю, хаця я тут ужо двойчы праязджаў... Гэта аўчарка, прыгожы такі пёс...

Кузьміч раптам аслупянеў. Быццам маланка ўдарыла ў яго, калі пачуў словы «бярозавы гай» і «аўчарка». Ён усё зразумеў і, паколькі быў чалавекам шчырым, адразу адкрыў свае карты.

— А чаму ты страляў па ім, гад? Чаму не пашкадаваў? Людзі з-за цябе начэй не спяць — баяцца, каб не сканаў ён!

Словы Кузьміча прагучалі як стрэл сярод звонкай цішыні.

— Божа мой, дык ён жывы! — страпянулася надзея ў сэрцы Войціка. Ён кінуўся да старога. — Прашу вас, пакажыце, дзе ён! Прашу вас!..

Яму было сорамна перад сынам, але ён разумеў, што гэтая хвіліна вельмі каштоўная для яго. І... для ўсёй сям'і.

— А па чым я ведаю, твой гэта сабака ці не? — працягваў свой «допыт» Кузьміч. — Як яго завуць?

Ён ужо зразумеў, што гэта і ёсць той самы злачынца, на якога ён наслаў столькі сваіх праклёнаў. Але, гад, напэўна, вельмі шкадуе аб усім. Кузьміч раптам аслупянеў, убачыўшы ў вачах яго слёзы... Звыклы да ўсяго, ён баяўся толькі жаночых слёз. А тут мужчынскія...

— Джэк, — ціха адказаў Васіль Сцяпанавіч. — Аўчарка. Вы ж, пэўна, бачылі...

І ў некалькіх словах расказаў Кузьмічу і пра Джэка, і пра маці, і пра міліцыю. Той слухаў уважліва, не перарываў. Уздыхаў. Выслухаўшы, зноў закурыў. Падумаў, выпусціўшы клуб дыму, сказаў:

— Бог табе суддзя, чалавеча... Хаця я цябе разумею...

Кузьміч замаўчаў.

— Не дай Божа такое каму-небудзь... Хаця... Сабакі — як людзі. Могуць калечыць, могуць і ратаваць. Могуць крыўдзіцца, могуць і дараваць...

Ён з хітрынкаю ў вачах зірнуў на Войціка.

— Толькі лгаць не могуць. Заўсёды шчырыя — ва ўсім...

Войцік маўчаў.

— Я ведаю, дзе твой Джэк. Але падумай спачатку, ці трэба табе з ім сустракацца... ну, пасля ўсяго. Фершал выняў з яго галавы твае жалезкі... У сабакі... ну, новае жыццё, можна сказаць. А тады...

Стары зноў уважліва паглядзеў на Войціка.

— ...плакаў у тым лесе, як дзіця... Вось... Таму, дарэчы, яго і знайшлі...

Вочы Войціка зноў напоўніліся слязьмі. Ён упершыню ў жыцці знаходзіўся ў такой сітуацыі. Што рабіць далей? Ці можна зноў вярнуць Джэка? Альбо не рабіць балюча яму і сабе і вярнуцца ў Мінск, пакінуўшы яго тут, у новых гаспадароў, у новым жыцці?..

* * *

Усё вырашылася само сабою. Раптам ля суседняй хаты, якраз насупраць старой бярозы, пачуўся голас:

— Ну што нам з табой у тым лесе рабіць пасля дажджу? Заўтра лепш пойдзем, праўда? Дровы нас няхай пачакаюць!

Кузьміч і Войцікі павярнуліся на голас і ўбачылі Собаля і Джэка. Іван Данілавіч трымаў у руцэ міску з чарговай порцыяй ежы для свайго гадаванца. Джэк, адчуўшы прыемны пах, пакінуў сваё месца ў стопцы.

— Эй, Данілавіч! Хадзі сюды! — закрычаў яму Кузьміч. — Я цябе з адным чалавекам пазнаёмлю!

Гавораць, што калі скажаш нешта на пачатку вясковай вуліцы, то рэха разнясецца на ўсю вёску. І сапраўды, як толькі прагучалі словы Кузьміча, некаторыя цікаўныя суседзі, пакуль здалёк, пазіралі на іх. Суседняя ад хаты Собаля брамка расчынілася, і на вуліцу выбегла Іна. Яна ўжо пачала збіраць рэчы перад ад'ездам у Мінск: адпачынак заканчваўся, — як раптам пачула галасы на вуліцы. Убачыла Кузьміча і двух незнаёмых ля суседскіх варот. Аднаго, падалося Іне, яна ўжо дзесьці бачыла.

— Што там, дачушка? — спытала Кацярына дачку. Яна прыйшла на абед і завіхалася зараз на кухні.

— Нейкія незнаёмыя да дзядзькі Вані прыйшлі. Я пайду пагляджу.

— Я хутка цябе даганю, Іначка...

Апошніх слоў Іна не пачула — была ўжо каля брамкі.

* * *

Собаль яшчэ не паспеў нічога зразумець, як Войцік рашуча расчыніў брамку і ступіў на двор. Андрэй застаўся каля ўваходу.

Джэк таксама заўважыў свайго былога гаспадара і, павярнуўшыся, замер. Як скамянеў. Войцік зрабіў некалькі крокаў і таксама спыніўся. Паглядзеў на Джэка. І раптам адчуў, як сілы пакідаюць яго, — прысеў. Штосьці зашчымела ў горле ў Васіля Сцяпанавіча. І ён ціха, амаль шэптам, няўпэўнена сказаў:

— Джэк! Чуеш мяне? Ідзі сюды...

Голас яго некалькі разоў перарываўся. Ад хвалявання ў сэрцы зашчымела. Галаву пранізаў моцны боль.

Джэк уважліва глядзеў на Войціка.

Збоку здавалася, што сабака проста не пазнае яго. Але потым адбылося тое, чаго чакаць было, па сутнасці, нельга, але чаго чакалі, напэўна, усе, асабліва Васіль Сцяпанавіч.

Джэк раптам заскуголіў, лёг на зямлю і папоўз да свайго гаспадара.

Войцік усё зразумеў... Заплакаў, як дзіця, і кінуўся да Джэка. Упаў на зямлю, прыціснуў галаву сабакі да грудзей, пачаў цалаваць...

Сцэна гэтая расчуліла ўсіх.

З-за плота пачуўся голас Кузьміча:

— Бач ты, сабака ўсё зразумеў... дараваў яму... дараваў усё...

Андрэй адчуў, як слёзы радасці і палягчэння душаць яго. Закрыў твар рукамі, плечы яго затрэсліся.

— Што з вамі, Андрэй? — пачуў ён раптам знаёмы голас.

Войцік азірнууўся: разам з Кузьмічом ля брамкі стаяла... яго Даратэя! Ён не верыў у прымхі, але тут усё ж такі цяжка было паверыць у такое дзіва, і тым больш зараз...

— Не, нічога, — пачаў ён. — Проста гэта мой сабака і... мой тата...

— Ваш? — у вачах дзяўчыны раптам заззялі злыя агеньчыкі. — Значыць, гэта ён страляў па гэтым няшчасным, якога мая маці ледзьве з таго свету вярнула?

— Ён... не хацеў... Вы павінны зразумець... Ён, Джэк, бабулю — татаву маму — пакусаў... да крыві. Два швы наклалі...

— Дзякуй Божа, што хоць праз столькі год гэтую мегеру твая кара знайшла! — пачуўся злосны шэпт каля Андрэя.

Ён азірнуўся: побач з Інаю стаяла прыгожая чарнавалосая жанчына, вельмі падобная на яе.

— Што ты гаворыш, мама? Хіба так можна? — Іна здзіўлена паглядзела на маці.

— А чаму я павінна маўчаць? А, Васіль? Помніш мяне?

Войцік падняў галаву. Спачатку не пазнаў. Але паступова, хвіліна за хвілінаю бачна было, як ціхае светлае шчасце яго саступае месца новай трывозе.

— А помніш, як яна не згаджалася, каб былі мы з табою разам? А помніш, як яна выкінула нас з двухмесячнаю дачкою на мароз, сказаўшы, што нагі нашай не будзе ў вашым доме, таму што мы ледзь не псуем ваш генафонд знакаміты? А дзіця ў падоле — не іх дзіця! Дык вось запомні: так ёй і трэба! Кара Боская насцігае ўсіх — рана ці позна — усіх! Эх, Вася, Вася! Што ж вы нарабілі!..

Андрэй стаяў, ашаломлены тымі зменамі ў свядомасці, якія адбыліся на працягу толькі апошніх пяці хвілін. Свет нібы выбухнуў у яго галаве... Ён раптам успомніў пра крыжык. Зірнуў на Іну: на яе шыі крыжыка не было.

— А я вось што сёння знайшоў. Не ваш часам?

І выцягнуў крыжык.

— Ой, — здзівілася Іна, — а мама казала, што гэта дрэнная прыкмета — згубіць нацельны крыж. А аказваецца, не зусім дрэнная. Як вы лічыце? Як ты лічыш? Можна на «ты»?

— Можна, — з усмешкаю згадзіўся Андрэй...

Собаль, які бачыў усю сцэну, спачатку раззлаваўся, калі ўбачыў Война, — яшчэ раней хацеў разабрацца са злачынцам, які пакрыўдзіў сабаку. Потым, убачыўшы рэакцыю Джэка, быў гатовы даравацъ незнаёмцу. А пачуўшы словы Кацярыны і зразумеўшы ўсё, падумаў, што час ужо даўно ўсё паставіў на свае месцы і што нельга нічога вяртаць назад, калі толькі жыццё само не ўнясе свае карэктывы...

Кузьміч ціхенька падышоў да Івана Данілавіча, паклаў таму на плячо руку, адвёў убок і напаўголаса караценька паведаміў яму гісторыю Войціка.

А той тым часам не адыходзіў ад Джэка. Сядзеў на траве, а сабака даверліва паклаў галаву свайму гаспадару на калені... Андрэй і Іна, усхваляваныя, сядзелі з імі. Васіль Сцяпанавіч ашаломлена глядзеў на дачку і, здавалася, сам не разумеў яшчэ, што здарылася.

«Дзе ж ты, той Пярун, што не пакараў мяне раней? Чаму ты прыйшоў да мяне так позна — толькі зараз?..» — разгублена пытаўся ў сябе Войцік, разумеючы, што чым больш ён ставіць перад сабою пытанняў, тым больш парадаксальнымі яны яму падаюцца...

Кацярына знікла амаль адразу, як з'явілася, — не хацела бачыць свайго «былога», ірваць лішні раз сэрца. Для яе ўсё скончылася са з'яўленнем яе дачкі на гэты свет — усе мары, надзеі, спадзяванні. Усё. І вось сёння вярнулася. Навошта? У кожнага сваё жыццё, якое марудна, але непазбежна набліжаецца да Суднага дня... «Усё ў руках Божых», — думала Кацярына, расчыняючы дзверы сваёй хаты...

## Частка XI

Сіні «форд» пачаў набіраць хуткасць, калі вёска засталася за паваротам. Васіль Сцяпанавіч Войцік вёў машыну, не заўважаючы той прыгажосці, што раскінулася навокал. Перад вачыма стаяла сцэна спаткання яго з людзьмі, што выратавалі Джэка і... яго душу: Іванам Данілавічам, які першым знайшоў сабаку; Кацярынай, якая так і не стала яго жонкаю, але фактычна ўжо была ёю, калі б не маці; Інаю — яго дачкою. Той самай, пра якую ён успамінаў столькі год і пра якую нічога не ведалі Таццяна і дзеці. Да сённяшняга дня... І няхай! Няхай душа назаўжды будзе свабоднаю, як той матылёк, што лічыцца чамусьці легкадумным...

Андрэй, гледзячы за акно машыны, разважаў пра тое, як цяжка мець у жыцці арыенціры. Учора было адно, заўтра — другое, а паслязаўтра — нават боязна ўявіць што... Але ў душы ён радаваўся, што не дарэмна з'ездзіў: знайшлі з татам Джэка. Хаця Іна ніколі не будзе яго Даратэяй, а яе маці — яго цешчай...

Самым шчаслівым з усёй кампаніі, пэўна, быў Джэк, які выглядаў сапраўды задаволеным. Высунуўшы язык, сядзеў ён, узіраючыся праз акенца на палі і дрэвы, што праносіліся міма, і, здавалася, усміхаўся...

*29.08.2009 г.*

# Апавяданні

## АНЁЛЫ

*У аснову пакладзены рэальныя падзеі*

Цягнік набіраў хуткасць, адышоўшы ад станцыі. Колькі яшчэ такіх станцый будзе, пакуль дабярэшся да Мінска!

Курловіч устае, расчыняе акно — засланка паўзе ўніз, упускаючы ў купэ парыў свежага летняга ветру. Той з радасцю шалясціць старонкамі кнігі на стале, асвяжаючы стомлены ад доўгай паездкі твар Міхася.

Курловіч бярэ з сумкі пачатую бутэльку мінералкі, налівае ваду ў пластмасавы кубак, і бурбалкі весела скачуць па паверхні, запрашаючы спатоліць смагу. Міхась з прагнасцю п'е, моршчыцца: мінералка цёплая і таму зусім не смачная ў такую спёку.

У купэ ён адзін. Спадарожнік яго сышоў яшчэ ўчора ўвечары. Курловічу вельмі пашчасціла: з самага Пецярбурга (Міхась ехаў праз Маскву) у купэ разам з ім быў толькі адзін, у гадах, дзядзька з дыпламатам замест чамадана, чым здзівіў Курловіча. А што гэтаму дзядзьку! Сеў на цягнік раніцай, сышоў пасля абеду — начаваць жа не трэба!

У свае няпоўныя сорак гадоў Міхась Курловіч нямала пабачыў людзей, падназапасіў жыццёвага вопыту, аб'ездзіў увесь СССР, нават, зусім маладым, пабываў у ГДР і вельмі часта ўспамінаў пра гэта. Зараз жа ўсё змянілася: няма ГДР і ФРГ — ёсць адзіная Германія са сваімі парадкамі, сваімі законамі і праблемамі. СССР адышоў у нябыт, раскалоўшыся на шматлікія асколкі, якімі, здаецца, многія параніліся, — тыя, у каго душа неабыякавая. Як у таго Кая з казкі Андэрсена, заселі ў сэрцы і ў вачах некаторых людзей такія асколкі, вострыя зазубрыны-кавалачкі, якія нават ніякімі слязьмі не растапіць. І ўсё пасля развалу былой вялікай — у любым сэнсе — дзяржавы...

Дзверы купэ раптам расчыніліся: у праёме стаяла правадніца — маладзенькая чарнавалосая дзяўчына з блакнотам у руцэ. Бровы яе цямнелі адной тонкай палоскай, і здавалася, што яна нахмурылася.

— Бойлер нагрэты, можаце наліць кіпеню для гарбаты, — прашчабятала правадніца.

— Вялікі дзякуй, — Міхась якраз трымаў у руцэ мінералку. Усміхнуўся сам сабе, падумаўшы: «І хто ў такую спёку гарбату п'е?».

Курловіч выцер з ілба пот — вельмі захацелася высунуць галаву з акна, падставіць твар ветру. Так і зрабіў. Сонца на момант асляпіла яго. Неўзабаве, расплюшчыўшы вочы, Міхась павярнуў галаву налева: доўгі хвост цягніка, як вусень, цягнецца ўперадзе, быццам бы не спяшаючыся. Хаця хуткасць гэтага «вусеня» даволі высокая, а яшчэ грукат колаў у такт — і Курловіч з задавальненнем адчувае, як усё цела напаўняецца свежасцю і ў галаве праясняецца.

«Які цуд вакол! Нідзе больш на зямлі няма такой прыгажосці, як у нас, на Беларусі! Святы, непаўторны край... Любы край...»

Праязджалі, напэўна, Полаччыну. Вунь зялёны малады бярозавы гаёк на ўзгорку, а за ім некалькі хат — як грыбная сямейка, прытуліліся побач на адным месцы. Ад іх у розныя бакі,

як павуцінкі, разбягаюцца дарожкі, губляючыся дзесьці далёка-далёка...

«Вось так і чалавек, пакінуўшы аднойчы родную хату, павінен выбраць сваю, толькі для яго прызначаную сцежку...

Міхась вельмі любіў сваіх бацькоў. Нават надоўга ад'язджаючы кудысьці, ён заўсёды тэлефанаваў маці, хаця сустракаліся яны не так часта, як хацелася б. Як і любы дарослы чалавек, ён амаль не меў вольнага часу — выходзіў з дому яшчэ на ранку, а вяртаўся позна, калі ўсе спалі. У ягонай душы з года ў год расло адчуванне, што жыццё, несучыся стралою, робіць дзяцей дарослымі, а дарослых — старымі. А людзі ў гэтай гонцы нічога не заўважаюць: няма часу прыпыніцца, перавесці дух, азірнуцца назад. Міхась даволі ясна памятаў сваіх бацькоў, калі ім было па трыццаць гадоў. І зараз дзіўна, што ім ужо па шэсцьдзясят — нібы гадоў тых увогуле не было. Але яму самому амаль сорак, расце сын, а на галаве яго бацькі ўжо ляжыць, не растаючы, снег... Яму, як сыну, вельмі хацелася б спыніць гэты бязлітасны час, але... Дзе ж ты, вечная маладосць?..

* * *

...Вецер зноў уварваўся ў купэ — расчыніліся дзверы.

— Добры вечар! Гэта сёмае купэ? Я не памыліўся? — пачуўся голас.

Курловіч павярнуўся: перад ім з чамаданам у адной руцэ і пінжаком у другой стаяў невысокі цёмнавалосы чалавек гадоў сарака.

— Добры дзень! Не памыліліся.

Мужчына паставіў чамадан.

— Ну, паколькі не памыліўся, давайце знаёміцца. Сямён, — чалавек усміхнуўся, працягнуў руку.

— Міхась, — Курловіч пацiснуў новаму спадарожніку руку, зірнуў таму ў вочы. Поціск у яго візаві быў цвёрды — сапраўдны, мужчынскі. Позірк — шчыры, адкрыты.

«Такая спёка, а чалавек як з міжнароднага сімпозіума — белая кашуля, гальштук. Дзіўна толькі, калі ён мог сесці на цягнік? Апошні раз спыняліся толькі прыкладна з гадзіну таму», — падумаў Курловіч.

Быццам бы зразумеўшы яго думкі, Сямён сказаў:

— Я ўжо хвілін пяцьдзясят дабіраюся да гэтага купэ — з правадніцай загаварыліся...

Курловіч міжволі звярнуў увагу на правую руку новага знаёмага — заручальнага пярсцёнка на безыменным пальцы не было. «Твар маладжавы, падбародак валявы, з ямачкай, лёгкая сівізна ў валасах, вочы з паволокай, строгі касцюм — такія падабаюцца жанчынам...»

— Сапраўды, вы ўжо ў вагоне, куды спяшацца?

* * *

Тым часам сонца за акном рыхтавалася да сну. Пагусцелі цені, што несліся за цягніком, раз-пораз заглядваючы ў акно. Знікалі фарбы, само паветра, здавалася, гусцела ў вячэрняй млосці. І толькі гарызонт палаў, як куфар з каштоўным каменнем, — рубінавымі промнямі сонца, сапфірава-бірузовымі аблокамі, падсвечанымі дзіўным брыльянтам-сонцам. І ўсе гэтыя пурпурова-пярэстыя фарбы знікалі па меры таго, як сонца апускалася ўсё ніжэй і ніжэй...

Гледзячы на ўсю гэтую прыгажосць, Міхась міжволі падумаў: «Нашы продкі таксама калісьці бачылі гэты цікавы спектакль, і мы бачым, і нашы нашчадкі абавязкова павінны ўбачыць... Галоўнае, каб да гэтай прыгажосці мы ніколі не прывыкалі — кожны раз бачылі ўсё нібы па-новаму».

Зноў ляснулі дзверы — у купэ зазірнула праваднiца, уручыла Сямёну пасцельную бялізну, падміргнула яму, як старому знаёмаму, усміхнулася. Потым пажадала ўсім добрай ночы і знікла.

— Вось фея знікла ў начной цішы, і зноўку — ні душы!.. — з ходу выдаў Сямён, зірнуўшы ўслед дзяўчыне.

— Гэта што — экспромт?

— А то! Кожны раз бачу якую-небудзь прыгажуню і вершы ёй гатовы складаць, — усміхнуўся Сямён.

Ён ужо схаваў у чамадан гальштук, а кашулю і штаны з пінжаком падвесіў пад верхнюю паліцу на складной вешалцы, якая знайшлася ў чамадане, і ўжо быў апрануты ў сінія спартыўныя штаны і белую майку з надпісам «The Beatles».

Пасцяліўшы сабе, Сямён пачаў даставаць з чамадана прадукты: некалькі памідораў і агуркоў, каўбасу, хлеб, яйкі.

— Вы не жадаеце павячэраць? — спытаў ён у Міхася. — А то я не люблю адзінокія сняданкі і вячэры.

— Па мне яшчэ даволі рана для вячэры, — адказаў Курловіч, — але чаму мне не скласці кампанію добраму чалавеку?

Міхась таксама дастаў свае прыпасы: кавалак халоднай смажанай свініны, хлеб, бляшанку шпротаў, непачатую бутэльку мінералкі.

— У цягніку гэта, вядома, забаронена... Але што за вячэра без чаркі? — усміхнуўся Сямён і выцягнуў аднекуль бутэльку каньяку. — З джэнтльменскага набору! — горда зазначыў ён і спытаў: — Вы, спадзяюся, не супраць?

Курловіч добра ведаў розныя гісторыі пра тое, што ў цягніках «выпадковыя» спадарожнікі могуць падсыпаць клафелін ці іншую бурду, а потым абабраць да ніткі. Але Міхасю, як і любому іншаму чалавеку, не магло нават прыйсці ў галаву, што такое можа здарыцца менавіта з ім. А сённяшні яго новы знаёмы зусім не быў падобны на злачынцу, вёў сябе проста, натуральна, шчыра. Курловіч з хвіліну падумаў, потым згадзіўся.

Сямён наліў каньяк.

— Ну што, за знаёмства?

Выпілі. Сямён узяў кавалачак каўбасы.

— Дагестанскі каньяк... Цудоўны напой, нектар багоў. Закусваць агурком яго — сапраўдны грэх. Лепш — шакаладам.

Міхась зрабіў некалькі бутэрбродаў са шпротамі. Адзін узяў.

— Чым займаецеся ў гэтым жыцці? — пачаў размову Сямён.

— Хачу адкрыць сваю справу. Таму і ездзіў у Піцер — знаёмыя ў мяне там. Грошы пакуль шукаю — хто ж дасць, калі не знаёмыя? Але... «воз и ныне там». Пакуль не атрымалася: не хочуць пачынаць з малога — адразу, бачыш, ім ўсё давай! Так што справу сваю трэба на Радзіме пачынаць. Калі змагу, канечне... — Міхась змоўк, задумліва зірнуў за акно.

Ноч даўно панавала за гэтым акном, шчыльнымі фіранкамі цемры закрыўшы будучы, новы дзень ад чалавечых вачэй, якія ўжо даўно зліпаліся ад стомы.

— А я кручу баранку дваццаць год: спачатку на аўтабазе, а потым «Ікарус» вадзіў... А ўвогуле, паколькі мы ўжо знаёмыя, едзем разам, то трэба выпіць на брудэршафт! Згодны?

Курловіч кіўнуў. Сямён разліў па кубках каньяк.

— Ну што, за здароўе! Каб яго нам на доўгія гады яшчэ хапіла!

— Давай.

— Ведаеш, — працягваў Сямён, — ёсць адзін няпісаны закон для такіх вандроўнікаў, як мы з табою. Калі сустракаюцца два зусім незнаёмыя таварышы ў поездзе, самалёце, аўтобусе, то часцей за ўсё яны могуць расказваць адзін аднаму ўсё, што захочуць, нічога не баючыся, — яны ж хутка раз'едуцца і ніколі больш не ўбачацца!

Сямён хітравата ўсміхнуўся, захрумстаў агуркам.

— Вось я, напрыклад, ніколі праведнікам не быў ні ў якіх адносінах, асабліва ў сардэчных. Вось скажы: якая карысць ехаць адпачываць, калі ты ні з кім не зможаш пазнаёміцца, ну і ўсё такое? Ты ж дарослы, здаровы мужык, усё ў цябе на месцы. Я калі б хацеў, то і не прыходзіў сюды — мог бы і ў праваднiцы застацца. Тая, здаецца, была не супраць!

Ён зарагатаў.

— Ты што не ясі? — пацікавіўся ён. — Ведаеш, брат, апетыт прыходзіць у час вячэры — я не толькі пра ежу, — перайначыў ён вядомую прымаўку. — Ну што, па трэцяй?

— Тады традыцыйна — трэці тост за жанчын, — азваўся Курловіч.

Міхась не парушаў маналога свайго візаві. Ці то ад стомы (цэлыя суткі ехаць!) і млоснасці пасля каньяку, ці проста цікава было паслухаць незнаёмага дагэтуль чалавека. Каньяк расслабіў яго, часткова знікла напружанасць, якая бывае, калі ты вымушаны праводзіць час з чужым табе чалавекам. І, здаецца, пакуль не ведаеш нічога пра субяседніка, высновы аб чымсьці грунтоўным рабіць яшчэ рана.

Пасля трэцяга кубка Сямён парушыў маўчанне — яму так хацелася выгаварыцца!

— Ты вось скажы... Ты жанаты чалавек, — ён скасіў вока на правую руку Міхася. — Няўжо табе ніколі не хацелася гульнуць? А? Ты ж не манах, маеш права! Многія... ды амаль усе такія! Колькі таго жыцця! Я вось другі раз жанаты. У мяне зараз пасля шафёрства невялікая фірма — дзверы і вокны ставім. Я некалькі разоў у год езджу ў Турцыю, Егіпет. І вядома, не адзін.

— З жонкай?

— Ты што! Не разумееш? Вядома ж, не!

— А дзеці ў цябе ёсць?

— Дачка, сем год. Першы клас ужо скончыла. Дык вось. Светка, жонка мая, я не ведаю, якімсьці дваццаць сёмым чуццём ці чым яшчэ... хто яго ведае... здагадалася, што ў мяне хтосьці ёсць. А зараз, калі я толькі вярнуўся з Балгарыі, яна ўчыніла мне такі скандал, што я вырашыў з'ехаць ад яе ў Мінск. Тут, дарэчы, і фірма мая.

— Яна цябе выгнала? — здагадаўся Курловіч.

Сямён на імгненне апусціў вочы.

— Ну, знайшла адну рэч... Я з мабільнага заўсёды сціраю SMS-кі, а на гэты раз забыўся на іх. У Светкіным тэлефоне сеў

акумулятар. Яна і ўзяла мой. Ты ж ведаеш жанчын! Спачатку, відаць, патэлефанавала куды ёй было трэба, а потым вырашыла палазіць па ім. Ёй жа ўсё цікава! Вось і націкавілася... А я, дурань, не паспеў знішчыць увесь кампрамат і ўжо, вядома, нават не апраўдваўся. Дастала ўсё! А я так кахаў яе! Па рэстаранах яе вадзіў, футра з Грэцыі калісьці прывёз, нават машыну ёй узяў. Яна дома сядзела, не працавала. Што ёй яшчэ трэба, га?..

Сямён цяжка ўздыхнуў, адвярнуўся да акна — чорнага змрочнага прамавугольніка, за якім панавала толькі летняя ноч. Здавалася, што ўсё патанула ў гэтай неагляднай цемрадзі, але раз-пораз праносіліся маленькія бліскаўкі-агеньчыкі нейкіх далёкіх-далёкіх станцый, вёсак, хутароў. Купэ было злёгку падсвечана лямпачкай у кутку. Рытмічны стук колаў, пагойдванне вагона — усё гэта, у цемры з малюсенечкай кропляй святла ў ёй, стварала ўражанне, быццам знаходзішся ў капсуле машыны часу... Гэта вельмі спрыяла шчырай размове.

* * *

На століку ўжо стаяла пустая бутэлька. Сямён тым часам узяў пачак цыгарэт, запалкі і выйшаў у калідор.

Міхась, які ненавідзеў тытунь, не пайшоў за сваім таварышам. Яму захацелася пабыць аднаму. Прытуліўшыся да акенца, ён доўга ўзіраўся ў цемру... Ён шчыра не разумеў свайго новага знаёмага, хоць сам быў, як кажуць, не без граху — як усе, меў свае слабасці, недахопы, інтарэсы...

«Мабыць, і сямейнае жыццё, і нават каханне з часам становяцца прывычкай, руцінай... Нездарма ж кажуць, што сапраўднае каханне — гэта штодзённая цяжкая душэўная праца, якая, каб гэта каханне жыло, не павінна спыняцца ніколі, — падумалася Міхасю. — І як можа пакідаць сям'ю чалавек, у якога расце дачка? Яна ж не вінаватая ва ўсіх гэтых праблемах! І чаму звычайна дарослыя людзі ахвяруюць менавіта сваімі роднымі дзецьмі, нават, бывае, не разумеючы гэтага?!»

Курловіч не падзяляў пазіцыі Сямёна, яго поглядаў на жыццё. Па-мужчынску, па-чалавечы Міхась спачуваў чалавеку, які здаваўся яму зараз далёкім ад ідэалу. А ў чым, скажыце, гэты, сённяшні, ідэал?

І раптам Курловіч уздрыгнуў, нібы скінуў з сябе рэшткі сну, аслупянення — на ягоным твары мільганула нейкая думка...

* * *

Сямён Равуцкі стаяў у тамбуры. Вагон, у якім яны ехалі, быў апошнім у саставе. За дзвярыма, якія былі, вядома, зачынены, вузкай паласатай стужкай з-пад колаў поезда ляцела дарога.

«Як чалавечае жыццё гэта дарога: паласа чорная, потым — белая, і гэтак далей...» — думаў Сямён і глядзеў на яе, не адрываючы вачэй. Дарога ляцела назад, і здавалася, што не цягнік разрывае ноч, несучыся наперад, а яна, дарога, бяжыць, бяжыць ад яго, Сямёна, назад, пакідаючы ўсё далей і далей родны дом. У галаве ўсе думкі даўно змяшаліся. Злосць з нейкім незразумелым імпэтам, як туман, запаланілі яе; і хацелася спыніць гэтую дарогу, гэты поезд — сесці і спакойна разабрацца ва ўсім...

«Ну палаяліся, ну, атрымаў па фізіяноміі!» — напружана думаў Сямён. Але штосьці ўсё роўна не давала яму спакою... Ён ніяк не мог зразумець, што падсадзіла яго тады на каня, чаму ён рашуча пайшоў з дому, ні на кога не зважаючы — нават на Насцю, дачку...

І раптам, як маланка, у сэрца кальнула думка — першая, мабыць, ясная думка за гэты час, але такая не па-мужчынску здрадніцкая: «Яна ж першы раз ударыла мяне — на поўным сур'ёзе, па твары!». Ён шмат разоў бачыў такую сцэну ў кіно, але ў жыцці сапраўды атрымалася ўсё неяк вельмі балюча, не па-кіношнаму — вельмі шчыра, са злосцю, нечалавечай злосцю...

Усё раптам стала зразумелым: ён хоць і не дзяўчына, але пасля крыўдных слоў і асабліва пасля аплявухі — такога сапраўды ніводнага разу не было яшчэ за ўсё іх сумеснае са Светкай жыццё! — не сцярпеў. Як быў у касцюме, схапіў усё, што трапілася пад руку і выйшаў за дзверы, нічога жонцы не сказаўшы. Нічога...

* * *

Калі Сямён вярнуўся ў купэ, то нават прысвіснуў ад здзіўлення: на століку стаяла непачатая бутэлька гарэлкі.

— Піцерская, дамоў купіў. Ды, ведаеш, вечар сёння нейкі цікавы атрымаўся. Сядай.

Міхась падрэзаў яшчэ каўбасы.

— Сямён, скажы, ты хоць раз бачыў анёлаў?

Той неяк здзіўлена зірнуў на Курловіча.

— Не? — спытаў Міхась. — А я асабіста ведаю тых, хто бачыў...

Сямён нічога не сказаў, толькі ўважліва паглядзеў на Міхася: ці не звар'яцеў чалавек? Але той ґаварыў, здавалася, на поўным сур'ёзе.

— Ну што, у цябе лёгкая рука. Працягвай, — Міхась паставіў бутэльку перад Сямёнам. — А зараз слухай. Уяві сабе гарачы ліпеньскі поўдзень. Яна кіяскёр — прадае газеты, часопісы. Побач з ёю — маленькі сын, гадоў пяці. Кіёск металічны, метал раскаліўся ад гарачыні. Побач з гэтай бляшанкай, прыкладна за два метры, пачынаецца гандлёвы рад з садавіной і гароднінай — чатыры невялікія будачкі-павільёнчыкі, аб'яднаныя агульным дахам. Латкі гэтыя аж ломяцца. Тут і заморскія бананы з ананасамі, тут і багацце нашых, беларускіх, садоў і агародаў.

За прылаўкам бліжэйшага ад кіёска павільёнчыка стаіць немаладая ўжо жанчына. Хоць ёй і цяжка гандляваць у такую

спёку, яна трывае. Нават усміхаецца пакупнікам, якія ўжо добра ведаюць яе і называюць Савельеўнай.

Дык вось. У кіёску спёка. Маці з сынам тут з самага ранку. Хочацца піць. А сын увесь час цярэбіць маці за прыпол і просіць: «Купі мне бананаў і папіць, купі...». Маці ўжо даўно паабяцала гэта яму, але пастаянны наплыў народу не дае магчымасці адарвацца ад работы. Дзіця, аднак, адпускаць не хоча, хоць усяго два метры аддзяляюць кіёск ад латка.

Раптам людскі ручаёк, які бруіў, здавалася, непарыўна, сцішыўся, а потым зусім знік. Хлопец зноў радасна пацягнуў маці на вуліцу. Тая таксама ўзрадавалася магчымасці хоць на хвілінку адарвацца ад работы, узяла кашалёк і ўжо накіравалася за сынам да дзвярэй. І тут пачуўся стук у шкло — за ім стаялі два чалавекі. Жанчына не змагла потым успомніць іх знешнасць. А сын цягнуў яе да выхаду: «Пойдзем, мама, хутчэй, пойдзем!» — «Пачакай, сыначку, яшчэ адну хвілінку. Добра?» І яна не адпусціла сына аднаго, а прытрымала каля сябе. Тое, што адбылося далей, яна запомніла на ўсё жыццё. Людзі купілі нейкія газеты, разлічыліся. Усё гэта заняло дзве-тры хвіліны.

Раптам з вуліцы пачуўся нейкі шум, а потым — страшэнны трэск! Дзяўчына схапіла за руку сына, паляцела на вуліцу. Штосьці, напэўна, здарылася! Яна не памылілася. Жудаснае відовішча паўстала перад яе вачамі. Першага латка, дзе звычайна гандлявала Савельеўна, проста не было — ён быў амаль увесь раструшчаны. Захаваліся толькі бакавіны і верхняя частка. На месцы павільёнчыка стаяла легкавушка-іншамарка. З-пад яе колаў выцякала некалькімі шырокімі палоскамі-раўчукамі цёмна-чырвоная, амаль чорная кроў. Гэты страшны ручай поўз па асфальце, пакрытым рассыпанай гароднінай і садавінай.

За рулём інамаркі хтосьці (за цененым шклом нічога нельга было разгледзець) круціў галавой, азіраючыся назад, — відавочна, намагаўся ўцячы! Але яму зрабіць гэтага не

дазволілі. Як толькі машына ад'ехала прыкладна на метр назад, адразу некалькі чалавек кінуліся да яе, расчынілі з двух бакоў дзверы і, нарэшце, выцягнулі вадзіцеля. Лыпаючы вачыма, са скажоным ад страху бледным тварам, на людзей глядзеў юнак, амаль падлетак. П'янымі вачыма пазіраў ён на тое, што нарабіў... Перастаў вырывацца, сеў на бардзюр, апусціў галаву. Што рабілася тады ў той п'янай галаве — ніхто не ведаў. Ды і часу не было разважаць пра гэта...

Усе кінуліся да Савельеўны. Яна ляжала на спіне, прыціснутая да задняй металічнай сцяны, якая таксама не вытрымала такога націску. Ногі і ніжняя частка цела жанчыны ўяўлялі сабою месіва, галава адкінута. Ніжняя частка твару — суцэльная рана...

Падляцела «хуткая дапамога» — урачы збіраліся зайсці ў магазін (латкі знаходзіліся побач з ім) — і, убачыўшы, што здарылася, кінуліся на дапамогу.

Гавораць, што бяда аб'ядноўвае людзей, робіць іх больш чулымі, менш чэрствымі. Каб ты бачыў, Сямён: людзі, што былі тады на аўтобусным прыпынку, кінуліся хто дапамагаць урачам, хто збіраць з асфальту рассыпаныя яблыкі, грушы, бананы... Некалькі мужчын знаходзіліся побач з віноўнікам трагедыі, які, здаецца, нічога не бачыў перад сабою — аслеп ад таго, што нарабіў.

Савельеўну павезлі ў бальніцу, злачынца — у міліцыю. Але памяць людскую не змыеш, як кроў з асфальту. Надоўга людзі запомнілі тое здарэнне...

А маці з сынам вярнуліся ў кіёск. Дзяўчына толькі потым зразумела ўсё: выйдзі яна з сыночкам на хвіліну-другую раней (а бананы яны заўсёды куплялі ў Савельеўны, і сёння падышлі б, вядома, менавіта да яе), то... яна ледзь не страціла прытомнасць ад страшэннага ўсведамлення! І тыя два пакупнікі, затрымаўшы ў кіёску яе і сына, фактычна выратавалі іх... Хто ж яны былі такія? Ці выпадкова ўсё гэта? Яна выйшла з кіёска,

абышла яго і аслупянела: на прылаўку ўсё яшчэ ляжалі газеты, што купілі, але чамусьці не забралі тыя два чалавекі.

«Анёлы! — мільганула ў яе думка. — Яны прыйшлі спецыяльна і выратавалі нас!» І гэтая светлая думка надоўга пасялілася ў яе сэрцы, якое яшчэ дрыжэла ад перажытага...

— Вось такая гісторыя, — скончыў свой расказ Міхась. — Але ты не ведаеш галоўнага: тая жанчына — гэта мая жонка. Яна і сын — мае анёлы. І, калі хочаш ведаць, я на іх малюся... Усё жыццё...

Курловіч замоўк, потым, асушыўшы свой кубак, устаў, пaглядзеў у вакно.

Неба ўжо пачынала святлець. Зачынаўся новы дзень, які абавязкова павінен быць не падобным на ўсе папярэднія. Што ён прынясе? Гэтага ніхто не ведае. А калі б чалавек ведаў, то нецікава было б яму жыць на зямлі...

Курловіч азірнуўся: Сямён Равуцкі таксама сядзеў моўчкі, утаропіўшы позірк долу.

— Ну што, давай спаць, хоць крышачку прыснём, — парушыў маўчанне Міхась.

— Зараз. Слухай, а што здарылася з той жанчынай, якая ў бальніцу трапіла? А з тым юнаком што? Ведаеш?

— Савельеўне далі інваліднасць. А што здарылася з гэтым... — не ведаю. Магу сказаць толькі, што машына была не яго: узяў паездзіць у кагосьці. Вось і паездзіў...

* * *

Поезд падыходзіў да перона.

Курловіч з Сямёнам яшчэ не выйшлі з купэ, калі Міхась раптам убачыў іх. Яны стаялі, узіраючыся ў твары людзей, што выходзілі з цягніка. Заўважыўшы, як змяніўся выраз твару Міхася, Сямён таксама глянуў у той бок і спытаў:

— Яны?

— Яны. Пайшлі, пазнаёмлю.

— Не. У наступны раз. Каардынаты мае запісаў?

— Запісаў. Сустрэнемся. Бывай.

— Бывай. Ведаеш, Міхась, ты — добры мужык. Ну, удачы!

— Патэлефануй, як уладкуеш справы.

Яны пацiснулі адзін аднаму рукі і выйшлі з вагона. Жонка адразу ж убачыла Курловіча. Толькі сказала сыну:

— Глядзі: тата!

Сын радасна падляцеў да бацькі. Той узяў сына на рукі, прыціснуў да сябе. Падышла жонка. Абняліся.

...Сямён бачыў гэтую сцэну... Раптам ён кінуўся да білетных кас. Праз гадзіну цягнік імчаў яго назад — да жонкі і дачкі...

*12. 06. 2007 г.*

# РУЖА

Пранізліва-чысцюткая бель паўстала вакол, напаўняючы прастору нейкім дзіўным спакоем.

Дзяніс расплюшчыў вочы і, яшчэ не разумеючы, дзе ён знаходзіцца — у сне ці наяве, — доўга прывыкаў да новага адчування — лагоды ва ўсім целе і адначасова поўнага нежадання ўставаць, таму што зразумеў самае галоўнае: сёння ж нядзеля і нікуды спяшацца не трэба! Прывыклы кожны дзень ўставаць вельмі рана, Дзяніс толькі ў рэдкі выхадны дзень адчуваў сябе па-сапраўднаму шчаслівым — проста таму, што нікуды не трэба ляцець; у дзень, калі такое нясмелае «хачу» не падпарадкоўваецца настойліваму «трэба». Начапіўшы акуляры, зірнуў на гадзіннік: ого, дзесяць гадзін ужо! Рашуча падняўшыся, паклыпаў у куток, дзе ляжалі гантэлі і невялікая штанга. Праходзячы каля люстэрка, міжволі зірнуў у яго. На Дзяніса з люстэрка глядзеў заспаны твар чалавека «злёгку за трыццаць», з ускудлачанымі русымі валасамі, носам «бульбачкай», маленькімі шэра-блакітнымі вочкамі, якія нібы схаваліся за шклом акуляраў. Ад вачэй разыходзіліся павуцінкі маршчынак, калі ўсмешка кранала твар, што зусім не псавала яго, а наадварот, рабіла больш даверлівым і вясёлым.

Пасля зарадкі, якую Дзяніс прывык рабіць кожны дзень, ён, прыняўшы душ, накіраваўся на кухню і, падышоўшы да акна і расчыніўшы фортку, раптам быццам аслупянеў: у кастрычніцкі прыгожы ранак нібы ўварвалася зіма! Яшчэ ўчора ўся зямля была ўслана лісцем, рознакаляровым, чароўным, як сама восень. А сёння гэты пярэсты дыван быццам бы пасівеў: на ім ляжаў лебядзіным пухам снег, які, як ні дзіўна, зусім не хацеў

раставаць, і з-пад гэтага бялюткага чыстага снегу быў бачны дзівосны лісцвяны покрыў — восень нібы апранула паверх свайго звычайнага ўбору снежна-белы — убор нявесты. Вочы яе схаваліся пад танюсенькім вэлюмам тумаload, якія лёгкай дымкаю на гарызонце злучалі неба з зямлёю. Дзяніс міжволі прыгадаў сваё вяселле, калі вэлюм скрываў вочы яго Ганначкі-Ганулькі — зялёныя, ясныя, чыстыя, шчырыя, такія глыбокія, што ў іх можна было патануць... Але гэта было вясною — шмат год таму, і іх сыну хутка споўніцца столькі, колькі было тады Дзянісу, калі яны сталі мужам і жонкаю... Як быццам гэта было ўчора... Дзяніс раптам схамянуўся, зірнуў на гадзіннік: хутка ж вернуцца Ганна з Алесем! Успомніў, што паабяцаў прыгатаваць сняданак, пабег да халадзільніка — там пуста. «Скокну ў магазін!» — вырашыў ён.

Збягаючы па лесвіцы, Дзяніс раптам заўважыў, што ў паштовай скрыні штосьці ёсць. «Пагляджу, калі буду вяртацца з магазіна», — махнуў ён рукою і пабег далей. Па дарозе чамусьці падумалася аб тым, што Алесь абяцаў пазнаёміць іх са сваёй дзяўчынай — Машай, з якой летась сустрэўся ў лагеры. «Ён такі ўжо вялікі і такі яшчэ маленькі, наш Алесь! — падумалася Дзянісу. — Хаця ўжо сямнаццаты год ідзе. І Ганна нарадавацца не можа, які ён самастойны».

Вяртаючыся дадому, Дзяніс ледзь не праскочыў паштовай скрыні. Ключ некалькі разоў павярнуўся, шчоўкнуў замок — і дзверцы расчыніліся. З чорнай шчыліны на падлогу раптам слізгануў белы прамавугольнік. Дзяніс нахіліўся, падняў яго, кінуў позірк на адрас — адкуль прыйшло пісьмо? — і ягоныя рукі задрыжалі, а сэрца затахкала так, быццам бы хацела выскачыць з грудзей, — бязлітасна, балюча, з надрывам. Дзяніс яшчэ раз глянуў на знаёмы почырк і, не верачы сваім вачам, яшчэ і яшчэ раз перачытваючы знаёмы з юнацтва адрас, баяўся парушыць цэласнасць канверта, зірнуць у ягоную глыбіню, убачыць там штосьці да болю знаёмае, блізкае...

Падняўшыся на свой паверх і паставіўшы сумкі на падлогу, Дзяніс апусціўся ў крэсла і асцярожна, і разам з тым нецярпліва, пачаў разрываць канверт. Ён вельмі баяўся пашкодзіць пісьмо, але, нарэшце зазірнуўшы ў канверт, убачыў там ружу — засохлую, з пажоўклымі пялёсткамі, з кароткім тонкім сцяблом і нават з дзвюма калючкамі на ім. Маленькая чырвоная ружа — яе ружа, Тані... Яго Тані...

Ружа ў канверце — і больш нічога, ніякага ліста... Дзяніс раптам зразумеў усё...

* * *

...Электрычка імчала, разрываючы цемру і патокі ветру. Халодным верасьнёўскім ранкам, калі нават птушкі лянуюцца выводзіць свае мілагучныя трэлі, а сонца не спяшаецца паказвацца над гарызонтам, усё здавалася панурым і маўклівым. Людзей у вагоне было нямнога (шэсць гадзін раніцы ўсё ж такі), хацелася спаць, а ехаць заставалася цэлую гадзіну. Апошні вагон, людзей амаль няма. Дзяніс салодка пацягнуўся, прадчуваючы цудоўны адпачынак.

Тое, што адбылося потым, адаб'ецца ў ягонай памяці назаўсёды. Дзяніс сядзеў якраз насупраць дзвярэй у наступны вагон. Раптам праз шкло дзвярэй ён убачыў дзявочы твар — увесь у слязах, барвовы. У вачах — страх, адчай. Слабай рукою імкнецца расчыніць цяжкія дзверы, тыя не паддаюцца. Дзяніс ускочыў, дапамог дзяўчыне. Тая кінулася да яго: «Дзядзечка, дапамажыце! Матульцы маёй раптам дрэнна стала. У яе, ведаеце, слабае сэрца, хоць і маладая яшчэ.» Тое, што Дзяніс — урач, дзяўчына, вядома, не ведала. Але ў яе не было выбару — яна проста верыла, што свет не без добрых людзей...

Ужо потым, праз нейкі час, Дзяніс скажа сабе, што вочы дзяўчыны, яе позірк здаліся яму знаёмымі, хоць бачыў ён яе ўпершыню. Панёсся за дзяўчынай у суседні вагон. Чатыры

чалавекі ў ім. Стаяць каля лаўкі, на якой ляжыць жанчына. Падляцеў. Людзі расступіліся. Машынальна, як калісьці вучылі ў медінстытуце, праверыў пульс, зірнуў у твар... ледзь сам не страціў прытомнасць. Таня... Гэта была яна. Яго Таня — яго першае каханне, юнацкая мроя, анёл яго мар і надзей. Нават Таніны і яго бацькі называлі іх жаніх і нявеста. А яны і не спрачаліся з імі, ужо тады разумелі пра тое, што існуе той самы звычайны чалавечы лёс, якому, як яны лічылі, падуладна ўсё на свеце. Але лёс бывае розным — для кожнага з нас свой...

Гэта вырашыла само жыццё: параскідала іх у розныя бакі — у яго сям'я, сын; у яе — дачка і, напэўна, муж.

Як медык, Дзяніс заўсёды браў з сабою ў дарогу ўсё самае неабходнае: ён баяўся, што калі, не дай Бог, апынецца ў такой сітуацыі, будзе мець заўсёды пад рукой усё, што патрэбна.

Дзяніс усё зрабіў, як трэба. Праз некаторы час жанчына расплюшчыла вочы, убачыла яго, спачатку не пазнала. Потым, праз хвіліну-другую, пачуўшы яго голас, раптам нешта ўспомніла — і сляза пакацілася па яе твары. «Дзяніс? Гэта ты? Праўда? А мне падалося, што я ўжо на небе. А гэта ты, Дзяніс. Як ты трапіў сюды? Цябе, напэўна, сам Бог паслаў?»

«Як ты сябе адчуваеш?» — спытаў ён, баючыся, што той цудоўны сон, які бачыць, зараз скончыцца. «Добра, — адказала яна, адчуваючы не толькі палёгку ва ўсім целе, але і адчуванне радасці і шчасця — таго, да канца неспазнанага, таго, амаль дзіцячага, якое было шмат гадоў таму. — Ты зараз зноў знікнеш, як той сон? Як я цябе знайду?» Дзяніс пакінуў нумар свайго тэлефона: «Тэлефануй, я буду чакаць». Абвясцілі наступную станцыю. «Ой, гэта ж наша! — раптам успомніла Таня. — Рыхтуйся, Машачка, на наступным выходзім. Памятаеш?» Тая, ужо супакоеная, падрыхтавалася выходзіць. І — быццам успомніла нешта: «Дзядзечка, вялікі дзякуй вам, што дапамаглі матулі!».

«Няма за што», — адказаў ён і сумеўся: настолькі падобная яна была на маці...

Таня патэлефанавала праз некалькі дзён, якраз у суботу, калі Дзяніс толькі збіраўся адпачыць пасля бяссоннай ночы: дзяжурства ў бальніцы выдалася вельмі цяжкім, напружаным. Ён толькі лёг, як пачуўся званок. «Яшчэ раз дазволь сказаць табе дзякуй. За ўсё», — пачуўся Танін голас у трубцы. «А асабіста сказаць тое ж самае слабо?» — чамусьці вырвалася ў яго.

Пасля таго выпадку яны сустрэліся ўсяго адзін раз. Адзін раз на ўсё жыццё — дарослае, сумленнае, псеўдаўзаемнае. У цемры гасцінічнага нумара яны ўспаміналі — і не маглі спыніцца — усё, што звязвала іх у гэтым жыцці. Таня вельмі любіла ружы, і Дзяніс добра памятаў гэта. Тым больш, што ў гэты раз ён для яе падрыхтаваў цудоўны букет. Але тое, што ён пачуў ад Тані, вельмі ўразіла яго. «Я захоўваю ўсе твае кветкі, усе твае ружы», — сказала яна Дзянісу. Яго пацалунак быў узнагародай ёй за яе цярплівасць і вернасць...

...Наранку, перад тым, як развітацца, Таня сказала Дзянісу: «Сёння ўвечары самалёт перанясе мяне ў іншае жыццё — у Амерыку. Я ад'язджаю туды па кантракце на два гады. Спачатку асвоюся, потым забяру Машу — няхай вучыцца тут да Новага года, — правільней кажучы, да Каляд. Муж ужо там — у яго сумеснае прадпрыемства. Толькі аб адным прашу: не прыязджай у аэрапорт — не люблю доўгіх провадаў. «Яна раптам адвярнулася, стрымліваючы слёзы, але яны дзвюма нітачкамі-ручайкамі пацяклі з яе прыгожых вачэй. Кінуўшыся да Дзяніса, Таня абвіла рукамі яго шыю. Яна цалавала яго твар, вочы, губы. Дзяніс адчуваў, як Таніны слёзы пякуць твар, шыю, але не мог зварухнуцца — стаяў, як аслупянелы. Ён запомніў кожнае яе слова, але штосьці, сказанае ёю, не давала яму спакою. А што — ён не мог зразумець. Адчуванне, што яна едзе ад яго кудысьці і калі вернецца — невядома, было такім моцным і, у першую чаргу, такім начаканым, што Дзяніс не хацеў і баяўся сказаць хоць слова, нібы ад гэтага штосьці зале-

жала. І яшчэ баяўся страціць момант шчасця — такога нечаканага і жаданага, на першы погляд бязмежнага, але такога недаўгавечнага, крохкага...

* * *

Увечары Дзяніс дзяжурыў у бальніцы. На шчасце, работы было мала, таму што ўсё валілася з рук, розныя думкі не давалі спакою. І асабліва балюча думалася яму, калі ўспамінаў Таніны словы перад расстаннем з ёю. Што дзіўнага было ў іх? Дзяніс успамінаў і не мог успомніць. «Сёння ўвечары (пачатак яе слоў быў прыкладна такі) самалёт перанясе мяне ў другое жыццё...» «Стоп! У якое гэта другое жыццё?..» — падумаў Дзяніс. Раптам у пакой уварвалася медсястра. «Дзяніс Сяргеевіч! — закрычала яна. — Ідзіце паглядзіце, што перадаюць «Навіны»! У аэрапорце ў час вылету разбіўся і загарэўся самалёт!» Не дачакаўшыся Дзяніса, дзяўчына пабегла ў хол, дзе стаяў тэлевізар. Дзяніс кінуўся за ёю. Ён раптам успомніў, што не спытаў у Тані ні нумара рэйса, ні нават у які горад яна ляціць. Ён падумаў, што такіх супадзенняў быць не можа, а калі і можа, то толькі не з ёю... не з ім. Так павінен, напэўна, думаць кожны на яго месцы: «няшчасце можа здарыцца з кожным, але не са мною...».

У холе сабраліся хворыя і ўрачы з усяго аддзялення. Карэспандэнт, малады чарнявы хлопец, выразна вымаўляючы кожнае слова, расказваў аб здарэнні: «...Самалёт, выконваючы рэйс "Мінск – Масква – Нью-Ёрк", пацярпеў аварыю ў аэрапорце на ўзлётнай паласе. Адзін з рухавікоў "Боінга" яшчэ на ўзлёце загарэўся. Самалёт, толькі адарваўшыся ад зямлі, раптам рухнуў уніз. Ад удару аб зямлю фюзеляж "Боінга" раскалоўся, хваставая частка адвалілася. Полымя адразу шуганула па ўсім корпусе. Пасля некалькіх выбухаў стала зразумела, што ніхто не выжыў. Але... — карэспандэнт на імгненне змоўк, прыслухоўваючыся да навушніка, які прыціскаў адной

рукою да вуха, каб добра было чуваць, што яму гавораць. — Але, як толькі што стала вядома, некалькі чалавек выжыла — іх прозвішчы зараз удакладняюцца. Яны выжылі толькі таму, што знаходзіліся ў хваставой частцы самалёта, якая адразу ж адвалілася пасля ўдару «Боінга» аб зямлю. На гэты час вядома толькі тое, што гэта чатыры чалавекі — двое мужчын і дзве жанчыны. Усе чацвёра адпраўлены ў бальніцу. За развіццём падзей мы будзем сачыць і інфармаваць вас, паважаныя тэлегледачы, кожную гадзіну. Заставайцеся з намі».

Карцінка на экране змянілася, але ўжо ніхто і не глядзеў туды. Усе раптам зразумелі, што здарылася. Кожны падумаў пра сваё, хаця ўсе думалі пра адно і тое ж. Яны спачувалі родным і блізкім тых, хто загінуў, гаравалі аб загінуўшых, ставілі сябе на месца іх родных і дзякавалі Богу, што няшчасце абышло іх сем'і. У галаве Дзяніса пульсавала думка: «Нью-Ёрк — гэта Амерыка. Таня ляцела на самалёце ў Амерыку. Але ў які амерыканскі горад? Не абавязкова гэта будзе Нью-Ёрк». Ён раптам ускочыў, паляцеў да тэлефона. Патэлефанаваў у аэрапорт. «Дзяўчына, мілая! Скажыце, калі ласка, якія рэйсы былі сёння, пачынаючы з шасці гадзін вечара, у Амерыку? Так, запісваю. — Дзяніс выхапіў з рук медсястры ручку. — На Вашынгтон у 19.40, на Нью-Ёрк у 20.17, і (ён зірнуў на гадзіннік, які паказваў 20.44) наступны рэйс толькі заўтра? Вялікі вам дзякуй!» Выходзіла, што ўвечары былі толькі два рэйсы на Амерыку — на Вашынгтон у 19. 40 і на Нью-Ёрк — той самы самалёт, які пацярпеў аварыю. Застаецца спадзявацца, што Таня ляцела першым рэйсам — на Вашынгтон. І чаму толькі ён не спытаў у яе нумар рэйса або назву горада? Змірыўся з тым, што яны больш не ўбачацца — хаця б бліжэйшыя два гады? А калі яна ляцела тым самым, апошнім, рэйсам? «Самалёт мяне перанясе ў іншае жыццё...» — гэта былі яе словы. Хацелася выць і рваць на сабе валасы. Проста так сказаныя словы набывалі жудасны сэнс. Дзяніс не верыў, што ўсё так скончыцца, што

лёс — гэта не пустыя словы. Апошняй зачэпкай, нават у самай безнадзейнай сітуацыі, з'яўлялася паведамленне аб тым, што чацвёра засталіся ў жывых. «Хто яны і ў якую бальніцу іх адвезлі? — Дзяніс зноў глянуў на гадзіннік. З моманту катастрофы прайшло ўжо амаль паўгадзіны. — Паколькі быў пажар, то іх перш за ўсё адвязуць у суседняе, апёкавае, аддзяленне (калі толькі, вядома, павязуць у нашу бальніцу)». У галаве Дзяніса выстройваўся ланцужок думак, адна горшая за другую. Ён нерашуча ўзяў тэлефонную трубку, набраў нумар суседняга аддзялення. «Міхась Сямёнавіч, гэта ты? Спачатку не пазнаў. Багатым будзеш! Што? Я не глухі — гэта ў цябе такі голас сёння! Слухай, я сур'ёзна. Ты чуў пра катастрофу самалёта? А тое, што чацвёра з іх выжылі, чуў? Што? Іх да нас у клініку прывезлі? У тваё аддзяленне? Сапраўды? А ты не ведаеш іх прозвішчаў? Пакуль не... Слухай, Міхась Сямёнавіч, я зараз да цябе ў госці зайду. Добра?» — і Дзяніс, не дачакаўшыся наступнага пытання, выскачыў з хола і паляцеў уніз па лесвіцы.

На другім паверсе таксама panavalі адчай і смутак. Ужо ўсе ведалі, што сюды прывезлі чацвярых чалавек, якія выжылі ў страшэннай катастрофе. Урачы гатовы былі зрабіць усё — магчымае і немагчымае, каб гэтыя людзі змаглі хутчэй устаць на ногі і хаця б часткова пазбавіцца ад болю, які назаўсёды пасяліўся ў іх сэрцах.

Дзянісу падаліся вечнасцю гэтыя некалькі хвілін, пакуль ён дабег да дзвярэй суседняга аддзялення. Даляцеўшы да медыцынскага паста, Дзяніс убачыў, што ў адну з палат зайшла група людзей у белых халатах. Ён кінуўся туды. Заўважыўшы сярод медыкаў прыгожага каржакаватага цёмнавалосага мужчыну, на выгляд гадоў сарака або больш, Дзяніс кінуўся да яго: «Ну, што тут у вас? Хто выжыў?» — Міхась Сямёнавіч нічога не адказаў, толькі цяжка ўздыхнуў. Ён шмат чаго бачыў у жыцці, але ўсё роўна не мог прывыкнуць да людскога гора: да гэтага, лічыў ён, увогуле прывыкнуць немагчыма.

З Дзянісам іх звязвала даўняе сяброўства, хоць Стральцоў быў на сем гадоў старэйшы за яго. У свае сорак два ён меў ужо за плячыма вучобу ў медвучылішчы, медінстытуце, зараз завочна вучыўся ў ардынатуры і пісаў дысертацыю, хаця лічыў галоўным дасягненнем у жыцці сваю сям'ю. Міхась Сямёнавіч вельмі любіў паўтараць, што жонка, дзве дачкі, цешча (цешча жыла з імі пасля таго, як пайшоў з жыцця яе муж...) і сабака — галоўнае ягонае багацце.

Стральцоў ніяк не мог зразумець, чаму Дзяніс так цікавіцца пасажырамі «Боінга», якія выжылі, чаму у яго так гарацьвочы і палае твар. Міхась Сямёнавіч нават баяўся падумаць аб тым, што ў гэтым самалёце маглі быць родныя яго сябра. Таму асцярожна спытаў: «Ты кагосьці са сваіх знаёмых шукаеш, Дзяніс?». Дзяніс на імгненне збянтэжыўся, не ведаючы, што адказаць, а потым, спыніўшыся каля Стральцова і гледзячы яму прама ў вочы, выдавіў з сябе: «Вельмі дарагога для мяне чалавека, — і, дакрануўшыся да пляча сябра, дадаў: — «Потым раскажу, добра?» Дзяніс бачыў на ложках трох чалавек — адну жанчыну і двух мужчын. Па нейкай прычыне яны апынуліся ў адным памяшканні. Кінуўшы позірк на твар жанчыны, Дзяніс адразу зразумеў, што гэта не Таня. Страшэнная скарынка апёку пакрывала частку твару немаладой ужо жанчыны, якая нерухома ляжала, прыплюшчыўшы вочы, мабыць, пад уздзеяннем абязбольваючых прэпаратаў. У галаве Дзяніса мільганула адразу некалькі думак. Першай была маланка-надзея: «А што, калі Таня ўсё ж адправілася ў Вашынгтон у 19.40 і даволі хутка будзе там? — і адразу ж другая, здрадніцкая: — «А дзе ж апошняя з выжыўшых жанчын? Няўжо гэта Таня?». У душы Дзяніс згаджаўся з першай думкай, але не выключаў і другую. Ён маліў Бога за тое, каб Таня была ў вашынгтонскім лайнеры. Дзяніс звярнуўся да Стральцова: «Міхась, скажы, а дзе яшчэ адна жанчына — усяго ж людзей было чацвёра?». Той адразу ўспомніў: «Прабач, я табе адразу не сказаў: тую жанчыну адправілі

ў тваё аддзяленне — агонь яе не крануў, затое ў яе некалькі пераломаў і рваных ран...» Дзяніс не даслухаў да канца, кінуў: «Дзякуй!» — і панёсся па лесвіцы наверх, да сябе. Даляцеўшы да медыцынскага паста, ён спытаў у медсястры, у якой палаце знаходзіцца новенькая, але забыўся спытаць прозвішча пацыенткі. «У палаце № 13», — быў адказ. Дзяніс не быў прымхлівым, але тут адчуў, як мурашкі пабеглі па спіне.

* * *

У палаце № 13 панавалі цішыня і паўзмрок. У невялікім памяшканні стаялі два ложкі, адзін з якіх пуставаў. Зайшоўшы ў палату, Дзяніс адразу быццам аслеп і аглух. Ён ясна чуў толькі адзін гук — тахтанне сэрца, якое, здавалася, зараз вырвецца з грудзей, — такое моцнае было напружанне. Дзяніс баяўся зірнуць у твар жанчыны і не пазнаць у ёй Таню — і яшчэ больш баяўся пазнаць менавіта яе...

Ён не бачыў, як за ім у палату ўвайшоў Стральцоў (ён вельмі спужаўся за сябра і прыйшоў, каб дапамагчы, калі спатрэбіцца) і стаў у дзвярах.

...Дзяніс у дзяцінстве вельмі нядрэнна маляваў — асабліва любіў што-небудзь убачыць і потым, па памяці, аднаўляў гэты вобраз. Калісьці ён зрабіў і Танін партрэт, як заўсёды, па памяці. Тады гэта была маленькая чарнявая дзяўчынка з усходне-міндалепадобнымі вачыма колеру малахіту, злёгку кірпаценькая, з прыемным выразам твару. І — над верхняй губою — маленечкая кропачка-радзімка, якая заўсёды надавала шарму, рабіла яе вобраз нейкім прывабным, загадкавым, таямнічым... Перад развітаннем Дзяніс чамусьці захацеў зноўку напісаць Танін партрэт: гэта была ўжо не тая маленькая дзяўчынка — у вачах была адлюстравана сталасць, розум і развага дастаткова вопытнага чалавека. І яшчэ гэта была вельмі прыгожая жанчына, для якой галоўным у жыцці, па яе словах,

было пачуццё ўнутранай свабоды і адчуванне быць любімай і патрэбнай родным.

Дзяніс падсунуў табурэтку і сеў — ён не мог больш стаяць. Пачаў узірацца. Кроў стукала ў скронях... перад вачамі нейкі туман... Чорныя валасы на белай навалачцы. Вочы заплюшчаныя. Твар збялелы, ні крывінкі ў ім. Дзяніс раптам пахіснуўся і ледзьве не зваліўся з табурэта: над верхняй губою — вельмі знаёмая яму кропачка-радзімка... Ён не хацеў верыць і адначасова быў разгублены і ўзрадаваны, што яго Таня — жывая; што гэта яна з усіх тых, хто быў у самалёце, засталася жывою, для яе дачкі, для яго, Дзяніса. Калі Бог яе выратаваў — Дзяніс быў упэўнены, — Таня павінна выжыць, абавязкова... Дзяніс прысеў на яе ложак, паклаў сваю далонь на яе. Нешта жалезнымі абцугамі сцяла яго грудзі, сціснула так, што ён пахіснуўся — і слёзы паліліся з яго вачэй — слёзы адчаю, болю і... палёгкі: на шчасце, яму не прыйшлося шукаць яе сярод мёртвых — яна выжыла, яна будзе жыць, яна жывая! Дзяніс узяў Таніну далонь у сваю... Стральцоў падышоў да яго ззаду, паклаў руку на плячо, коратка сказаў: «Заставайся тут, ні аб чым не думай — за цябе падзяжураць», — і пакінуў Дзяніса аднаго. Некалькі разоў у пакой заходзіла медсястра, але, убачыўшы нерухомую постаць Дзяніса, адразу ж пакідала яго аднаго. Таня спала пад уздзеяннем медыкаментаў, і Дзяніс з нецярпеннем чакаў, калі яна расплюшчыць вочы...

За акном барвовае неба здавалася нібы аблітым крывёю. Аблокі, што ў весь дзень хадзілі па небе, падсвечаныя сонцам, раздзьмуўшы свае ветразі, зараз здаваліся суцэльнай цёмнай хмарай, якая пераліваласяся, зіхацела ўсімі колерамі ўжо заходзячага сонца. Яно, развітваючыся з зямлёю, адыходзіла, хоць і на нейкі час, у цемру Сусвету, не спыняючы свайго руху. Праз расчыненую фортку вецер даносіў гукі вячэрняга горада.

...Дзяніс бачыць сябе ў салоне самалёта. У крэслах злева ад яго сядзяць Ганна з Алесем, а справа — Таня. Салон

напаўняецца раўнамерным гулам рухавікоў. «Самалёт рыхтуецца да ўзлёту», — здагадаўся Дзяніс. Прышпіліўшы рэмень, ён адчувае, як самалёт бярэ разгон. Праз ілюмінатар бачна, як зямля мільгае, а потым застаецца дзесьці ўнізе. Але нядоўга. Раптам Дзяніс адчувае моцную вібрацыю корпуса. Адкульсьці паваліў густы дым. У салоне пачалася паніка. Раздаўся моцны трэск, і падлога пад нагамі людзей пачала раз'язджацца. Некалькі чалавек з крыкам паляцелі ўніз. Ганна і Алесь, не прышпіленыя да сваіх крэслаў, пасля таго, як лайнер нахіліўся носам, зляцелі са сваіх месцаў і пакаціліся па праходзе. Дзяніс, расшпіліўшы рэмень бяспекі, ускочыў, каб дапамагчы ім, але ззаду раптам пачуў адчайны крык: «Дзяніс, дапамажы! Калі ласка, зрабі што-небудзь!». Дзяніс павярнуўся на крык і ўбачыў, што той рад крэслаў, дзе ён толькі што сядзеў, адным бокам правальваецца ў пралом. І ў адным з гэтых крэслаў сядзела Таня, яна была прышпілена рамянём бяспекі. Бяспекі, якой тут, у салоне, ужо не было. «Дзяніс, дапамажы!» — раптам пачулася і з другога боку. Жонка і сын ляжалі на падлозе, моцна ўчапіўшыся рукамі ў край правалу, ногі іх звісалі ўніз. Яны літаральна чапляліся за жыццё. Дзяніс, не ведаючы, у які бок кінуцца спачатку, усёй душою адчуў, што дапамагчы адразу ўсім будзе немагчыма і што трэба, не задумваючыся ні на хвіліну, нарэшце зрабіць свой выбар... І ён рашуча пабег праз агонь, праз дым да жонкі з сынам. «Дзяніс, Дзяніс! Ты куды? Вярніся! Дзяніс! Дзяні-і-і-іс!» — ляцеў, затухаючы, за ім Танін голас.

«Дзяніс, — зноў пачуўся Танін голас, зусім ужо блізка. — Няўжо гэта ты?» Дзяніс расплюшчыў вочы і ўбачыў Таню, якая здзіўлена пазірала на яго, усё яшчэ не верачы сваім вачам. Яна не магла ўстаць з ложка, нават сесці — была ўся ў гіпсе, але ясна разумела: усё скончылася, яна жывая, і перад ёю, як добры анёл, ужо ў другі раз (Таня добра памятала, хто аказаў ёй дапамогу ў электрычцы!) знаходзіцца ён,

яе Дзяніс. Ён з дзяцінства быў «яе Дзянісам», яе талісманам у жыцці, добрай прыкметай... І вось зараз, убачыўшы яго тут, Таня чамусьці адразу падумала аб тым, што наперадзе ўсё будзе добра, калі з ёю заўсёды будзе ён. Памяць канчаткова да яе яшчэ не вярнулася, але Тані не хацелася ні аб чым думаць. З яе вачэй скаціліся дзве слязінкі, і свабоднаю рукою (другая была ў гіпсе) жанчына змахнула іх, прыкрыўшы твар. «Я не хачу, каб ты бачыў мяне такой. Ты...» — Таня не паспела дагаварыць, як Дзяніс перарваў яе: «Якой гэта «такой»? Я ж доктар, а ты — мая пацыентка. Мы якраз зараз і знаходзімся ў бальніцы, дзе я працую. Так што табе, мая дарагая, прыйдзецца выконваць усе мае рэкамендацыі».

Дзяніс усё ніяк не мог скінуць з сябе рэшткі сну, хаця яго вельмі ўзрадавала тое, што увесь жах быў усяго толькі сном.

Раптам дзверы расчыніліся, і ў палату ўляцела дзяўчына, расчырванелая, запыханая, кінулася да Тані, заплакала: «Матулечка, дзякуй Богу, ты жывая! А мне толькі што патэлефанавалі. Я, як толькі даведалася пра самалёт, думала, што памру, калі ты... калі з табой... будзе дрэнна...» Яна запнулася, адвярнулася да акна, і плечы яе затрэсліся. Дзяніс падышоў, асцярожна паклаў рукі ёй на плечы, сказаў: «Не плач, даражэнькая. Мамачка твая жывая, яна хутка папravіцца. Я табе абяцаю. Я доктар, і вылечу яе. Вер мне, добра? — Дзяўчына павярнулася да Дзяніса, падняла мокры ад слёз твар, заківала галавой. — Падыдзі да матулі, пасядзі разам з ёю. Ты ёй так патрэбна зараз! А я пакуль што пакіну вас адных, але хутка вярнуся. Тваёй матулі зараз патрэбен спакой — і ніякіх хваляванняў». З гэтымі словамі Дзяніс устаў і выйшаў з палаты, прычыніўшы за сабой дзверы. У ягонай душы бушавала бура, і яму хацелася пабыць аднаму, разабрацца з усім. У ардынатарскай, на шчасце, нікога не было, і Дзяніс зайшоў сюды, зачыніў за сабою дзверы на ключ.

* * *

Дзяніс дакладна не памятаў, колькі часу прайшло, але неўзабаве ён пачуў стук у дзверы. Ён не адазваўся. Стук паўтарыўся, і пачуўся голас медсястры: «Дзяніс Міхайлавіч, вы тут? Вас клічуць у 13-ю палату!».

Не даслухаўшы, Дзяніс расчыніў дзверы і накіраваўся ў палату да Тані. Яна ляжала і ўжо ўсміхалася, слухаючы дачку, якая ёй аб чымсьці расказвала. Таня падняла на Дзяніса вочы і сказала: «Дзяніс Міхайлавіч, я вам яшчэ не прадставіла сваю дачку, з якой вы ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца — тады, у электрычцы!». «Маша», — дзяўчынка ўсміхалася аднымі вачыма. Яна шчыра падзякавала яму за ўсё, а ён злёгку захваляваўся: Маша была вельмі падобная на сваю матулю — такая ж чорнавалосая, з зялёнымі вачыма, з прыгожа акрэсленымі рысамі твару. Ёй на выгляд было 16–17 гадоў. «Равесніца майго Алеся», — падумалася Дзянісу. Ён сказаў: «Мне надзвычай прыемна зноў убачыцца з табой, Машачка. Ты вельмі падобная на сваю матулю. «Тут у палату зазірнула медсястра. «Міхась Сямёнавіч збірае кансіліум, ваша прысутнасць неабходна», — паведаміла яна і, не дачакаўшыся адказу, паляцела далей.

«Выбачайце, калі ласка, даражэнькія мае, але мне прыйдзецца на некаторы час пакінуць вас», — Дзяніс паглядзеў на гадзіннік і падняўся. Ён нават сам не заўважыў, што звярнуўся да Тані з Машаю, як да даўно знаёмых, нават родных яму людзей; не бачыў, што Таня зірнула на яго з цеплынёю, слёзы зноў бліснулі на яе вачах: яна чамусьці баялася, што Дзяніс можа пакінуць іх назаўсёды, яна баялася адзіноты, безабароннасці, ёй так неабходна была яго падтрымка. Дзяніс быццам бы пачуў яе. «Вы не хвалюйцеся, як толькі кансіліум скончыцца, адразу ж вярнуся», — паабяцаў Дзяніс, і Таня адразу паверыла яму. Як толькі Дзяніс выйшаў за дзверы, Маша заўважыла: «У мяне такое ўражанне, што Дзяніс Міхайлавіч размаўляў з та-

бою, як са старой знаёмай, і ў электрычцы таксама — ён, як я памятаю, называў цябе па імені». «А як жа інакш, — адказала ёй Таня, — ён сапраўды мой даўні знаёмы, яшчэ з дзяцінства. Але гэта было так даўно, што не хочацца варушыць мінулае...» Таня раптам замоўкла і, гледзячы кудысьці ўбок, цяжка ўздыхнула.

З таго часу Дзяніс заходзіў да Тані кожны дзень, але, успамінаючы той дзіўны сон і спачуваючы ёй пасля ўсяго перажытага, ён адносіўся да яе, як да старога сябра, і ніяк інакш. Таня адчувала гэта, але нічым не папракала яго, хаця лічыла самым надзейным мужчынам на свеце. Свайго мужа Таня апошні раз бачыла ў мінулым годзе, у жніўні, калі той на некалькі дзён прыязджаў, каб падпісаць з партнёрам па бізнесе нейкія важныя дакументы. Ён патэлефанаваў Тані чамусьці толькі з аэрапорта, калі ад'язджаў, і ў яе склалася адчуванне: ён проста забыўся, што ў яго ёсць сям'я. Ён нават не спытаў нічога пра Машу, як быццам яна для яго — пустое месца. А ёй хацелася звычайнага, «простага чалавечага шчасця», як пішуць бульварныя раманы. І пакуль гэта «простае чалавечае шчасце» ёй мог даць толькі адзін чалавек — Дзяніс Сакалоўскі, яе сябар дзяцінства, яе каханы чалавек — адзіны ў свеце, хто мог падтрымаць Таню зараз, у такім становішчы. Яна вельмі баялася за Машу, за яе будучыню. У яе павінен быць сапраўдны бацька, а не такі, што нават забыўся пра існаванне дачкі. Але Таня добра разумела, што нельга будаваць асабістае шчасце на чужым няшчасці, разбураючы чужое гняздо. Яна, вядома, магла зрабіць усё, каб Дзяніс быў яе мужчынам, але Таня добра памятала аб тым, што у яго ёсць жонка і сын, і баялася зрабіць яму балюча. Што такое звычайны эгаізм, яна ў поўнай меры адчула, калі выйшла замуж, і не хацела лезці ў чужую сям'ю, тым больш, што ёй дастаткова было асабістых праблем. Тані проста было салодка на душы ад таго, што Дзяніс не кінуў яе ў такой сітуацыі, і, як урач і ча-

лавек, ён прыйшоў ёй на дапамогу — лячыў не толькі цела, але і душу. Таня была вельмі ўдзячна Дзянісу за гэта, хаця лёгкая зайздрасць да ягонай жонкі — тыповая жаночая рыса — не пакідала яе. І вось зараз, калі каля яе быў такі надзейны мужчына, Таня баялася штосьці змяніць, парушыць у іх адносінах; баялася, што штосьці зменіцца, калі яна нарэшце паправіцца і пакіне бальніцу, дзе адчула, што можа па-сапраўднаму быць шчаслівай, шчаслівай па-свойму...

А Дзяніс, бачачы, як Таня папраўляецца, робіць першыя крокі, радуецца за яе, праводзіў з ёй шмат часу, каб падтрымаць яе, дапамагчы. І яна, ўдзячная яму, выконвала ўсе яго рэкамендацыі, слухала парады... Так прайшло два месяцы.

* * *

Гэты ліхтарны слуп Дзяніс запомніў з таго часу, як прыйшоў сюды ў першы свой працоўны дзень з дыпломам урача. Пасля аддзела кадраў ён накіраваўся сюды — у хірургічнае аддзяленне, дзе будзе працаваць больш за дзесяць год. Дзяніс да дробязей памятае свой першы працоўны дзень, калі з усімі дакументамі ён як малады спецыяліст накіраваўся сюды, у гэты корпус. У той студзеньскі дзень разгулялася такая завіруха, што нічога не было відаць. І, калі б не гэты ліхтарны слуп, Дзяніс наўрад ці знайшоў бы дарогу...

І нават сёння, як і шмат гадоў запар, ён з удзячнасцю зірнуў на ліхтарны слуп, як на старога знаёмага, і, расчыніўшы да болю знаёмыя дзверы, пакрочыў да медыцынскага паста. За сталом сядзела маладая дзяўчына з русаю касой. Яна размаўляла па тэлефоне, але, убачыўшы Дзяніса, пужліва кінуўшы ў трубку: «Я табе потым патэлефаную», — ветліва павіталася з ім і нешта залапатала. Ён падышоў, узяў журнал запісаў, уважліва агледзеў спіс хворых і заўважыў, што Таніна

прозвішча ў ім адсутнічае. Дзяніс чамусьці адчуў, як яму не хапае яе... Потым, схамянуўшыся, сказаў сабе, што ў яе сваё жыццё, а ў яго сваё...

Ён папрасіў усе запісы за апошнія два месяцы. Перагортваючы старонкі журнала, Дзяніс нарэшце заўважыў яе прозвішча — насупраць было слова «выпісана». Ён уздыхнуў, разумеючы, што больш не хопіць сіл шукаць Таню, кагосьці падманваць — на гэта ён не мог пайсці...

* * *

У гэты майскі дзень усё чамусьці ладзілася, і настрой быў добры. Дзяніс з Ганнай чакалі Алеся, які павінен быў прыйсці не адзін — са сваёй сяброўкай Машай, пра якую яны чулі ўжо шмат такога, што пасля гэтых слоў хацелася Алесеву выбранніцу лічыць амаль ідэальнай парай для іх сына.

Алесь гаварыў, што яго Маша — «цудоўны чалавек, усё вырашыла для сябе ў жыцці — хоча стаць медыкам, урачом, каб прыносіць людзям толькі шчасце і ніякага болю.» «Ведаеш, — гаварыў Алесь бацьку, — Маша кожны раз успамінае нейкага доктара, які, па яе словах, некалькі разоў выратаваў яе маці ад смерці. Як бы я хацеў пазнаёміцца з гэтым доктарам! Вось сапраўдны герой нашага часу! А яшчэ гавораць, што няма ў наш час сапраўдных герояў!..»

Ганулля накрыла стол, Дзяніс сеў з ёю, абняўшы за плечы і счакаўшыся, калі нарэшце прыйдзе гэтая «таямнічая, загадкавая Маша».

Званок у дзверы раптам абвясціў канец чаканню, Ганна пайшла адчыняць дзверы. Дзяніс мог уявіць сабе любую сустрэчу, акрамя гэтай... Дзверы нетаропка расчыніліся, і ў залу ўвайшла яна... Маша толькі вымавіла словы прывітання, як позірк Дзяніса сустрэўся з яе позіркам. Гэта была Таніна дачка! Той жа дзіўны позірк, тыя ж бяздонныя вочы... «Дзяніс

Міхайлавіч! Няўжо гэта вы? — сказала тады Маша, як толькі ўбачыла яго. — А я пра вас столькі расказвала Алесю. «Той стаяў, быццам аслупянелы: «Дык гэты славуты доктар — ты? Ты вырataваў яе маці? Гэта зрабіў ты, тата?..»

Дзяніс тады не ведаў у першы момант, што сказаць, але потым, у глыбокім роздуме, кіўнуў...

* * *

...У глыбіні канверта можна было не шукаць нічога іншага, акрамя засохлай ружы, — гэта Дзяніс зразумеў пасля, бо ўсё якраз было на паверхні...

*14.08.2006 г.*

# ВАРТОЎНЯ

Яны пайшлі ў лепшы свет разам — бабуля і дзядуля — у адзін год. І той пачатак восені 1995-га я запомніў на ўсё жыццё. Адчайны плач прыроды — і не толькі аб прайшоўшым леце, — развітанне з роднай зямлёй птушак, якія чорнымі хмаркамі-чародкамі на нейкі час запаўнялі сумнае неба і, праляцеўшы над голымі палямі, накіроўваліся ў цёплыя краіны, каб неўзабаве вярнуцца да нас, — усё гэта было ў той цяжкі для мяне год. Вясна і лета назаўсёды разлучыла і зноў аб'яднала іх, маіх любімых, родных людзей. Я зноў тады прайшоў шляхамі майго дзяцінства, як і ва ўсіх, непаўторнага — толькі майго...

Адразу за мехдваром пачынаўся калгасны сад. У той год яблыні вельмі добра ўрадзілі: галіны дрэў прыгіналіся да зямлі пад цяжарам пладоў. А я ішоў, і амаль кожнае дрэва нагадвала мне сапраўды шчаслівы час, калі я, дзякуючы дзядулі, адкрываў для сябе гэты цудоўны свет. А адкрыцці чакалі мяне на кожным кроку: кісліца на ўзлеску, крамяны баравічок адразу за бензазапраўкай нашых Галаўнінцаў, некалькі яблынь з салодкімі яблыкамі (я такія асабліва любіў). З дзедавай сумкі (з такой калісьці дзеці ў школу хадзілі) урачыста вымаліся некалькі кавалкаў хлеба з салам, цёмная, з-пад віна, бутэлька з малаком, галоўка часнаку або цыбулі. Да гэтага пачастунку дадаваліся некалькі яблыкаў і груш-дзічак. Аднойчы мне нават давялося пакаштаваць боршч у калгаснай сталоўцы. Жанчына, якая частавала нас смачным супам, даведаўшыся, што я ўнук Міхася Гараб'я (так па-вясковаму клікалі майго дзеда), адразу прапанавала мне дабаўкі, якую, да слова, я ледзьве адолеў...

Каля мехдвара мяне абагнаў камбайн. Падняўшы пыл, ён знік за паваротам. А я сышоў з дарогі і апынуўся каля вартоўні. Але што гэта?

Калісьці мяне здзіўляла гульня ў картачны домік: трэба было з-пад гэтага доміка выцягваць карты, каб хісткая пабудова нейкі час пратрымалася ў некранутым выглядзе. У пройгрышы аказваўся той, «дзякуючы» нязграбнасці якога картачны домік развальваўся. Мне кожны раз чамусьці было сумна, калі ўсё трэба было пачынаць нанова.

Але карціна, якую я ўбачыў у той памятны для мяне 1995 год, прымусіла сэрца біцца, як набат. Вартоўня нагадвала той самы картачны домік, які ўжо даўно выйшаў з гульні з бязлітасным часам. Выцвілыя дошкі былога зялёнага колеру — колеру ўсяго жывога — ляжалі на зямлі, дарэчы, той самай, што нарадзіла тое самае дрэва, з якога і будуем мы сабе дамы, дачы, нават платы і лаўкі. Я прысеў на стары абымшэлы камень ля вартоўні. І нахлынулі раптам мае ўспаміны пра тую восень, якая вяртаецца даволі часта ў маіх снах і якую насамрэч не вярнуць, на жаль, ніколі...

... — Унучак, давай сам, добра? — Міхась Іванавіч, мой дзед, вострыць пруцікі для сала, а я, малы, насаджваю на іх белыя, з пражылкамі мяса, кавалачкі. — А зараз паварушы бульбу. Мабыць, ужо гатова.

У мяне слінкі бягуць ад гэтых слоў, а таксама ад паху печанай бульбіны, якую дзед даў мне некалькі хвілін таму. Разламаўшы чорную, з попелам скарынку, я патрапіў на жоўтую, з дымком, сярэдзіну. Гэтая бульба, напэўна, самае смачнае, што мне давялося паспрабаваць у жыцці!

— А давай яе з сальцам і хлебам, а, унучак? Што, смачна? — дзед сам разломвае чорную бульбіну — у сярэдзіне ад яе ідзе белая пара — і адпраўляе кавалачкі ў рот. Прыжмурвае адно вока. — Ну што, наша беларуская бульба самая смачная, праўда?

Я з задавальненнем толькі кручу галавой: апячыся можна гэтай гарачай смакатой!

— Нездарма нас людзі бульбашамі клічуць! Ну што, пад'еў? А зараз — салют!

Ён заходзіць у вартоўню і праз хвіліну вяртаецца — я не веру сваім вачам! — са стрэльбай. Сапраўднай! Насамрэч — такія я дагэтуль толькі ў кіно бачыў.

— Хочаш патрымаць?

Я праводжу рукой па ствале — а іх два — нездарма ж такую стрэльбу двухстволкай-дубальтоўкай клічуць.

— Так, прыціскай да пляча. Вунь на цагліне бляшанка. Бачыш? Цэль па ёй. Вось два куркі. Націскай на любы!

Я цісну з усяе сілы, але...

— Ну што, пакуль мала кашы еў? Нічога, давай я дапамагу. Вось так. Толькі не пужайся.

Дзед бярэ стрэльбу, прыжмурвае адно вока, доўга цэліць...

Хісткую восеньскую цішыню нарэшце раскалоў стрэл. Потым другі. Са звонам бляшанка зляцела з цагліны ў хмызняк. Па вушах, памятаю, тады добра ўдарыла. Але дагэтуль адчуваю я пах печанай бульбы. Як і пах свежых яблыкаў у калгасным садзе. Гэта сапраўды быў той шчаслівы час, які называецца дзяцінствам і які, здавалася мне тады, ніколі не скончыцца...

...А вартоўня не вытрымала — разваліўся ад часу. Дзякуй Богу, нашы ўспаміны і нашы пачуцці не згасаюць, а толькі з часам напаўняюцца нейкім новым зместам, пра які калісьці скажуць за нас нашы дзеці і ўнукі. А пакуль не старэе наша памяць — жывуць і тыя, дзякуючы каму жывём мы...

*20.03.2011 г.*

# ЦАНА КРЫВІ

*Светлай памяці*
*Галіны Іванаўны Пікулік*
*і яшчэ 14 чалавек —*
*ахвяр трагедыі 11 красавіка 2011 г.*

Васіль Мікалаевіч Хадасевіч стаяў, абапіраючыся на падаконнік, каля расчыненага акна і курыў. У гэты красавіцкі, даволі цёплы дзень ён з задавальненнем падстаўляў твар сонцу і ветрыку, які радасна казытаў шыю і лоб, а сівыя пасмы валасоў уздымаліся ў такт яго вясенняй песні. Нягледзячы на дрэнную звычку, Хадасевічу заўсёды хацелася ўздыхнуць на поўныя грудзі свежага паветра, а ў свае «восемдзесят з хвосцікам» (па словах жонкі Кацярыны Сцяпанаўны, маладзейшай на цэлых сем гадоў) усё ж такі цяжкавата выходзіць на вуліцу, хоць і другі паверх — шмат часу і сіл гэта каштавала. Употайкі ад жонкі Васіль Мікалаевіч заўсёды меў заначку — пачак цыгарэт з фільтрам. І вось сёння, удосталь надыхаўшыся свежага паветра, счакаўшы, пакуль жонка выйдзе ў магазін (універсам «Цэнтральны» знаходзіцца побач), Хадасевіч выцягнуў са схованкі цыгарэту, перайшоў у кухню, на супрацьлеглы бок кватэры, і, зацягнуўшыся, зірнуў на вуліцу.

Акно з боку кухні выходзіла на праспект Незалежнасці, па якім рухаўся паток транспарту. Несканчоны шум разам з выхлапнымі газамі запаўняў вуліцу, але спакуса «падыміць», як заўсёды, перамагла. Васіль Мікалаевіч добра разумеў тую шкоду, што прыносіць яго таемны занятак разам з вулічным

выхлапным «амбрэ», але нічога зрабіць з сабой не мог: франтавая прывычка.

Раптам у суседнім пакоі нешта гучна зашыпела — і пачуўся меладычны звон: «Дон! Дон! Дон!». Хадасевіч уздрыгнуў, але адразу ж супакоіўся:

— Фу, ты, чорт! Ніяк не прывыкну!

Ён акуратна затушыў цыгарэту, загарнуў у паперку разам з попелам, выкінуў у вядро і перайшоў у залу. Вялікі напольны гадзіннік, які Хадасевіч прывёз з Германіі яшчэ ў вайну, прабіў шэсць.

— Якраз навіны пачынаюцца, трэба паглядзець, — Васіль Мікалаевіч падышоў да тэлевізара, уключыў яго. Узяў пульт, сеў у крэсла. Ён любіў прагаворваць сабе ўсё, што патрэбна зрабіць, каб не прапусціць штосьці сапраўды важнае. Звычайна ў такім узросце людзі ўжо дрэнна чуюць, але Хадасевіч асабліва паскардзіцца на свой слых не мог: чуў даволі няблага.

Раптам за акном загаласіла сірэна. Потым — другая, трэцяя... «Напэўна, пажар недзе?» — падумаў ветэран. Хадасевіч дадаў гучнасці тэлевізару, паглядзеў на экран. Пачалася праграма навін. Дыктар абвясціў:

— Сёння мы адзначаем дзень памяці ахвяр усіх канцэнтрацыйных лагераў...

Васіль Мікалаевіч міжволі зірнуў на каляндар, што вісеў на сцяне каля яго. Уздыхнуў, узяў са стала акуляры, начапіў іх на нос.

— І праўда, ужо адзінаццатае сёння... Красавіка...

Ён пачаў глядзець перадачу, адчуваючы, як камок падкатвае да горла. Былы франтавік, ён не мог спакойна бачыць усё гэта.

Раптам шчоўкнуў замок у дзвярах на ўваходзе, яны злёгку рыпнулі, расчыніліся.

— Васіль! Дзе ты там? — пачуўся голас жонкі.

— Тут я, у зале. Навіны гляджу! — адгукнуўся Хадасевіч.

Неўзабаве ў залу ўвайшла Кацярына Сцяпанаўна. Яна, здавалася, была чымсьці ўзрушана. Нават рукі хадзілі хадуном, і жанчына не ведала, куды іх падзець.

— Што здарылася, Кацюша? Ты сама не свая! — Васіль Мікалаевіч сцягнуў акуляры, паклаў іх на стол.

— Ты чуў сірэны зараз?

— Чуў. І што? Пажар недзе?

— Каб я сама ведала, што здарылася! Каля метро — я з магазіна ішла — машын дзесяць пажарных, ды яшчэ некалькі «хуткіх» падляцела. Кажуць, нешта ў метро здарылася. А што, не магу сказаць. З'явілася міліцыя і папрасіла, каб не затрымлівалася. Я хоць і хацела паглядзець, але напужалася і пайшла далей.

— Што можа быць у нас у метро? У Беларусі, у Мінску. Самая спакойная еўрапейская дзяржава, якая нікога не чапае, ды і нас ніхто. Што магло здарыцца? — быццам сам-насам разважаючы, заўважыў Хадасевіч і ўважліва паглядзеў на жонку.

Тая ўжо крыху супакоілася.

— Добра, пайду прыгатую вячэру. А ты пакуль навіны глядзі. Штосьці, мабыць, і скажуць.

Як быццам у адказ, за акном з боку кухні раптам пачуліся сірэны.

Сужэнцы, наколькі дазваляла хуткасць, кінуліся туды. Толькі ўбачылі, як уздоўж праспекта пранеслася чырвоная, як агонь, пажарная машына, а за ёй амаль адразу некалькі «хуткіх».

Цішыню раптам разарваў тэлефонны званок. Кацярына Сцяпанаўна вярнулася ў залу, узяла трубку. Хадасевіч сеў у крэсла насупраць.

— Алё, хто гэта? Андруша, сынок, ты? Добра, што пазваніў. Тут у нас такое дзеецца, не паверыш! «Хуткія» і пажарныя каля «Кастрычніцкай» — ну, каля метро! Што? Адкуль? З інтэрнэту? А гэта праўда? А твае ўсе дзе? Дома ўжо? Пакуль, дзякуй...

Кацярына Сцяпанаўна паклала трубку на месца, потым цяжка апусцілася ў крэсла насупраць мужа.

— Што здарылася, Кацярына? — спытаў Хадасевіч. — Гэта Андрэй званіў?

— Андрэй, — яна неяк сумна, з горыччу ў вачах, зірнула на яго. — Ён сказаў, што на «Кастрычніцкай» выбух. Шмат людзей пацярпела. Колькі — ніхто пакуль не ведае...

Васіль Мікалаевіч не мог паверыць.

— Не можа такога быць! Ты што? У нас? У Беларусі? Хлусня! Дай я Андрэя набяру. Як ён там?

— З ім усё добра. І ён, і Валя, і Сяргуша ўжо дома ўсе. Андрушу ягоны сябар званіў — яны павінны былі сустрэцца там, на «Купалаўскай», ды Андрэй не змог, не паспеў, затрымаўся. Сябар той ехаў у метро. На «Кастрычніцкай» дзверы расчыніліся — і раптам моцна выбухнула. Ад пылу нічога не было відаць. Але чалавек гэты бачыў людзей у крыві, параненых, і іншых людзей, як Андрэй гаварыў, чорных ад пылу і гару... Добра, што Божа нашага сына ўратаваў, а Вася?

— У галаве не ўкладваецца ўсё гэта, — Васіль Мікалаевіч сядзеў у крэсле, разгублена гледзячы на жонку: ён ніяк не мог паверыць усяму. — Гэта ж не кіно, не фантастыка, а быццам сапраўдная вайна...

Толькі зараз ён заўважыў, што ўсё яшчэ працуе тэлевізар: працягваўся выпуск навін.

— А зараз экстранае паведамленне, — дыктар на экране ўзяў нейкую паперу. — Сёння ў 17.56 на платформе станцыі метро «Кастрычніцкая» або ў вагоне цягніка адбыўся выбух. На гэты час вядома пра шэсць загінуўшых і больш як 75 параненых...

Перад вачыма Васіля Мікалаевіча і Кацярыны Сцяпанаўны замільгалі кадры, ад якіх ён ледзь не страціў прытомнасць...

...Людзі выносяць людзей — твары ў сажы. Адзенне — не, лахманы нейкія, — таксама брудна-чорнае. Некаторыя ляжаць

на асфальце — з перабітымі рукамі, нагамі... і паўсюль — кроў, кроў, кроў...

«Чаму столькі крыві? За што пацярпелі гэтыя людзі — мірныя людзі мірнай краіны? Яны ж нікому нічога дрэннага не зрабілі! За што? — Хадасевіч паступова адчуваў, як вочы яго напаўняліся слязьмі. — І хто ж гэта мог зрабіць? Ці можа само ў тым метро нешта ўзарвацца? Не, нездарма гэта... За што, злыдні, а? Хто вы, нелюдзі, якія прынеслі столькі гора ні ў чым не вінаватым?..»

Васіль Мікалаевіч не мог паверыць сваім вачам.

— ...Зараз упэўнена можна гаварыць пра тэракт у мінскім метро... — голас дыктара, здавалася, лунаў, як нейкі анёл, над свядомасцю пажылога чалавека, уся сутнасць якога не прымала і не магла прыняць таго, што зараз на ўвесь белы (напэўна, нават у чымсьці шчаслівы) свет разносілася тое, што было насамрэч страшнай праўдай...

Праз звон у вушах да расхваляванага ветэрана раптам адкульсьці, як праз вату, прарваўся званок тэлефона. Гэта быў яго сын, Андрэй.

— Тата, не хвалюйся. Я затрымаюся. Еду ў бальніцу да Сяргея, сябра майго. Яго параніла. У нагі. Напэўна, патрэбна кроў... Мне сказалі, што больш за сотню людзей паранена. Абавязкова потым пазваню. Не хвалюйцеся...

Голас сына змоўк. Чамусьці гулка ў скронях аддаваўся стук сэрца. У грудзях забалела. У кішэні знайшоўся валідол. Адну таблетку Хадасевіч паклаў пад язык. Выцер насоўкай успацелы твар.

У пакой увайшла Кацярына Сцяпанаўна.

— Вася, што з табой? Ты такі бледны! Сэрца як?

— Не хвалюйся, валідол ужо ўзяў, — Хадасевіч сумна ўсміхнуўся.

— А хто званіў?

— Андрэй. Яго сябар у бальніцы. Ён паехаў туды...

Васіль Мікалаевіч раптам адчуў: ён павінен быць там, на «Кастрычніцкай», — трэба хоць нечым дапамагчы гэтым людзям...

— Каця, — сказаў ён, — ты ідзеш са мной?

— Ты куды збіраешся, Вася?

— Туды, — ён паказаў рукой на экран тэлевізара. — Я павінен быць там, з імі...

* * *

Васіль Мікалаевіч Хадасевіч разам з жонкай стаяў каля чырвона-белай стужкі, якая, здавалася, падзяляла гэты свет надвое: знешне шчасліва-бесклапотны для тых, хто не пераступіў нейкай нябачнай мяжы — крывава-чырвонай, страшэннай мяжы; і рэальна-відавочны, ад чаго стыла кроў у жылах: адразу за стужкай, на цэментна-мармуровай падлозе каля ўвахода на станцыю метро «Кастрычніцкая» ляжалі людзі. І тое, што бачыў стары чалавек сваімі вачыма, — гэта ўжо не было малюнкам на тэлеэкране, — яшчэ больш не ўкладвалася ў яго галаве. Малады хлопец з перабітымі нагамі, якога ўкладвалі ў машыну «хуткай дапамогі». Хлопец з акрываўленымі вушамі, увесь запылены, сядзеў на чорна-мармуровай падлозе і нервова-напружана набіраў нейкі нумар на сваім мабільніку — напэўна, сказаць родным, што жывы. Сумка яго, уся ў шэрым пыле, стаяла побач. Дзяўчына на насілках — на ёй засталася толькі бялізна. Рэшткі вопраткі матляюцца на руках і нагах — чорных, у сажы. Здаецца, што яна страціла прытомнасць...

Хадасевічу здавалася, што гэта вясна страціла прытомнасць, а ўсе мінчане, ды і не толькі яны, напэўна, і ўвесь свет, — разам з ёю... Такі моцны быў псіхалагічны эфект. «Як 11 верасня для амерыканцаў, ды і для ўсяго свету таксама, так для нас гэта 11 красавіка... Таксама 11-га. І ў 2011-м годзе...» — пажылы чалавек адчуваў, што справа не ў даце — загінулі людзі, простыя, ні ў чым не вінаватыя людзі... Ветэран зноў глядзеў туды, дзе ляжалі тыя, што былі

таксама, як і ён, заўсёды ўпэўнены ў тым, што ніякіх актаў тэрарызму ў Беларусі ніколі не будзе. Хто мог пакрыўдзіць беларусаў, якія ні ў якіх канфліктах, акрамя афганскага, яшчэ ў часы СССР, ніколі не ўдзельнічалі?

Раптам каля прыступак Васіль Мікалаевіч заўважыў цела, пакрытае нечым накшталт брызенту, з-пад якога на каменны абыякавы дол звешвалася рука (ці то мужчынская, ці то жаночая) з чырвона-карычневымі плямамі крыві на ёй...

Вайсковец-«амапавец» трымаў рацыю і аддаваў загады. «Хуткія», уключыўшы сірэну, ляцелі ў невядомым накірунку, — далей ад гэтага страшнага месца, — каб хутчэй ратаваць людзей, якія вельмі хацелі жыць...

«І хто адкажа за гэтую нявінную кроў, пралітую ў, здавалася б, мірны час? Чым і ўвогуле ці можам мы вымераць цану гэтай крыві?» — думкі роем насіліся ў галаве Хадасевіча, бязлітасна, як раззлаваныя пчолы, джалячы яго. І чым больш нараджалася такіх думак, тым больш Васіль Мікалаевіч разумеў, што заходзіць у чорны, быццам мёртвы змрок, тупік, з якога няма і не можа быць выйсця... Ён праз гэты змрок бачыў бледны твар жонкі, якая нешта гаварыла яму, але Хадасевіч нічога не чуў: нейкі цяжар раптам наваліўся на яго, стала цяжка дыхаць... Здавалася, што цяжка стала жыць...

* * *

— Ты куды лезеш, халера, а? Жыць надакучыла? — нейкі гучны бас разносіцца над полем. — Яшчэ сапляк зусім, а, бач ты, не слухаецца!

Хадасевіч бачыць пажылога старшыну Рыкава, які ўшчувае белабрысага, зусім маладога хлопца з папаўнення.

— Я вас не паспяваю запомніць, як... Ну чаго ты пад кулі лезеш? Паспееш яшчэ... — і над шыза-асеннім полем, страшна-бесчалавечна ўзараным вайной, разносіцца мат.

Як ні дзіўна, Хадасевічу здаецца, што ў траншэі, дзе зараз сядзяць яго салдаты, нарэшце стала больш-менш спакойна. Тут, пад Ржэвам, немцы сцягнулі столькі сіл, што кожны світанак ён, камуніст, моліцца богу — толькі яму аднаму вядомаму богу. «У кожнага з нас зараз свой бог, — падумаў капітан. — Калі ў камбата застаецца толькі паўтара дзясятка чалавек, то ён усё роўна камбат, камандзір, бацька для такіх белабрысых, як гэты Сямшоў».

— Сямшоў!

— Я, таварыш капітан. Слухаю! — радавы нарэшце насунуў каску, вельмі вялікую для яго галавы.

— Ты адкуль родам? — Хадасевіч яшчэ не пазнаёміўся як след з папаўненнем, як ад дзвюх рот маладых байцоў застаўся толькі ўзвод: перад высоткай, якую яны павінны былі заняць, было міннае поле, не пазначанае на карце. Шмат байцоў трапіла ў гэтую крывавую мясарубку пад Ржэвам. А тут яшчэ гэтыя міны...

— З Палесся. Вёска мая пад Гомелем. Бывалі на Палессі, таварыш капітан? — хлопец усміхнуўся, але неяк сумна.

— Вядома ж, бываў — я ж беларус. А мама, тата твае як? Дзеўчына ёсць?

— Ад бацькоў пакуль ніякай вестачкі, — Сямшоў уздыхнуў. — І дзеўчыны няма... Не паспеў... пазнаёміцца...

— Таварыш капітан, разведчыкі вярнуліся. Лыжэвіч паранены, — старшына Рыкаў перарваў размову. Яго жоўта-зялёныя ад махоркі вусы сумна абвіслі. Вочы з маршчынкамі вакол іх, здавалася, наадварот, усміхаліся. «Чаму тут можна радавацца?» — падумаў Хадасевіч і нецярпліва спытаў:

— Як сувязь, старшына? Дзе Філін? Чаму так доўга?

— Пастараемся хутчэй, таварыш капітан!

— Выконвайце! Разведчыкаў да мяне!

Неўзабаве Хадасевіч ужо ведаў, што абысці міннае поле немагчыма: з правага боку топкае балота, а з левага наша

пазіцыя з узгорка была як на далоні. І менавіта на гэтым баку былі сканцэнтраваны ўсе сілы немцаў — танкі і пяхота. Зрэдку білі гарматы, але дзесьці далёка. Вывад быў просты: калі заўтра немец пойдзе ў наступленне, то яны будуць вымушаны або адысці назад, або іх адцесняць да балота. А адтуль дарогі няма: або палон, або аблога. «А загад ужо ёсць: абавязкова ўзяць вышыню. Як? З такім зусім нешматлікім «кантынгентам»? А міннае поле?» — Хадасевіч уздыхнуў: ён проста павінен быў звязацца са штабам і папрасіць падмогі.

Ён ускочыў і накіраваўся ўздоўж акопа да бліндажа. Там малады сяржант варажыў над палявым тэлефонам. Убачыўшы Хадасевіча, ён ускочыў.

— Таварыш капітан...

— Сядай, Філін. Працуй. Як справы?

Сяржант усміхнуўся:

— Наладзіў сувязь.

— Добра. Дай штаб.

Узяў слухаўку.

— Я, таварыш першы. Слухаю. Так. Як штрафнікоў? Зразумела — узяць вышыню любымі сіламі...

«Няўжо палкоўнік не разумее, што без артылерыйскай падрыхтоўкі, сапёраў, якія будуць працаваць пад агнём фашыста, і нават танкаў гэтую вышыню ніколі не ўзяць?» — капітан Хадасевіч злаваўся на безвыходнасць гэтага становішча, разумеючы, што заўтра ўсе яго салдаты пойдуць пад кулі і на міны толькі таму, што ёсць загад камандавання. І гэты загад ён павінен выканаць. Абавязкова. Любой цаной. І раптам адна ліпкая думка закралася ў яго сэрца: «А калі немец пачне наступленне ці хаця б артпадрыхтоўку не на золку, напрыклад, а яшчэ ноччу?». Капітан чамусьці адразу адагнаў яе...

Хадасевіч выйшаў з бліндажа, зірнуў спачатку на гадзіннік, а потым на неба: ужо вечар. Асенні дзень патроху стомлена згасаў. Мармытаў нешта сваё драбнюткі дождж. На пазіцыях

немцаў было ціха. Капітан вярнуўся ў бліндаж, паслаў Філіна па старшыну.

Хутка Рыкаў з'явіўся. На стале, дзе сумна капціла паветра самаробная свяцільня — гільза ад снарада, ляжала паўбуханкі хлеба, дзве бляшанкі, алюмініевая фляжка і стаялі два такія ж шклянкі.

— Як з пастамі, праверыў?

— Праверыў, таварыш капітан.

— А з параненымі? Накармілі?

— Усё нармальна, таварыш капітан. Заўтра адправім іх, радзімых, у гошпіталь.

— А сам ты як, Кузьма Яўсеевіч, а?

Капітан пачаў наразаць хлеб.

— Нармальна. Толькі стаміўся, халера яго бяры.

— Давай сядай да стала. Вось хлеб, тушонка.

Старшына крахтануў, правёў далонню па вусах, нібы раздумваючы, расшпіліў шынель, прысеў, але спярша павесіў на цвік аўтамат ППШ.

— Ну, што, Кузьма, засталіся з усяго камандавання тут толькі мы з табой. Астатнія — верабейчыкі неабстраляныя з папаўнення. Адзін Верамейчык са старой гвардыі застаўся. А, і Цвігун. Але паранены, як і яго «дзегцяроў». Слухай, Кузьма Яўсеевіч. Сёння ноччу будзе нам падмога — штрафнікі. Абяцалі цэлую роту. Загад нам такі: любой цаной узяць гэтую чортаву вышыню. А дзе штрафнікі — там і заслон для іх (ды і, напэўна, для нас) будзе. Ты ж разумееш: ні кроку назад...

Капітан узяў фляжку.

— Разумееш, Кузьма, што нас заўтра чакае? Усіх. І штрафнікоў, і нас. Таму давай па пяцьдзясят франтавых. А потым — па койках...

Пасля скрозь сон Хадасевіч чуў, як па бліндажы лупцаваў дождж ды раз-пораз грукатала нешта далёка-далёка, быццам навальніца, — дзесьці там, у мірным жыцці. І сапраўды далёкім, бо шлях туды ляжыць праз чорны сорак першы, ваенны год...

— Таварыш капітан, таварыш капітан, — нехта настойліва трос Хадасевіча за плячо. — Прачынайцеся!

Хадасевіч усхапіўся, атрасаючы рэшткі сну. Перад ім стаяў Філін.

— Тут да вас прыйшлі, таварыш капітан! — сяржант, вядома, не хацеў будзіць яго і таму вінавата глядзеў у вочы свайму камандзіру.

А той ужо прывык да святла са снараднай «керасінкі» і неўзабаве разгледзеў постаць свайго госця. Гэта быў чорнавалосы мужчына, прыкладна равеснік Хадасевіча, у форме капітана.

— Ну, прывітанне, камбат! — госць павярнуўся, і Хадасевіч нарэшце ўбачыў яго.

— Капітан Семяжон, асобы аддзел.

— Капітан Хадасевіч. Чым абавязаны?

Хадасевіч, убачыўшы «асабіста», усё зразумеў: заўтра яны пойдуць у бой, а наперадзе — «гарматнае мяса» — гэтыя хлопцы, якія ў сваім жыцці яшчэ не бачылі нічога, але «перад Радзімай павінны былі заслужыць дараванне». А за што? За тое, што выпадкова трапілі ў аблогу? За тое, што згубілі арыенцір у пачатку вайны, не ведаючы, дзе фронт? За тое, што іх камандзіры не змаглі знайсці выйсце з такой, здавалася б, простай сітуацыі?.. — такіх пытанняў назапасілася зашмат. І Хадасевіч, убачыўшы «асабіста», ужо ведаў, што заўтра штрафнікам трэба будзе «крывёю змыць тую «ганьбу», з-за якой яны апынуліся ў штрафбаце»...

— Заўтра, у восем раніцы, артылерыя зайграе на сваёй гармошцы, а потым мы павінны — хочам ці не — узяць гэтую праклятую вышыню. Я ведаю, што там дзот, танкі і артылерыя. Але мы павінны — ведаеш, капітан, павінны... І гэта вырашаў не толькі я... Калі возьмем вышыню — рыхтуй дзірачку для ордэна. А калі не... Ну, ты разумееш...

— А твае хлопцы са штрафбата — яны ведаюць гэта, капітан? Яны ведаюць, куды іх заўтра пашлюць?

— А гэта ўжо не твой клопат, Хадасевіч, — ці як цябе там...

* * *

Асенняя слота панавала ў гэты сумны світанак, калі ў траншэі байцы рыхтаваліся да наступлення. У штрафнікоў былі зрэзаны пятліцы, і гэтыя плямы на каўнерыках гімнасцёрак адразу кідаліся ў вочы ўсім, асабліва тым, хто не «заслужыў асаблівай павагі» перад Радзімай. І таму гэта вельмі не падабалася тым, хто быў у рэгулярным войску Савецкай Арміі. У штрафныя батальёны траплялі тыя, хто павінен быў загладзіць сваю віну перад «сацыялістычнай радзімай», тыя, хто, амаль бяззбройны, быў абавязаны праліваць сваю кроў у імя вялікага Сталіна... І такіх былі мільёны... «Пастухамі» для гэтай «паствы» прызначаліся тыя, хто зарэкамендаваў сябе як верны служака сацыялістычнаму строю і таварышу Дзяржынскаму, служачы ў яго ведамстве. Карыстаючыся дырэктывай таварыша Сталіна, дзе галоўным было бессмяротнае «Ні кроку назад», капітан Семяжон вельмі любіў назіраць, як «загараджальны» агонь за спінамі штрафнікоў знішчаў і тых, хто спыняўся падчас атакі; і тых, хто проста сумняваўся ў правільнасці зробленага кроку наперад; і тых, хто проста баяўся... Хаця баяліся ўсе...

— А ты ведаеш, капітан, што наперадзе міннае поле? — Хадасевіч яшчэ імкнуўся стрымаць «асабіста», каб людзі яго, па магчымасці, не пацярпелі.

— А ты, капітан, я бачу, пад трыбунал захацеў, а? — Семяжон скрывіўся ва ўсмешцы. — Табе шкада гэтых злачынцаў? Ці сам захацеў на іх месца?

Хадасевіч нічога не адказваў, узіраючыся ўдалеч. Ён ведаў адно: калі заступіцца за гэтых смертнікаў, Семяжон з задавальненнем пусціць кулю яму ў лоб. Такі быў закон вайны: «Калі ты не забіваеш — забіваюць цябе...». І яны былі на службе ў гэтай кашчавай старой, якая касіла направа-налева маладых хлопцаў і зусім не клапацілася пра іх лёс... «Калі б толькі мець праходы праз міннае поле ці балота, то можна было б

мэтанакіравана, уначы, адправіць хлопцаў наперад, каб у рэшце рэшт, захапіўшы варожыя акопы, замацавацца на тым баку. Але дзот... Нават ведаючы праходы ў мінным полі, немагчыма вось так, з налёту, знішчыць разлік гэтага ўмацавання і сігналізаваць камандаванню аб маленькай, але перамозе... — гэтыя думкі свідравалі яго ўзрушаны ад перажыванняў мозг. — Як малымі сіламі захапіць гэты плацдарм?» — з іншага боку, капітан баяўся праявіць ініцыятыву.

Тым часам першыя шарэнгі байцоў пайшлі наперад. Капітан Семяжон сядзеў у траншэі каля кулямёта — палец на гашэтцы трымаў маладжавы старшына.

— Чакай, Чыкін, бачыш, пайшлі? — голас Семяжона быў будзённым, як і гэты світанак: капітан абсалютна не клапаціўся пра тых, каго ён паслаў сёння на смерць.

Нават немцы змоўклі, адчуўшы «нахабства рускіх», якія паслалі сваіх на немінучую пагібель.

Тры шарэнгі штрафнікоў ішлі і ішлі насустрач невядомасці. Скуласты мужчына і бялявы хлопец у першай шарэнзе амаль адначасова зніклі ў воблаку светла-бязлітаснага пяску: пачуўся выбух — хутчэй, шчаўчок і нейкі стогн — і яны абодва, так нічога не зразумеўшы, зніклі ў ім. І ўсё... Частка штрафнікоў, паддаўшыся страху, адразу ж ірванула назад, да траншэі. Шарэнгі змяшаліся.

— Страляй, Чыкін, страляй! — капітан Семяжон, здавалася, атрымліваў задавальненне ад усяго таго, што бачыў. — Страляй, каб ніводная падла не ўцякла!

Падкошаныя чэргай — і тыя, хто адступаў, і тыя, хто яшчэ стаяў на месцы ў нерашучасці, — (яны не разумелі, за што па іх страляюць свае) людзі падалі... падалі... падалі... Некаторыя, бачачы, што пагібель чакае іх паўсюль — ці ад варожай кулі, ці ад сваёй, — ірванулі наперад: людзі добра разумелі, што назад ім дарогі ўжо няма... Фантанчыкі выбухаў скаланулі наваколле, і палова (ці нават больш) штрафнікоў засталася

ляжаць на палітым крывёю пяску. Астатнія байцы рванулі на дзот. Немцы, відаць, ашаломленыя гэтай атакай, спачатку не стралялі: напэўна, ведалі, што міннае поле — гэта сур'ёзнае выпрабаванне для нашых байцоў. Але зараз, убачыўшы, што шмат іх пераадолела гэта, здавалася б, непераадольнае выпрабаванне і ўжо набліжаецца да дзота, адкрылі агонь. Гітлераўцы, вядома ж, не ведалі, што перад атакай нашы штрафнікі атрымалі толькі па старой трохлінейцы Мосіна і па сто грамаў «для смеласці». І ўсё — нават «лімонкі» ні ў кога з іх не было, кабісці на дзот.

Але немцы гэтага не ведалі.

І каб атака штрафнікоў не захлынулася, Хадасевіч адразу ж падняў сваіх байцоў:

— За мной, сынкі, за Радзіму нашу!

Ён першы вылез з траншэі і адразу ж убачыў, як да яго далучыліся ўсе, хто мог хадзіць. Свой ППШ Хадасевіч ускінуў угару і пабег, ведаючы, што ўсе яго таварышы бягуць за ім. Дзякуючы штрафнікам шлях да дзота быў свабодны, і капітан разумеў, што зараз яго шанец, упускаць які было смерці падобна. Толькі адно пытанне мучыла Хадасевіча: «Дзе ж артылерыя? Няўжо Семяжон сказаў няпраўду? А што, калі яны возьмуць гэтую праклятую вышыню, гарматы ўдараць па сваіх?».

І, як у пацвярджэнне гэтых слоў, раптам заспявалі нашы гарматы. Снарады клаліся акурат у цэль — непадалёк ад дзота, накрываючы пазіцыі немцаў. Раптам капітан адчуў: варожая куля апякла плячо. Кулямёт з дзота не сціхаў. Што рабіць? Раптам Хадасевіч заўважыў каля варожага збудавання бялявую галаву: гэта быў Сямшоў. Што было далей, капітан запомніў на ўсё жыццё. Гэта адбылося ў адзін момант. Сямшоў падляцеў да варожага збудавання і спыніўся, быццам у нерашучасці...

— Мамачка, прабач! — і ў імгненне вока ён кінуўся на амбразуру дзота...

Слёзы і абурэнне — Хадасевіч, захліпаючыся ад усяго гэтага, раззлаваны, кінуўся на немцаў. Ён крычаў і крычаў, убачыўшы, як цела маладога хлопца спаўзло з амбразуры — цела хлопца, які яшчэ і не пачынаў жыць, якога чакала маці і які выратаваў іх усіх.

Кінуўшы гранату, ён выпусціў усе патроны з дыска ППШ, перазарадзіў аўтамат. Потым Хадасевіч пацягнуў на сябе цяжкія металічныя дзверы вялізнай махіны. Яны, на здзіўленне, падаліся лёгка. У цемру праёма Хадасевіч, для перасцярогі, кінуў гранату і, паліваючы кулямі гэтую цемру, уварваўся ў дзот. Некалькі гітлераўцаў ляжала каля кулямёта.

Вышыня была ўзята. Штрафнікамі і бялявым сціплым палескім хлопцам, які не схаваўся за спіны таварышаў, а проста зрабіў адзін крок — крок, які выратаваў усіх...

«Трэба нешта напісаць маці Сямшова», — падумаў Хадасевіч, павярнуўшыся да дзвярэй дзота, не заўважыўшы, як адзін з фашыстаў паварушыўся.

І раптам цішыню разарвала аўтаматная чарга.

«Як балюча!» — адчуваючы, як кулі ўпіваюцца ў спіну, прашаптаў капітан Хадасевіч...

* * *

— Ну, як там мой франтавік? — голас Кацярыны Сцяпанаўны прымусіў Васіля Мікалаевіча расплюшчыць вочы.

— Пакуль ніяк не апрытомнее. Прыходзьце пазней.

— А гэта што? — жанчына заўважыла, што яе муж расплюшчыў вочы. — Вася, ты як?

— Нармальна, Кацюша. Дзе я? — Хадасевіч яшчэ нічога не разумеў.

— У бальніцы. Ты каля «Кастрычніцкай» страціў прытомнасць, і зараз, дзякуй Богу, ужо са мною...

— Як людзі, адтуль?.. Усе жывыя? — Васіль Мікалаевіч уважліва паглядзеў на жонку.

Тая адвяла позірк убок.

— Табе нельга хваляваццца, Вася. Давай потым пагаворым, а?

— Каця, скажы праўду. Нехта загінуў?

У вачах Кацярыны Сцяпанаўны паказаліся слёзы.

— Пятнаццаць чалавек, Вася. А больш за дзвесце паранены. Нехта ўзарваў нашу «Кастрычніцкую». Нелюдзі! Усё роўна ім суд будзе — калі не наш, зямны, то Боскі суд, Вася...

Вочы старога франтавіка напоўніліся слязьмі.

— Божа мой, як страшна!..

Васіль Мікалаевіч адчуў, як вялікі ком падкаціў да горла. І раптам яго позірк пасвятлеў.

— А я... зноў убачыў тую вышыню, штрафнікоў. І Сямшова. Памятаеш яго, Кацярына?

— Канешне, Вася, ты ж расказваў пра яго — там, у шпіталі, пасля таго бою...

— А ты мяне выхадзіла, выпеставала. У вайну мы ведалі, за што паміралі, Каця. А зараз за што гэтыя людзі, на «Кастрычніцкай», загінулі, а? Хто адкажа?..

Хадасевіч замаўчаў. Адказам на яго пытанне была цішыня...

Васіль Мікалаевіч паглядзеў у вакно. Там у вечаровай стыні патроху знікаў стомлены за дзень горад...

*19.06.2011 г.*

# МАРА

У гэты ліпеньскі поўдзень, здавалася, яго Вялікасць Сонца само завітала да нас у госці — так было горача ў кватэры. Балконныя дзверы былі расчыненыя, вокны таксама, як задаволенае чымсьці кацяня, вуркатаў вентылятар — словам, нішто не магло выратаваць нашу сям'ю ад спёкі.

— А дзе мае «парадныя» шорты? — набіваючы сваю «дачную» сумку, спытаў я ў жонкі, якая якраз праходзіла побач.

— На паліцы ў шафе пашукай, — адказала тая. — І які дурань у самую спёку пацягнецца на дачу? Трэба было або з самага ранку ехаць, або пад вечар!

«А яна правільна гаворыць», — у душы пагадзіўся я з жонкаю. Але ўслых сказаў іншае:

— Нічога, хутка на Беларусі будуць сапраўдныя тропікі і пачнуць вырошчваць ананасы і бананы. Арбузы ж ужо ёсць...

— ...І плюс сорак у цяньку. Так? І хто выйграе? Хоць бы нейкае мора было побач! Акрамя Мінскага...

Жонка зноў увайшла ў пакой. Паклала руку мне на плячо. Уздыхнула.

— Усё роўна будзем у Крым ці Турцыю ездзіць — да сапраўднага мора... А ў гэтым годзе яшчэ такая спёка!

Правяла рукою па маіх валасах.

— Фу, які мокры! Нават абдымацца з табой не хочацца!

Яна засмяялася, чмокнула мяне ў вільготную шчаку і выйшла з пакоя.

Я паглядзеў ёй услед. І зноў успомніў: «І дзе ж мае шорты?». Падышоў да шафы, расчыніў дзверы. У першай жа стопцы рэчаў убачыў шорты. Узрадаваўся. Пацягнуўся да іх. І раптам на падлогу слізганула штосьці маленькае, стракатае. Мякка шлёпнулася і засталося ляжаць. Я нахіліўся. Падняў.

Гэта была маленькая падушачка з травамі, прывезеная жонкай з яе першай вандроўкі пад Еўпаторыю. Я тады папрасіў прывезці мне штосьці незвычайнае — такое, каб запомнілася назаўсёды. І яна падаравала мне яго. Пах крымскага стэпу — стракаты, квяціста-лавандавы. Той самы...

Я падняў падушачку. Паднёс да носа. І — адчуў яго, знаёмы лавандавы пах... А я так даўно хацеў адчуць пах не толькі крымскай кветкі і разнатраўя, але і мора. Убачыць мора было вялікай маёй марай...

...Маленькі жоўты аўтобус-«багданка» перасек гарадскую мяжу, як адчуванне маё рэзка змянілася. Яшчэ ў Еўпаторыі панаваў пах паўднёвага горада — пах, які ні з чым не зблытаеш. Таполі з постацямі, як у джыгітаў з якога-небудзь горнага аула, персікавыя дрэвы і іншая экзотыка так і кідаліся ў вочы. Але галава мая закружылася, як толькі мы ад'ехалі ад Еўпаторыі ў бок узбярэжжа... Хмельны пах лаванды і іншага разнатраўя ўдарыў у галаву, як добрае віно! Дагэтуль, у Мінску, толькі маленькая падушачка, як пяшчотна-струнная скрыпка, дарыла мне маленькую сустрэчу з Крымам. А тут сотні ці нават тысячы такіх «падушачак»-скрыпак адначасова — цэлы сімфанічны аркестр! І абсалютна плоская раўніна, пакрытая сухімі травамі з гэтым дзіўным вытанчаным водарам...

А я чакаў сустрэчы з морам! Хаця еду на мора другі раз, не першы. Першая сустрэча з ім адбылася ўзімку, у Адэсе, падчас экскурсіі. Я бачыў мора ўсяго дзесяць хвілін, не больш. Шчоўкнуўся на «плёначнік» на пірсе. І ўсё — у аўтобус. Мора было такім непрыветным, сур'ёзным. Нават суровым. І зараз перад вачыма стаіць толькі пустынны студзеньскі пляж і яно — арыстакратычна-халоднае. Мора тады шаптала мне пра штосьці сваё, а я не разумеў яго — проста стаяў і глядзеў удалеч, імкнуўся захаваць у памяці кожнае імгненне гэтай сустрэчы — калі яшчэ прыйдзецца стаць турыстам!.. А па свінцова-чорнай паверхні ціха каціліся белыя грабеньчыкі і разбіваліся ля маіх ног...

Калі паклікалі ў аўтобус, доўга не хацеў ісці: хацелася запомніць яго. Любым. Такім, як ёсць. Нават такім, як зараз. І... чамусьці баяўся, што больш не ўбачу яго. Але самае дзіўнае — у той час не запомніў паху мора. Паху марскога ветру і волі, адчуваннем якой насычана гэта паветра. Нешта заварушылася тады ў маёй душы. Патаемна-незразумелае. Хмельна-прывабнае, як вочы дзяўчыны, якую сустрэў тады на адэскім узбярэжжы і якую потым назваў сваёй жонкаю...

...Аўтобус зноў паварочвае, і я, увесь час узіраючыся паміж радамі крэслаў уперад, раптам бачу, як недзе далёка і адначасова, як падалося, вельмі блізка ў марыве над асфальтам, зліваючыся з блакітам неба, расце нейкая цёмна-сіняя маса, падобная да цунамі, — быццам бы вялізная хваля хоча абрынуцца на наш маленькі аўтобус. «Міраж», — падумалася мне. Я паглядзеў на сваіх суседзяў — усе размаўлялі або абыякава пазіралі ў вокны на адзін і на другі бок. «Няўжо толькі я адзін гэта бачу — вялікае сіняе мора, падобнае на вялізную хмару? І яно ўжо не зімова-хмурае, а, напэўна, іншае, ласкавае, маё мора? Тое, пра якое даўно марыў?..»

Але што гэта? Паступова сіняя паласа становіцца тонкай. Потым зусім знікае. І зноў парад намі блакітнае неба і стракаты неабсяжны стэп. І — чароўны пах...

А праз нейкія паўгадзіны я, нарэшце, убачыў Яго Вялікасць Мора. Курортны гарадок Штармавое. Дробна-жоўты пясочак на пляжы. І пах — пранізлівы, прывабна-ёдзісты. Той самы... І Мора — блакітна-зеленаватае, з бела-пяшчотнымі венчыкамі мядуз каля самай паверхні. І ветразь на гарызонце. Белы-белы, як вялізныя аблокі на блакітным паўднёвым небе!..

Я ведаю зараз, як выглядае мая мара, і нават ведаю яе пах. Дзівосна-прывабна-пяшчотны... Як і само жыццё, калі ж, вядома, любіць яго... Часта ў снах бачу я зеленавата-блакітныя хвалі, як вочы любай жанчыны. Маёй. Назаўсёды...

*16.07.2010 г.*

# Ласкавы падман

*(з «Крымскіх нататкаў»)*

Я ўбачыў яе выпадкова. Зусім маленькая, яна выглядвала адным бокам з-пад галечнай дробязі. Зірнула яна на гэты белы свет, і адразу ж марская хваля зноўку накрыла яе. На адно імгненне праглынула бераг, белай пенай упрыгожыла яго — і сышла.

І зноў я ўбачыў яе — малюсенькую амфару. У Старажытнай Грэцыі ў такіх перавозілі віно, алей. Шмат старажытнагрэчаскіх караблёў знайшлі свой апошні прытулак у марской бездані. А мора сваім магутным подыхам здольна «выдзьмуць» на гэты свет такія рэчы, што зніклі шмат стагоддзяў таму. Чамусьці спачатку я не вельмі здзівіўся, калі ўбачыў гэтую мініяцюрную амфару. Менавіта мініяцюрную — сантыметраў дзесяць. Вядома, што старажытнагрэчаскія амфары былі значна большымі па памерах. Але, магчыма, падумалася мне, у гэтай калісьці захоўвалі парфуму, альбо які-небудзь каштоўны алей?

Калі, нарэшце, марская хваля чарговы раз сышла, я нахіліўся і асцярожна падняў незвычайную знаходку — баяўся зламаць, раструшчыць. Але што гэта?

На маёй далоні ляжаў светла-шэры каменьчык — звычайная галька, якая толькі формай сваёй нагадвала старажытнагрэчаскую прыгажуню.

Мора зрабіла сваю працу, за шмат гадоўператварыўшы звычайны марскі каменьчык у твор мастацтва — па-свойму адмысловы, нават у нечым вытанчаны. Хаця зблізку гэты цудоўны падман, на жаль, развенчваўся...

«Дзівосны ён, плён працы мора!» — скажаце вы. І сапраўды, кавалкі звычайнага бутэлечнага шкла, параскіданыя па ўсім

беразе, спачатку вельмі вострыя і небяспечныя для ног, з часам «адшліфоўваюцца» морам, пачынаюць нагадваць рознакаляровыя каштоўныя камяні — празрыста-іскрыстыя і адначасова дымкава-загадкавыя, як вочы каханай жанчыны.

А галечныя камяні? Таксама абточаныя хвалямі, яны не маюць ніводнага вострага краю. Яны — нібы чалавечыя характары, апрацаваныя часам. Здаецца, што ў гэтай вечнай працы і заключаецца чалавечая мудрасць. Прычым гэта не кампраміс паміж чалавекам і рэчаіснасцю, турботамі, жыццёвымі клопатамі. Гэта скарбонка каштоўнага жыццёвага вопыту, своеасаблівая амфара душы, жыццёвага досведу...

...Я зноў бачу яе, напалову занесеную дробным каменнем, на вялікім беразе велічнага мора, бясконцага, як наша з вамі жыццё...

*14.07.2007 г.*

# Горад майго сэрца

*Эсэ*

У кожнага з нас ёсць свой гарадок, дзе ён нарадзіўся, дзе зрабіў першыя крокі ў жыццё, дзе зведаў першыя моманты радасці і няўдач.

У маёй душы таксама знайшоў сваё месца «дзікі куток сярод непраходных лясоў і балот» з сівой старажытнасці — гарадок Заслаўе. І не таму, што ён невялікі па памерах, не таму, што людзі там жывуць такія, як і ўсе беларусы, — добрыя, шчырыя, працавітыя. А, мабыць, таму, што менавіта з гэтым куточкам звязана ў маім жыцці вельмі многае.

З вокнаў маёй хаты адкрываецца від на каталіцкі касцёл, які доўгія гады ляжаў у руінах і толькі нядаўна быў рэстаўраваны. Калісьці ноччу, на фоне зорнага неба, гэтыя напаўразбураныя сцены ўяўлялі сабою незабыўнае відовішча, і чамусьці адразу ўспаміналася «Чорны замак Альшанскі» Караткевіча. Але не трэба было ехаць у Гальшаны. Дастаткова было прабрацца ля старой адрыны, залезці ў нізкі, напалову ў зямлі, правал і апынуцца ў вялікай зале без даху: голыя сцены з маленькім купалам на адной, ацалелай, з праваламі выцягнутых у даўжыню гатычнага стылю вокнаў. З вышыні гэтых сцен зрэдку зрываліся ўніз цагліны, і тады чуўся моцны стук: рэха ў касцёле — нават без даху — было моцнае.

Але што мяне яшчэ вельмі ўражвала — жыццё перамагала паўсюль, ва ўсім. Калісьці жвавы ветрык занёс на рэшткі маленькага купала зярнятка — семя клёна, і яно прыжылося.

І з таго часу, праходзячы праз сквер ля касцёла, я з задавальненнем бачыў, як сонейка песціла лістоту гэтага маладзенькага дрэўца...

Калі ад касцёла прайсці праз сквер — са старымі ліпамі, варонінымі гнёздамі ў іх густой лістоце — да будынка старой школы і спусціцца ў былы роў заслаўскага замка — вось яна... Царква, як белы лебедзь, з шатамі старых дрэў з аднаго боку горда ўзвышаецца над Заслаўем і нездарма з'яўляецца яго сімвалам. Замкавы вал і зараз вышынёй метраў 15–20, а якім ён быў у Сярэднявеччы, нават цяжка ўявіць. Каля ўваходу — вялікі валун, нямы сведка тых трывожных часін, калі замак з усіх бакоў быў акружаны балотамі і пушчамі, калі (я гэта даволі часта імкнуўся ўявіць) па драўляных насцілах ішлі нашы з вамі продкі — простыя людзі, абутыя ў лапці і поршні, апранутыя ў даматканыя світкі. Драўляныя нізенькія хаткі з адным-двума невялічкімі акенцамі, зацягнутымі бычыным пухіром, хаткі, якія тапіліся «па-чорнаму». І — як і цяпер — на цэнтральнай плошчы кірмаш... І яшчэ — Рагнеда і яе сын Ізяслаў, які, як сведчыць легенда, выратаваў маці жыццё і быў сасланы сюды — у дзікі тады куток. Гэтыя славутыя людзі — палачанка з трыма імёнамі і яе сын — прайшлі праз стагоддзі і засталіся з намі назаўсёды...

...Па левы бок, як ісці да замка, стаяла ў былы час некалькі адрын, аб'яднаных у доўгі драўляны «цягнік». Калі зазірнуць у шчылінку паміж старых дошак, то колькі хвілін нічога нельга ўбачыць; але толькі вочы прывыкаюць да цемры, і ты здзіўляешся, бо падлогі ўвогуле няма, а перад табою цёмны правал. Які вядзе быццам у нікуды — пад зямлю... Гэта быў славуты падземны ход, які, па чутках, пачынаўся ад замка і вёў да ўжо вядомага нам касцёла, а потым — да «магілы Рагнеды» (месца прыкладна за кіламетр ад Заслаўя). Нам, хлапчукам, уяўляліся незлічоныя княжацкія багацці, і не раз намагаліся мы залезці ў запаветны ход, але казкі пра прывіды і абвалы, добра аздобленыя бацькоўскімі забаронамі, кожны раз перашкаджалі нашым намаганням. Адшукаць уваход у падзя-

мелле з боку касцёла таксама не ўдавалася. У канцы 1980-х гадоў ход быў засыпаны, адрыны знесены. А таямніца засталася...

...Калісьці даўно дзед павёў мяне ў музей — той самы замак Ізяслава, гістарычны сімвал Заслаўя. Наведаць гэты белы будынак з вежай наверсе было маёй вялікай марай. І зараз успамінаюцца дзіды з гербамі беларускіх гарадоў ля ўвахода, чорныя кольцы на цяжкіх дзвярах, змрочная зала; вялікая столь, на якой, бы душы продкаў нашых, кружыліся анёлы, а таксама высокія вокны з рознакаляровымі дробнымі кавалкамі шкла — вітражамі — і такія ж рознакаляровыя праменьчыкі, святло якіх адбівалася плямкамі на ўсім, надаючы гэтаму і без таго незвычайнаму месцу нейкую казачнасць, чарадзейнасць... Драўляная фігурка пакутніка Хрыста (скульптура невядома якога стагоддзя) заўсёды выклікала ў мяне, яшчэ малога, розныя пачуцці: няўжо ў тыя часіны людзі ўжо маглі ствараць такую прыгажосць? Што гэта за чалавек, ногі і рукі якога прабіты цвікамі з палымнеючымі ружамі крыві? Але пацямнелы ад часу маленькі шэдэўр нічога не мог адказаць; Хрыстос глядзеў быццам праз цемру стагоддзяў — маўклівы сімвал мінуўшчыны і будучыні...

З экспанатаў музея, акрамя першабытных гаршчкоў і манет розных часоў, мне запомніліся «царскія вароты» — залатое хітраспляценне металу з нейкімі партрэтамі. І — слуцкія паясы... Яшчэ не чытаўшы Багдановіча, я ўжо ведаў, што існуе такая прыгажосць. Памятаю, спытаў у дзядулі: «А што, гэтыя бліскучыя ніткі, узоры — сапраўднае золата?».

...Спускаемся ў невялікае — некалькі прыступак уніз — падзямелле з умураванымі ў сцяну рэшткамі былых ланцугоў, металічнымі кольцамі. «Некалі тут вязняў, напэўна, трымалі», — тлумачыць ціхім шэптам дзед. Я з ім моўчкі згаджаюся, адчуваючы, як халадок бяжыць па спіне ад дзедавых слоў.

Выбраўшыся з падзямелля і пакінуўшы напаўзмрочную залу з нібы застылым паветрам стагоддзяў, зноў апынуліся ля гербаў. З гэтага невялікага пакойчыка можна было трапіць

у залу, адкуль мы толькі што выйшлі, і ў другі пакой, дзе пачыналася вялізная лесвіца, якая вяла на вежу — галоўную, з майго пункту гледжання, мэту нашага з дзедам падарожжа.

Я з дзяцінства баюся вышыні, нават на гарышча забрацца было цэлай праблемай, а ўжо спусціцца адтуль — удвая. Як толькі пагляджу на падлогу ўніз — адразу дрэнна становіцца... А тут велізарная лесвіца вяла паслядоўна на некалькі пляцовак-паверхаў, да якіх трэба было яшчэ дабрацца (вялікая для мяне перамога, нічога не скажаш!). А стаяла лесвіца, хоць і непахісна, але так, як я асабліва не любію, як тыя драбіны ў нашай хаце, — амаль вертыкальна. Але, набраўшыся смеласці, я першы пачаў наш пад'ём, дзядуля — за мною. Калі расказваць пра дрыжыкі ў каленях, пра халодны пот, — то гэта, вядома, далёка не ўсё, што я перажываў у той момант. То былі нейкія змешаныя пачуцці, таму што, акрамя адмоўных момантаў, я адчуваў нейкае ўзнёслае жаданне дасягнуць хаця б першай пляцоўкі. Да яе было два пралёты, як у звычайным шматпавярховым доме. Парэнчы пад рукамі (дзякуй Богу, што яны ўвогуле былі!) хісталіся, але, пераадолеўшы першы пралёт, на павароце я ўбачыў нішу ў сцяне, якая пачыналася дзесьці за паўметра ад падлогі. У гэтую нішу мог уціснуцца нават дарослы (праз многа гадоў я фатаграфаваўся ў ёй). Для чаго яна была прызначана — дагэтуль не ведаю. Дабраўшыся да першай пляцоўкі, адчуў вялікае жаданне апусціцца на падлогу і пасядзець, заплюшчыўшы вочы, нейкі час. Але, угледзеўшы на вокнах (на чатыры бакі па адным) прыгожыя чыгунныя перагародкі, адразу зацікавіўся незвычайным узорам ці то конніка, ці то кветак — не памятаю ўжо. Дзядуля ўвесь час за мною не толькі паспяваў, але ж і падганяў мяне. Жаданне ісці наверх ціха згасала. Дзед гаварыў ззаду нешта аб магчымасці ўбачыць Заслаўе з вышыні птушынага палёту. Зазірнуўшы ў маленькае акенца пасля чарговага павароту, убачыў прыгожы дах з чырвонай чарапіцы, а ўнізе, каля замка і навокал, — зялёныя шаты дрэў, а пад імі, яшчэ ніжэй, нібы цацачныя, рухаліся людзі...

Раптам мой позірк слізгануў уздоўж сцяны, якраз пад акенца, з якога я толькі што аглядаў наваколле, ніжэй, сабе пад ногі... і маім вачам адкрылася пустэча замка знутры — паміж дахам і столлю залы. Аказваецца (гэта чамусьці здзівіла мяне), бэлькі, кроквы — драўляныя, хоць і тоўстыя, моцныя, мабыць, дубовыя, на вякі... Галава закружылася, але дзед супакоіў: «Давай руку, не бойся, хутка будзем ужо наверсе! — І з нейкай хітрынкай дадаў: — Такога ты ніколі не забудзеш...». Што ніколі гэтага падарожжа не забуду, адчуў. Але што дзед меў на ўвазе, уцяміў пазней, калі мы апынуліся на верхняй, галоўнай, пляцоўцы — чатыры вялізныя перагародкі на вокнах на ўсе бакі (па-мойму, усё ж з выяваю конніка з узнятым мячом у адной руцэ і са шчытом — у другой, як наша славутая «Пагоня»).

І вось калі зразумеў я словы дзядулі! Цудоўны краявід на ўсе бакі!..

Ты — птушка! Ты лунаеш высока-высока на пругкіх лёгкіх крылах, падхоплены свежым струменем ветру, і пяшчотныя праменьчыкі сонца лашчаць твар, рукі, усё цела напаўняюць бадзёрасцю, радасцю неўміручага жыцця, адчуваннем волі і бязважкасці...

Сонца стаяла высока, рассыпаючы свае прамяні і дорачы нам сваё цяпло. На захадзе і на ўсходзе — лясы і лясы... Стужка канала на ўсход ад Заслаўя плыла, пашыралася, ператваралася ў вялізную з сонечнымі пералівамі пляму Мінскага мора з белымі кропкамі ветразяў на воднай прасторы.

На паўднёвым захадзе — некалькі пагоркаў з вёскай за імі, зарослыя сям-там чымсьці лісцвяным. За вёскай — зялёныя-зялёныя палі збажыны. Азярыны рэдкімі плямамі параскіданы там і тут, мабыць, бліжэй да Прудзішчаў — туды мы некалі хадзілі ў маліны. Якая цудоўная наша беларуская прырода! Ходзячы па лесе ў пошуках грыбоў, збіраючы ягады, не заўсёды заўважаеш непаўторнасць старога каржакаватага волата-дуба ля дарогі, прыгажосць крэпенькага баравічка, якога нават чапаць шкада, адростак маладой хваінкі, якая падобна пакуль да травінкі, але з часам пойдзе ў рост, нальецца магутнасцю. Спле-

ценыя паміж сабою ствалы двух дрэў (а сустракаецца і такое) нагадаюць цудоўную, непаўторную пару першага кахання, а палёт кнігаўкі над лугам — дзяцінства, высокую траву на поплаве, мяне самога сярод гэтай травы, калі назіраў за птушкамі, слухаў іх спевы... А што можа быць смачнейшым за цёплае, незвычайнага колеру, малако з цёмнай бутэлькі з акрайкам свежага хлеба і некалькімі ягадкамі суніц, у спешцы сабраных на ўзлеску? З чым можна параўнаць, нарэшце, смакату сцюдзёнай вады з крыніцы?..

І вось зараз, стоячы на «вяршыні свету», любуючыся веліччнасцю і прыгажосцю майго Заслаўя, усяго наваколля, якраз і хочацца ўспомніць пра неабходнасць для кожнага чалавека любіць, шанаваць, берагчы свой родны куточак, ганарыцца нашай Беларуссю і, не дай Бог, не быць ніколі адарваным ад свайго маленькага (ці вялікага) гарадка, які і з'яўляецца для кожнага з нас «горадам майго сэрца»...

*1998 г.*

# Змест


Новае імя. *Андрэй Федарэнка* . . . . . . . . . . 3
БЕЛАЯ ЖАНЧЫНА. *Аповесць* . . . . . . . . . . 4
ДЖЭК. *Аповесць* . . . . . . . . . . 52
АНЁЛЫ. *Апавяданне* . . . . . . . . . . 113
РУЖА. *Апавяданне* . . . . . . . . . . 127
ВАРТОЎНЯ. *Апавяданне* . . . . . . . . . . 145
ЦАНА КРЫВІ. *Апавяданне* . . . . . . . . . . 148
МАРА. *Апавяданне* . . . . . . . . . . 164
ЛАСКАВЫ ПАДМАН *(з «Крымскіх нататкаў»). Апавяданне* . . . . . . . . . . 167
ГОРАД МАЙГО СЭРЦА. *Эсэ* . . . . . . . . . . 169

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Серыя**
**«Бібліятэка Мінскага гарадского аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі»**

ПЯТРОВІЧ Дзмітрый Леанідавіч

# Белая Жанчына

*Аповесці, апавяданні, эсэ*

Рэдактар *А. М. Федарэнка*
Дызайн вокладкі *І. І. Дуброўская*
Камп'ютарная вёрстка *І. І. Дуброўская*
Карэктар *Н. Ю. Карасёва*

Падпісана ў друк 25.01.2012.
Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 10,23. Ул.-выд. арк. 7,11.
Наклад 300 паас. Заказ № 132.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
ТДА «Выдавецтва "Четыре четверти"».
ЛИ № 02330/137 от 01.04.2004.
Вул. Б. Хмяльніцкага, 8-215, 220013, Мінск.
Тэл./факс: 331 25 42. E-mail: info@4-4.by



**Дзмітрый Леанідавіч ПЯТРОВІЧ** —
паэт, празаік, кампазітар.
Нарадзіўся 29 красавіка 1971 г. у г. Заслаўе
Мінскай вобласці. Скончыў музычна-
педагагічны факультэт, факультэт
беларускай філалогіі і культуры, а таксама
магістратуру Беларускага дзяржаўнага
педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.
Шмат гадоў настаўнічаў. Цяпер працуе
вядучым стылістычным рэдактарам
газеты «Звязда».
Друкавацца пачаў з 2005 г.
Аўтар шматлікіх публікацый у часопісах
«Маладосць», «Роднае слова», «Бярозка»,
калектыўных зборніках, альманахах,
штотыднёвіку «ЛіМ», «Краязнаўчай газеце»
і іншых выданнях.
У 2010 г. убачыў свет зборнік паэзіі
«Белая квецень кахання».
Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі.

ISBN 978-985-7026-18-0

9 789857 026180

Дзмітрый Пятровіч

# Белая Жанчына